беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НІВА

№ 33 (71)
18 лістапада
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

ТЭЛЕПРАГРАМА
20 MTV
5 Навіны на рынку бэстсэлераў.
ПРЭС-РЭЛІЗ
6 Сьвет за тыдзень.
ГРАМАФОН
7 Новыя вершы нашых чытачоў.
ШУФЛЯДА
10 Беларускі непадцэнзурны друк.
РОЗНАЕ
12 Тэст: Што падкажуць родзімкі.
Інфарматар

Кроніка суднага часу

15-16 лістапада, Менск

Здаецца, гульцы беларускай палітыкі выйшлі на фінішную прамую. Але ў беларускіх умовах нават фінішная прамая — не прамая. Тактычныя ўлоўкі ды павароты існуюць і на гэтым апошнім этапе палітычна-спартовай дзеі.

Пасьля працяглае барацьбы нэрваў, ня вытрымаўшы, першы зрабіў рывок Лукашэнка. Парлямэнт звыкла сеў прэзыдэнту, што называецца, на пятку. У гэткіх умовах усё вырашае наяўнасьць незадзейнічаных рэзэрваў — у каго яны засталіся. Тым болей, што спаборніцтва тут адной лёгкай атлетыкай не абмяжуецца. Будзе і атлетыка цяжкая, і барацьба, і бокс.

Гэта яскрава засьведчылі дынамічныя падзеі мінулае пятніцы ў Цэнтарвыбаркаме. Прэзыдэнт падпісаў указ пра зьняцьцё з пасады старшыні ЦВК Віктара Ганчара. Ясна, што Канстытуцыя ў якасьці падставы для гэтага ўказу не фігуравала. Таму Ганчар не згадзіўся, і прэзыдэнцкі загад адправіліся выконваць людзі з галоўнай управы дзяржаўнай аховы пад камандай сп. Цесаўца. Таго самага, які кіраваў апэрацыяй паўтары гады таму, калі з залы парлямэнту выкідвалі дэпутатаў фронтаўскай апазыцыі. Так што кадар, можна сказаць, правераны.

Але выконваўся загад надта ўжо кандова і непрафэсійна. Дый пра які прафэсіяналізм можна весьці гаворку, гледзячы на выканаўцаў — прэзыдэнцкіх ахоўнікаў. Хлопцы з стрыжанымі патыліцамі, крыху старэйшыя за кітайскіх хунвэйбінаў, за рукі ды за ногі вынесьлі старшыню ЦВК з кабінэту, але... прапусьцілі пры гэтым на ўзяты штурмам аб'ект дэпутатаў парлямэнту і — што самае страшнае — журналістаў.

Дарма сп. Цесавец бег па калідоры і аддаваў загад нікога не прапускаць. Было позна. Цяпер ён мусіў задыхана тлумачыць мэту сваёй акцыі настаўленым на яго дыктафонам, мікрафонам і відэакамэрам. Скандал адбыўся. Усё гэта было зафіксавана на відзастужку і разьляцелася па сьвеце.

Не абыйшлося без сутычак паміж дэпутатамі і «прыхільнікамі прэзыдэнта», як, напрыклад, прадставіліся дэпутату-камуністу Шчукіну стрыжаныя хлопчыкі ў цывільным. Пакуль сп. Ганчар тлумачыў сп. Цесаўцу нормы Канстытуцыі, якія той парушыў, выконваючы антыканстытуцыйны загад Лукашэнкі, падзеі разгортваліся драматычна.

Дыскусію раптам перарваў крык: «Шчукіна б'юць!» Сапраўды, дэпутату спрабавалі круціць рукі некалькі падначаленых сп. Цесаўца. Але справіцца з былым падводнікам было ня лёгка. Барадаты дэпутат вазіў на сабе чалавек пяць «хунвэйбінаў», калі апынуўся ў цэнтры ўвагі. Дэпутаты Данэйка і Дабравольскі прыйшлі на дапамогу калегу, спрабуючы спыніць гвалт, але ледзьве самі ня сталі аб'ектам нападу. Тым часам вымушаны бараніцца Шчукін у нейкі момант апынуўся на падваконьні і адтуль каменем упаў на кіраўніка групы захопу сп. Цесаўца. Барацьба паміж імі наймацнейшага ня выявіла, бо была спыненая.

Увогуле, што павінен адчуваць сталы дэпутат, калі яму круцяць рукі патэнцыяльныя ўнукі? Альбо як будзе ставіцца да сытуацыі старшыня парлямэнту ці генэральны пракурор, калі іх, як школяроў, не пускаюць туды, куды ім трэба, тыя самыя школяры? Паглядзеўшы на ўсё гэта, Сямён Шарэцкі заявіў пра неканстытуцыйны захоп улады ў краіне. Бліжэй да вечару каля будынку ЦВК сабраліся людзі. Таксама быў народ і каля парлямэнту.

На сёмым паверсе парлямэнцкага будынку нехта вывесіў бел-чырвона-белы сьцяг, што выклікала станоўчую рэакцыю ў людзей і зусім адваротную — у міліцэйскіх чыноў. Выпраўляць непарадак пабеглі ўсё тыя ж хлопчыкі ў цывільным. І зноў спазьніліся. Хіба што ледзьве не арыштавалі дэпутата Лябедзьку, які выходзіў са свайго кабінэту...

Сьпікер Шарэцкі выйшаў да людзей і заклікаў іх разыходзіцца. Маўляў, захопу парлямэнту ня будзе, і ўсе наступныя дні ў Вярхоўным Савеце будзе наладжанае дзяжурства дэпутатаў. Тым ня менш, на пляцы Незалежнасьці ўсю ноч стаяў пікет БНФ.

Ноччу ў парлямэнце разам з дэпутатамі дзяжурылі і журналісты. А наступнага дня старшыню Цэнтарвыбаркаму зноў не пусьцілі на працу, пасьля чаго было заяўлена, што ЦВК будзе працягваць сваю працу ў парлямэнце. Вярхоўны Савет прыняў зварот да міжнароднай супольнасьці і беларускага народу пра палітычную сытуацыю ў краіне. У адказ міжнародныя арганізацыі заявілі, што ня будуць прызнаваць вынікі беларускага рэфэрэндуму, як незаконнага.

Працэс, як кажуць зайшоў надта далёка. Камусьці ня жыць: альбо прэзыдэнту, альбо парлямэнту. На баку Лукашэнкі сіла. Відавочна, што хутка будуць падпісаныя ўказы пра спыненьне дзейнасьці Канстытуцыйнага Суда, адстаўку генпракурора і роспуск парлямэнту.

Лукашэнку ніколі ня быць джыгітам. Джыгіты не папаўзуць на каленях ні на ўсход, ні на захад. Годнасьць не дазваляе. І грубая сіла — ня іх канёк. У гэтым сьвеце не заўжды перамагае сіла. Бо ёсьць яшчэ і сумленьне. Парлямэнт стаіць пад сумленным сьцягам. Кожны будзе вырашаць сам, ці стаць пад гэты Сьцяг. Час ікс — судны час настаў. Пачалася ягоная кроніка.

17 лістапада

Людзі якія ў гэты дзень выйшлі на пляц Якуба Коласа, каб пратэставаць супраць палітыкі Лукашэнкі, у першую чаргу дамагаліся свабоды слова для парлямэнту. Але шлях да пляцу Незалежнасьці, як заўжды, быў складаны. Улады прапанавалі тое месца, дзе заўсёды зьбіралі сваіх «бандэрлёгаў» — пляц Бангалор. Ці маглі вольныя людзі ў час, калі вырашаецца лёс Айчыны, пайсьці ў рэзэрвацыю? Рэзэрвацыя — лёс «бандэрлёгаў», лёс вольных людзей — Незалежнасьць, і яны дайшлі да пляцу з назвай сваго лёсу.

Дзіўна, як маглі ад пяці да васьмі тысяч дэманстрантаў дамагчыся сваёй мэты, калі ім супрацьстаяла столькі ж, а можа і больш міліцыі, амону, спэцназу з дубінкамі, бэтээрамі і іншымі прыладамі. Насамрэч адказ просты — народ, які стаіць пад сумленным сьцягам, спыніць цяжка.

Міліцыя была ня тое што спалоханая, але нейкая дэмаралізаваная. Калі ў простай размове хаваюць вочы і «пацаны» тэрміновай службы, і палкоўнікі, калі ад афіцэра амону чуеш: «Браток, ну убери камеру, вы ж и нас поймите», — адчуваеш, што рэжым хістаецца.

Вядома, была і іншая міліцыя, якая дубасіла народ каля гатэлю «Менск», якая ўдарыла гумовай палкай па галаве дэпутата ВС праф. Багданкевіча, якая загадвала выганяць журналістаў. Але, тым ня менш, сумленны сьцяг стаяў на пляцы Незалежнасьці, а не на пляцы «бандэрлёгаў».

Алег Дашкевіч



Здымак Міхала Баразны

А н к е т а

Размова з чытачамі

Сёньня мы падводзім вынікі анкеты, у якой чытачы "Нашай Нівы" даюць ацэнку тыднёвіку, яго матэрыялам і аўтарам, выказваюць свае заўвагі і пажаданьні. Увогуле на нашую анкету адказала 5 працэнтаў ад усіх чытачоў "НН".

Матэрыял друкуецца на старонках 3 і 13.

Калі бруд на руках ператвараецца ў кроў

Слова ў падтрымку паэта Славаміра Адамовіча

Творчасьць ня церпіць дыктатуры. Дыктатура ня церпіць творчасьці. Прырода волі ня церпіць прытворства. Мы, сябры Таварыства Вольных Літаратараў, адкрыта і ясна гаворым: хопіць маўчаць! Хопіць маўчаць, калі ў турме гіне паэт Славамір Адамовіч, якога рэжым спрабуе зрабіць «дзяржаўным злачынцам» за верш... Хопіць маўчаць, калі ў турме сядзіць кожны іншы Творца — толькі за тое, што ён ня церпіць подласьці, хлусьні, прытворства, зьнявагі й зьдзеку са сваёй Радзімы.

У жывога чалавека немагчыма скрасьці паветра, так і ў сапраўднага Творцы немагчыма скрасьці волю й прагу да ісьціны. Але Творцу можна забіць. Сёньня яны рабіць гэта яшчэ баяцца. Хутка — баяцца ня будуць. Магчыма, якраз праз столькі часу, колькі мы яшчэ зьбіраемся маўчаць.

Паэт у турме — сёньняшняя Беларусь. Лёс Беларусі заўтрашняй залежыць ад нас.

Сябры Рады ТВЛ: Алесь Аркуш, Ігар Сідарук, Вінцэсь Мудроў, Юры Гумянюк, Юрась Пацюпа.

2 лістапада 1996 г.

Зварот Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь

Сёньня ў Рэспубліцы Беларусь пад выглядам правядзеньня рэфэрэндуму ідзе захоп улады і ўсталёўваецца адкрытая дыктатура. Указы Прэзыдэнта А.Р.Лукашэнкі аб прызнаньні нядзейнымі рашэньняў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, аб вызваленьні ад пасады Старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі В.І.Ганчара ня толькі антыканстытуцыйныя, але й супярэчаць здароваму сэнсу.

Становіцца ўсё больш відавочна, што А.Р.Лукашэнка ўступіў на шлях антыканстытуцыйных рашэньняў, не спыняецца ні перад чым. Адно парушэньне закону спараджае другое.

Для забесьпячэньня любым спосабам патрэбнага выніку пастаўленая задача ў парушэньне закону галасаваньне па рэфэрэндуме ў асноўным скончыць да 23 лістапада, а давыбары дэпутатаў Вярхоўнага Савету сарваць. Бюлетэні для галасаваньня выраблены і накіраваныя на выбарчыя ўчасткі Упраў Справаў Прэзыдэнта, мінаючы Цэнтральную выбарчую камісію. Колькасьць гэтых бюлетэняў нікому невядомая. Найгрубейшыя парушэньні дапускаюцца ў ходзе фінансаваньня рэфэрэндуму. Дагэтуль блякуецца легальнае выдзяленьне сродкаў Цэнтральнай выбарчай камісіі на гэтыя мэты. У той жа час для правядзеньня рэфэрэндуму ствараюцца паралельныя структуры.

У цэнтры Эўропы ажыцьцяўляецца жудасны экспэрымэнт масіраванага ўзьдзеяньня на сьвядомасьць і падсьвядомасьць людзей манапалізаванымі А.Р.Лукашэнкам сродкамі масавай інфармацыі. Грамадзяне рэспублікі пазбаўленыя магчымасьці зрабіць асэнсаваны і аб'ектыўны выбар. Па сутнасьці рэфэрэндум ператвараецца ў фарс.

Паважаныя суайчыньнікі!

Мы зьвяртаемся да вас з просьбай зрабіць усё магчымае, каб не дапусьціць усталяваньня дыктатуры ў Беларусі, не дапусьціць масавых расправаў і рэпрэсіяў над людзьмі, якія думаюць іначай, чым А.Р.Лукашэнка і ягонае атачэньне!

Паважаныя члены Кабінэту Міністраў Рэспублікі Беларусь!

Паважаныя кіраўнікі абласьцей і раёнаў!

Мы зьвяртаемся да кожнага з вас з просьбай праявіць грамадзянскую мужнасьць і ня стаць памагатымі ўзмацненьня дыктатарскага рэжыму!

Мы зьвяртаемся з заклікам да кіраўнікоў Пракуратуры, Вярхоўнага Суда, МУС, КГБ і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь ня даць уцягнуць сябе ў авантуру, у незаконныя дзеяньні, накіраваныя супраць інтарэсаў народу і на ўдушэньне дэмакратыі!

Мы заклікаем кіраўніка Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў Б.М.Ельцына, кіраўнікоў дзяржаваў і парлямэнтаў Садружнасьці зрабіць усё, каб мір і спакой захаваліся на шматпакутнай зямлі Беларусі.

Мы зьвяртаемся з заклікам да кіраўнікоў дружалюбных краінаў найбліжэйшым часам сабраць экстранае паседжаньне кіраўнікоў дзяржаваў, урадаў і парлямэнтаў Садружнасьці для разгляду сытуацыі ў Беларусі.

Мы зьвяртаемся да сусьветнай супольнасьці, кіраўнікоў дзяржаваў, кіраўнікоў парлямэнтаў аказаць палітычную і маральную падтрымку парлямэнту і народу, які перажыў за апошняе стагодзьдзе мноства трагедыяў, страціў у сусьветных войнах мільёны сваіх сыноў і дачок. Мы маем права разьлічваць на тое, што ў Беларусі, у цэнтры Эўропы ня ўзьнікне дыктатарскі рэжым, накіраваны на ліквідацыю інстытуту парлямэнтарызму і дэмакратыі.

Мы выказваем упэўненасьць, што гэты Зварот знойдзе водгук у сэрцах і розумах беларускага народу, а таксама людзей добрай волі Эўрапейскага кантынэнту і нашай плянэты!

Прэзыдыюм Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь

15 лістапада 1996 году

Супраць зьнікненьня часу

Найчасьцей дыктатура ўспрымаецца людзьмі праз канкрэтныя спосабы ці мэтады ажыцьцяўленьня ўлады, што выклікаюць моцную эмацыйную й маральную рэакцыю. Недзе на другі плян адыходзяць сутнасьці гэтае ўлады, сярод якіх эканамічныя інтарэсы зьяўляюццца найбольш заўважнымі. Але дыктатура, апроч іншага, мае памкненьні зрабіць апэрацыю над часам.

Ідэалёгія дыктатуры абірае й прапагандуе самыя ірацыянальныя часткі нігілістычнай спадчыны: нічога ў сьвеце ня мае сэнсу, а гісторыя — усяго толькі спаборніцтва супрацьлеглых сілаў. У выніку грамадзтва пазбаўляецца сваёй гісторыі, як мінулай, так і сучаснай. Уся гісторыя зводзіцца да гісторыі рэжыму — гадавінаў, зьездаў ці чарговых праектаў стагодзьдзя. Акупацыя сучаснасьці адбываецца праз мяккую дыктатуру — тэлебачаньне, якое апаноўваюць вытворцы гатовых думак. Лёгказасваяльныя «праўды» пра мінулае прадукуе новая гістарыяграфія. У выніку рэжым прыватызуе гістарычны час.

Агістарычнасьць — гэта яшчэ й вонкавае бесьперапыннае дзеяньне. Чалавеку, які верыць толькі ў свой посьпех, няма розьніцы, у каго ён ператвараецца — у злачынцу ці рэфарматара. Замкнёнае кола парадоксу дыктатарскіх рэжымаў заключаецца ў тым, што яны прагалошваюць парадак на грунце бесьперапыннай актыўнасьці ды адмаўленьня. Насуперак Гегелю — як сказа Камю, — адмаўленьне, прынамсі гэтым разам, ня ёсьць стваральным.

Калі мітусьлівая актыўнасьць апаноўвае дзяржаву, што застаецца рабіць грамадзяніну? Многіх ахоплівае адчуваньне зьнікненьня часу, з чаго вынікае абыякавасьць да грамадзкага жыцьця, узьнікае недавер да любых праяваў існаваньня супольнасьці. Гэта вельмі разбуральна ўзьдзейнічае на грамадзкую самасьвядомасьць.

Адрознасьць дыктатуры ад таталітарызму заключаецца ў захаваньні пры першай форме рэжыму ўлады хоць нейкіх аскепкаў грамадзтва. Ёсьць ня вельмі арыгінальны ўжо рэцэпт пазьбегнуць зьнікненьня часу для грамадзтва — стварыць уласную гістарыяграфію сучаснасьці. Калі рэжым зьяўляецца пажыральнікам часу і за гісторыю сучаснасьці выдае сьпіс праяваў сваіх інстынктаў, дык незалежная фіксацыя гэтых праяваў, рэакцыі на іх грамадзтва, а таксама рэагаваньняў рэжыму ў адказ дазволіць стварыць базу для ўзьнікненьня гістарыяграфіі сучаснасьці. Тады наш пэрыяд ня выпадзе з гістарычнай шкалы, аформіцца там паводле выразных крытэрыяў і ўжо потым можна будзе паспрабаваць зразумець гэтую эпоху й назваць патаемныя мэханізмы яе зараджэньня.

Наша парада — фіксуйце ўсё важнае, што адбываецца з Вамі сёньня.

Алег Дзярновіч



Менск, 15 лістапада. Здымак Уладзіміра Шлапака

П о ш т а

Патрэба сувязяў

Вельмі цікавым падаецца пытаньне пра ролю розных рэгіёнаў Беларусі ў нацыянальным руху.

Усю нашу краіну можна ўявіць як жывы арганізм, а кожны яе раён — як орган, што выконвае пэўную функцыю, а часам бярэ на сябе адказнасьць за ўвесь арганізм. У розныя часы такімі органамі для Беларусі былі і Полаччына, і Наваградчына, і Віленшчына. Сёньня мы гаворым пра некаторыя мясьціны, як пра даўно зазначаныя ў беларускай гісторыі. Гомельшчына аднак — той рэгіён, які яшчэ не сказаў свайго слова. Улічым і агульны кірунак разьвіцьця этнічных працэсаў з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. У Гомелі Беларусь нараджаецца.

Такім чынам, сытуацыя ў Гомелі. Што яе вызначае? Па-першае, вялікая колькасьць адукацыйных установаў рознага ўзроўню. Гэта дазваляе ствараць маладзёжныя асяродкі і афармляць іх у дзейсныя суполкі («Талака», ЗБС, скаўты, палітычныя арганізацыі й іншае). Па-другое, Гомель — цэнтар этнічнай культуры беларусаў. На яго ўплываюць такія традыцыйныя асяродкі, як усходняе Палесьсе й Веткаўшчына. Пры ўмове актыўнасьці мясцовага культурнага жыцьця мы чакаем ад скрыжаваньня гэтых уплываў цікавага плёну. Яшчэ адзін фактар Гомельскае сытуацыі — блізкасьць Украіны. Яе нацыянальная зарыентаванасьць для нас — і прыклад, і дапамога.

Увогуле, беларушчына ствараецца ў краях. Менск ня можа быць стваральнікам культуры, ён толькі складвае розныя плыні й утварае агульнабеларускі вэктар. Сёньня ў кожнага значнага беларускага места — свой твар. Полацак — плённая літаратурная праца. Віцебск і Магілёў — палітычная заангажаванасьць. Горадня — паглыбленасьць у гісторыю, жывыя традыцыі. Маладэчна — увага да моўнага пытаньня. І г.д. Выглядае, што цяпер стаіць пільная патрэба ў актывізацыі кантактаў паміж беларускімі асяродкамі розных краёў Беларусі. Гэта могуць быць агульныя фэсты, вандроўкі, сумежнае адзначэньне сьвятаў, культурныя імпрэзы і г.д. На такіх сустрэчах беларушчына паўстане перад намі ў нечакана больш прывабным аблічча, дэманструючы сваю разнастайнасьць і актуальнасьць. Ставім мэту — абмен тэхналёгіямі культуры.

Сяржук Вінаградаў,
Гомель



Менск, 15 лістапада. Здымак Уладзіміра Шлапака

Бязь сілы

Мы звыкліся са слабасьцю. Наш асноўны занятак — назіраць за падзеямі.

Я не кажу пра жанчыну з прыгожым прозьвішчам Чайка. Яна сваім пранікнёным голасам яшчэ даводзіць радыёаўдыторыі, што самае тое, што нам патрэбна, — маскоўскае праваслаўе ды самадзяржаўе, і што прарокамі прадказана зьяўленьне Аляксандра Вялікага...

Мне б хацелася расказаць ёй пра Паўла Чайку, ягоную жонку і іх дваіх дзяцей.

Калі аднойчы ўзімку на беразе Буга цар прыслаў казакоў — для таго, каб прымусіць уніятаў перайсьці ў праваслаўе — казакі рабілі гэта наступным чынам: яны выводзілі ўсіх вясковых мужчынаў за сяло і давалі кожнаму па голай сьпіне па 400 ударааў нагайкай. Хто не вытрымваў і падаў, тых аблівалі вадою і зноў білі. Увечары ўжо толькі нямногія катаваныя маглі ісьці самі, астатніх адвозілі дамоў на фурманцы. А раніцою ўніяты зноў павінны былі прыйсьці на паверку, на якой у іх пыталіся: «Ці згодныя перайсьці ў праваслаўе?» — «Хутэй вы нас заб'еце, чымся мы зрачомся нашае веры», — адказвалі яны, пасьля чаго іх зноў білі.

А Павал Чайка, які жыў на невялічкім хутарцы ля Кодэня, за адмову зьмяніць веру патрапіў у берасьцейскую турму. Да яго прыехала жонка. Адведаць. Яе не пусьцілі. Тады жанчына ўскараскалася на мур, каб хоць пабачыць мужа. Расейскія казакі сьцягнулі яе са сьцяны і зьбілі так, што праз тыдзень яна памерла. Начальнік казакоў Котаў сказаў Паўлу Чайку: «Пераходзь у праваслаўе, і пойдзеш дадому, да дзяцей». Той адказаў: «Веры не пакіну. Маім сіротам людзі скажуць, што яны дзеці мучанікаў». Паўла Чайку разам зь яшчэ двума яго суседзямі адправілі ў Сібір, дзе ён хутка і памёр.

Дык мне хацелася сказаць той жанчыне, Чайцы, што тыя Чайкі, уніяты, даводзяцца ёй, напэўна, проста аднафамільцамі...

Жыць сярод мёртвых грэшнікаў — страшна. Законаў іхніх не зразумець. Але дзіва — мерцьвякі баяцца. Праўды. Вольных учынкаў. Тых людзей, хто здольны зарабляць сам. Бога. Тых, хто не залежыць ад іхняй гарэлкі. Жыць сярод мёртвых грэшнікаў — страшна. Толькі нельга гэтага паказваць.

Што прымушае людзей рабіць подласьці? У якой сям'і трэба вырасьці, каб быць да такой ступені звырадпелым, ні на што ня здольным, каб грошы да такой ступені засьцілі неба? Ці татарын Зімоўскі разумее, што яго пакарае Алах? Алах суровы да тых, хто здраджвае свайму і пераходзіць на бок няверных... І які ж страшны на выгляд гэты «журналіст» — нібы толькі што з магілы! Прычым, праляжаўшы там месяцы са два...

На тварах я пазнаю людзей. У тых хлопцаў, якія прымусяць мерцьвякоў адступіць (бо ня будуць іх баяцца), будуць прыгожыя твары. І ўсё, што трэба, — сапраўды хацець бачыць сваіх дзяцей не пад уладаю крыміналу.

Натальля Бабіна

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік
НАША НІВА
заснаваны ў 1906,
адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Барановіч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
вёрстка Іна Жызьнеўская
набор Тацяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі перыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173

Паважаная рэдакцыя!

Вось прачытала Ваш зварот да чытачоў «Падпіска дзеля знаёмства», дзе Вы паведамляеце, што ў 1997 годзе Вашае выданьне павялічыць колькасьць старонак, будзе больш прыгожым і зьмястоўным, і... аж жах мяне ахапіў!

Яшчэ ў красавіку Радыё 101,2 паведамляла пра тое, што ўлетку яно плянуе працаваць у этэры 20 гадзінаў на дзень, зьявіцца больш тэматычных праграм і г.д. Але на іх вясёлкавыя пляны наляцела зграя «технических причин»... Прачынаючыся раніцай, я ня ведала, што мне рабіць, бо мой ранак заўсёды пачынаўся з Радыё 101,2.

Я дужа забабонлівая асоба і мае забабоны маюць пад сабой глебу — у апошні час як толькі нешта беларускае зьбіраецца пашырыцца, адразу яно прываблівае да сябе «технические причины». Таму лепш заставацца проста нашай газэтай, а мы, Вашыя чытачы, заўсёды падтрымаем Вас у Вашым імкненьні зрабіцца больш зьмястоўнай і прыгожай. Спадзяюся, што ў Вас хопіць дальнабачнасьці і тактоўнасьці зрабіць так, каб Вашыя чытачы заўсёды ведалі, чым ім займацца ў панядзелак падвячоркам.

Хай зямля разыйдзецца пад тымі «техническими причинами» зь іх учынкамі і думкамі.

Натальля Счасная,
Менск

П а п р а ў к а

У мінулым нумары «НН» у артыкуле «Краіна-запаведнік» на 3-й старонцы замест подпісу «Вадзім Глінянік» трэба чытаць «Сяргей Харэўскі».

Рэдакцыя

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

РАЗМОВА З ЧЫТАЧАМІ

Вынікі анкеты

Анкета, надрукаваная ў нумарах 26 і 27 «НН», аказалася занадта вялікай і падрабязнай, каб яе вынікі можна было падвесьці сходу і ўсе. Рэдакцыя атрымала 230 запоўненых анкетаў з адказамі на 38 пытаньняў, з удакладненьнямі і расшыфроўкамі, якія дазваляюць рабіць высновы ня толькі пра наш тыднёвік, але й пра думкі ды настроі сьведамае часткі беларускага грамадзтва ўвогуле. Гэта матэрыял для працы не аднаго дня і месяца. І за гэты матэрыял мы дзякуем усім, хто ўзяў удзел у нашай «Размове з чытачамі».

Але сёньня абмяжуемся пераважна вонкавымі паказчыкамі і высновамі, статыстыкай і пералікамі, якія таксама шмат пра што гавораць. Спачатку пазнаёмімся.

Хто чытае «НН»?

Адказаўшы на гэтае пытаньне, мы можам скласьці характарыстыку самое газэты — якая яна? А чытае «НН» збольшага МУЖЧЫНСКАЯ публіка (196 анкетаў супраць 38 — ад жанчын), пераважна МОЛАДЗЬ (39 — да 20-ці гадоў, 87 — да 30-ці, 65 — да сарака, 29 — да 50-ці і яшчэ 8 старэйшых), якая жыве ў вялікім горадзе (136), альбо проста Ў ГОРАДЗЕ (77) і належыць да студэнцтва (59), альбо ходзіць на дзяржаўную службу (26) ці на завод (23). Значная група нашых чытачоў — работнікі адукацыі (22), мэдыцыны (12), навукі (11), культуры (9) альбо нідзе не працуюць (11). Вышэйшую АДУКАЦЫЮ маюць 125 карэспандэнтаў, няпоўную вышэйшую — 39, сярэднюю спэцыяльную — 30 і проста сярэднюю — 34.

ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРЫХІЛЬНАСЬЦІ нашых чытачоў уяўляюць сабою самы шырокі спэктар: ад Ірляндзкай Рэспубліканскай Арміі да партыі дафеністаў. Праўда, паводле колькасьці ўсё зводзіцца збольшага да аднае арыентацыі — БНФ (150), да якой далучаюцца АГП (12), «Белы Легіён» (11), сацыял-дэмакраты (11) і УНА-УНСО (5). Дзеля справядлівасьці адзначым, што, пішучы БНФ, шмат хто ўдакладняе свой выбар: «але не на 100%», «але не безумоўна», «з заўвагамі». Зрэшты, мы і пыталіся пра палітычныя прыхільнасьці, але не пра членства ў партыі.

Яшчэ больш няпэўныя адказы на пытаньне пра РЭЛІГІЙНУЮ КАНФЭСІЮ, якая нашаму чытачу найбліжэй. 79 чалавек назвалі ўніяцтва, 48 — праваслаўе (у тым ліку 13 — Беларускую аўтакефальную праваслаўную царкву), 42 — рымскі каталіцызм, 7 — пратэстанцтва і нэапратэстанцтва, 6 — будызм, 5 — паганства; іншыя рэлігіі (іслам, сынтаізм, юдаізм, атэізм...) вызнаюць па адным-два нашыя карэспандэнты.

Тое, што большасьць чытачоў назвалі месцам жыхарства «вялікі горад», яшчэ ня значыць, што ўсе яны менчукі. Менчукоў крыху больш за палову (123), а сярод абласьцей найбольш нашых карэспандэнтаў — у Гарадзенскай (23), найменш — у Магілёўскай (5), у астатніх прыблізна пароўну (Віцебская — 22, Берасьцейская, Гомельская і Менская — па 19). Пасьля абласных цэнтраў самыя «нашы» гарады: Ліда (7), Баранавічы (5), Пінск (5), Полацак і Наваполацак (5 і 4), Салігорск (4). Фактычна гэта адрасы актыўнасьці сьведамых беларусаў у Беларусі. Таму, каб уявіць сабе шырэйшую карціну, варта назваць усе гарады, адкуль мы атрымалі хоць бы дзьве анкеты: Койданава, Маладэчна, Смалявічы, Мазыр, Шчучын. Адзін адказ прыйшоў нават з Познані (Польшча).

На пытаньне «Ці ведаеце Вы ГІСТОРЫЮ «НАШАЙ НІВЫ» пачатку ХХ ст. (агульныя зьвесткі, імёны пачынальнікаў, аўтараў)?» 177 рэспандэнтаў адказалі «так» і толькі 46 — «не». Праўда, і тыя, хто ведае, часта ўдакладняюць: недастаткова, цьмяна, прыкладна, вельмі мала, збольшага, толькі агульныя зьвесткі, недакладна, «хотелось бы узнать», і гэта тэма для рубрыкі...

Гэта сапраўды тэма для рубрыкі. Але сёньня ўжо немагчыма проста пераказваць факты, якія ёсьць у старых кнігах. Патрэбная пераацэнка, зрабіць якую ва ўмовах нашага сутаргавага палітычнага і эканамічнага быцьця вельмі складана. Таму праблема застаецца адкрытай.

Дарэчы, на пытаньне, ці працягвае сёньняшняя «НН» справу легендарнай газэты, палова карэспандэнтаў (107) адказала станоўча, другая палова (102) лічыць, што яшчэ рана адказваць на такое пытаньне і толькі трое перакананыя, што «выдаўцы сучаснай «НН» беспадстаўна прысвоілі імя легендарнай газэты».

Такім чынам, агульная характарыстыка тыднёвіка, якая вынікае з характарыстыкі нашае чытацкае аўдыторыі, выглядае так: маладзёжны гарадзкі мужчынскі ўніяцкі (беларускі хрысьціянскі) БНФаўскі тыднёвік для адукаванай публікі, які збольшага працягвае традыцыі легендарнага выданьня.

Цяпер мы можам параўнаць гэтую характарыстыку з той, якую даюць «Нашай Ніве» чытачы.

Як характарызуюць «НН» чытачы?

Для нас вельмі істотнае тое, што чытачы ДАВЯРАЮЦЬ нам — 190 карэспандэнтаў пагаджаюцца са сьцьверджаньнем, што «НН» у цэлым — газэта аб'ектыўная, 35 лічаць, што — не зусім, толькі трое пішуць пра неаб'ектыўнасьць.

Цікава, што чытачы без вышэйшае адукацыі (больш за 100, гэта 40% ад усіх) мяркуюць, што «НН» — «элітарны тыднёвік для вузкай групы інтэлектуалаў». Гэта сьведчыць, што газэта «працуе» з сваёй аўдыторыяй. Чытачы называюць выданьне заразумным, але не разьвітваюцца зь ім, «угрызаюцца» ў гэтыя «заразумнасьці».

Многія карэспандэнты прыводзяць на згаданае пытаньне два адказы адразу: «НН» элітарная і патэнцыяльна масавая адначасова, альбо — ужо ня першая, але яшчэ не другая: «Выданьне мае патэнцыял, але абставіны не спрыяюць».

Сярод характарыстык сустракаюцца такія, якія грэх было б не працытаваць: «НН» — добрая, выдатная літаратура», «газэта для ўсіх, хто прытрымліваецца дэмакратычных і незалежніцкіх поглядаў», «хацелася б, каб вузкая група інтэлігенцыі пашырылася», «газэта для беларусаў і пра беларусаў», «НН» — тыднёвік для маёй сям'і», «масавае выданьне для беларускай моладзі», «для нешырокага кола засяроджаных на Радзіме» і, нарэшце, «НН» — ледакол беларушчыны».

Большасьць карэспандэнтаў (86) лічаць, што наша «НН» — газэта НАЦЫЯНАЛІСТЫЧНАЯ. Праўда, пры гэтым часта дадаюць: «але ў добрым сэнсе», «без ідэалягічных спэкуляцыяў», «... але гэта добра». 63 чытачы назвалі нас права-кансэрватыўным выданьнем, 32 — правацэнтрысцкім, 14 — проста цэнтрысцкім. Астатнім карэспандэнтам прапанаваных намі характарыстыкаў не хапіла і яны прапанавалі свае: нармальная, нацыянальная (5), нацыянальна-патрыятычная (3), беларуская (3), апазыцыйная, асьветніцкая, наша, «НН» — гэта «НН».

Пасьля такіх словаў варта перайсьці да сутнасьці — да ацэнкі канцэпцыі газэты.

Канцэпцыя «НН»

Як вядома, пасьля пяцігадовага існаваньня ў Вільні ў выглядзе нерэгулярнага месячніка, сёлета на пачатку году «НН» перабралася ў Менск і ператварылася ў рэгулярны тыднёвік. Зразумела, разам з гэтым зьмянілася і фармальная канцэпцыя выданьня. У анкеце мы зьвярнуліся да чытачоў, якія ведаюць віленскі варыянт (г.зн. чыталі «НН» альбо зь першага нумару (такіх сярод карэспандэнтаў 66), альбо з 1991-95 г. (такіх 94)), з просьбай ацаніць зьмены. У выніку мы атрымалі адказ: на думку большасьці даўніх чытачоў, газэта «СТАЛА ЛЕПШ» (113, у т.л. для 21 — «значна лепш»); 16 ніякіх істотных зьменаў не заўважылі, а 20 лічаць, што газэта «стала горш» (у т.л. 2 — «значна горш»).



Чым яны матывуюць станоўчую ацэнку? «Зьявіўся «Інфарматар» (11) і публікацыі на палітычныя тэмы; газэта стала бліжэй да простага чытача (варыянт — да зямлі, да жыцьця, да сярэдніх розумаў); набыла больш маладзёжны кірунак; стала рэгулярным тыднёвікам; друкуецца тэлепраграма, рэкляма, «пра музыку»; стала лепшым афармленьне». Сьпіс аргумэнтаў супраць новай канцэпцыі таксама некароткі: «друкуецца менш літаратуры; зьнік водар Вільні; выданьне стала больш «папсовым»; няма мастацкай фатаграфіі; газэта стала прадказальнай»... Многія карэспандэнты адмовіліся ацэньваць зьмены, заўважыўшы што проста «НН» СТАЛА ІНШАЙ, вось і ўсё.

Напэўна, гэта найбольш слушная думка. Бо можна сабе ўявіць, што дзьве канцэпцыі ў выглядзе двух розных выданьняў маглі б цалкам бесканфліктна суіснаваць. Праўда, назва газэты больш адпавядае тыднёвай пэрыядычнасьці.

У гэтым самым пытаньні мы прапанавалі чытачам адказаць, што з «Нашай Нівы» 1991-95 гадоў яны вярнулі б у сучасны тыднёвік. З адказаў на гэтае пытаньне мы можам рабіць каштоўныя для нас высновы пра галоўныя вартасьці ранейшага праекту.

Высьвятляецца, што найбольшая вартасьць — гэта пераклады замежнае літаратуры (11) і арыгінальныя творы — аб'ёмістыя, настраёвыя (6), філязофскія, культуралягічныя і гістарычныя эсэ (6), лацінка (8), фотаздымкі Алены Адамчык (5), тэматычныя нумары, прысьвечаныя розным гарадам (5), «Дзёньнік прыватнага чалавека» (5), віленская тэматыка (3), літаратурная крытыка (3), аб'ём (3), апытаньні, рубрыкі «Вось сымбаль твой, забыты краю родны», «На Жыгімонта 12-2», «Паштовая скрынка», творы Паўлоўскага, Францішка Эн, Сіоля, Ніцкі. Некаторыя чытачы лічаць, што трэба вярнуць элітарнасьць, спэцыфічны дух, атмасфэру далучанасьці да эўрапейскай культуры, «навуковасьць» артыкулаў і дух аптымізму.

Мабыць, апошняе — самае загадкавае. Пасьля пераезду ў Менск «Наша Ніва» адлюстроўвае рэчаіснасьць без містыфікацыяў, ад чаго яе засьцерагаюць жанар, маса праваых нарматываў і «індустрыя» (штотыдзень 16 паласаў — гэта ўжо «індустрыя»). Духу аптымізму бракуе ў сёньняшняй менскай рэчаіснасьці. Але гэта ня значыць, што мы ня знойдзем выйсьця. Мінула яшчэ замала часу...

А вось як выглядае рэйтынг найлепшых тэкстаў віленскай «НН» 1991-95 г. (тое, што запомнілі многія):

М.Брандыс. Каралеўства Беларусь. Пераклад з польскай.
С.Юстапчык. Каханы горад.
Л.Геніюш. Партызаны.
С.Мацёры. Ленка.
С.Паўлоўскі. Ідэя Мёртвага Дому. Літоўскі паход на Вільню.
А.Дзярновіч. Сэрыя артыкулаў пра манаскія ордэны.
Г.Сагановіч. Невядомая вайна.
А.Сіюль. Promenade да 3-й гадавіны «НН».
Францішак Эн. Лісты пра сучасную літаратуру.

Згадваліся таксама Лёнданская лекцыя Прэзыдэнта БНР М.Абрамчыка, анкета «Беларуская гістарычная літаратура», эсэістыка Мэвы Марон ды іншае...

Аўтары «НН»

Сярод галоўных закідаў, якія чытачы робяць сёньняшняй «Нашай Ніве»: «вузкае кола аўтараў, адныя й тыя імёны, зашмат Глёбуса, клянавае выданьне, карпаратыўнасьць». Напэўна, добрых аўтараў ніколі не бывае зашмат. І тым ня менш, у адказ на пытаньне пра лепшага аўтара нашыя карэспандэнты назвалі ажно 29 прозьвішчаў, што для «НН», згадзіцеся, нямала. Тым больш, што называліся толькі сталыя, уласна нашыя аўтары. А колькі такіх, што друкуюцца толькі аднойчы!..

Увесь гэты чытацкі РЭЙТЫНГ выразна падзяляецца на тры групы: аўтары, якія набралі больш-менш трыццаць галасоў, больш-менш 10-15 галасоў і больш-менш пяць галасоў. Апошнія — альбо ўжо даўно не друкуюцца ў «НН» і таму прызабыліся, альбо яшчэ толькі пачалі заяўляць пра сябе. Такіх большасьць. Другая група — тыя, у каго ўжо ёсьць свой сталы, «спэцыфічны» чытач. Гэта Сяргей Астраўцоў, Зьміцер Бартосік, Андрэй Дынько, Ігар Кузьняцоў, Ганна Матусэвіч, Сяржук Сокалаў і Сяргей Харэўскі. Нарэшце, трэцяя група — самыя-самыя, «усіхнія» ў «НН»: Славамір Адамовіч, Уладзімер Арлоў, Адам Глёбус, Алег Дзярновіч і Севярын Квяткоўскі.

Мы ня згадваем тут, колькі дакладна чалавек назвалі лепшым таго або іншага аўтара, таму што калі б анкетаў было ня 230, а 130 ці 330, парадак лідараў быў бы іншы. Але тое, што групы аўтараў ужо б не зьмяніліся — гэтая выснова дакладная. Занадта вялікі паміж імі разрыў.

Сёньня ў «НН» і разам зь ёю працуе шмат новых і пэрспэктыўных аўтараў, а сталыя і прызнаныя дапамагаюць ім адаптавацца. Гэтак «НН» пераадольвае ўласную карпаратыўнасьць.

Найлепшыя матэрыялы

Калі гаворка ідзе пра «Нашу Ніву» 1996 г., то спэктар «найлепшага» таксама выглядае надзвычай шырока. Напэўна, гэта сьведчыць пра разнастайнасьць нашай сёньняшняй аўдыторыі. Здаецца, не было ў нас ніводнага аўтарскага тэксту, які б камусьці не запомніўся як найлепшы. Але назавем толькі тыя, што згадваліся найчасьцей.

С.Адамовіч. Звычайны фашызм-2 (15)
С.Адамовіч. Рэпартаж з 4-й камэры (13)
І.Кузьняцоў. Ненапад. 17 верасьня 1939 (9)
А.Дынько. Алах Акбар (6)
І.Кузьняцоў. Калпашава (5)
М.Роўда. Калекцыянэр (4)
С.Адамовіч. 5-я страфа (4)
А.Глёбус. Не люблю Далі (4)
В.Калнін. Гісторыя і параўнаньні (3)
А.Лукашук. У фіялетавай ночы вугал крыла (3)
Я.Янушкевіч. Эпізоды вайны (3)

Акрамя згадваньня былых публікацыяў, чытычам прапанавалася назваць асабліва цікавы матэрыял у тым нумары, у якім друкавалася анкета. Сьледам прапанавалася назваць матэрыял, якога ў нумары магло й ня быць. Таму ніжэй у дужках пададзеныя лічбы — «за» і «супраць»:

А.Дынько. 13 новых Сьвятых (57-1)
І.Кузьняцоў. Нюрнбэрг (32)
Ул.Арлоў. Вустрыцы а пятай раніцы (31-3)
Д.Карчынскі: «Крайнія хаты заўжды гараць першымі...» (13-1)
С.Х. Паварот у справе С.Адамовіча (13)
А.Глёбус. Зямля і калодзеж (11-3)
С.Паўлоўскі. 19 кастрычніка (11-1)
І.Бабкоў. Заўтра (9-6)
З.Бартосік. Сумны тост за восень (8-3)

Працяг на старонцы 13



Шлях Эўропы ў Беларусь

Што такое эўрапейскасьць?

Чаго я чакаю ад Эўропы? Перш за ўсё таго, што гэтая шчодрая цётухна накорміць, напоіць мяне ды надрукуе мае эсэ ды раманы. Але ж я разумею, што не накорміць, не напоіць і не надрукуе.

Чаго яшчэ я чакаю ад Эўропы? А вось — каб там не было Расеі.

Сапраўды, Расея ды Амэрыка, гэтыя melting pots, раствараюць людзей, культуры, этнасы; гэтымі велізарнымі нацыянальнымі мэханізмамі немагчыма рацыянальна кіраваць. А Эўропа — гэта нешта камэрнае, такое, чаго можна дасягнуць розумам. Расея не супадае з нашым уяўленьнем пра Эўропу. Аднак Эўропа не ўратуе нас ад наступкаў каляніялізму: патрэбны нам уласны ўнутраны зрух.

Што ж да тых, якія разьлічваюць увайсьці ў Эўропу разам з Расеяй... Гэта нагадвае мне стары савецкі анэкдот пра тое, што вайны ня будзе, але будзе такая барацьба за мір... Так і тут: Эўразіі не застанецца, але будзе такая Эўропа, у якую нават мы ня схочам...



Калі сур'ёзна, дык нам хочацца ў Эўропу, таму што нам хочацца жыць у такой прасторы, у такім часе, якія б не растваралі ў сабе ні індывідуальнасьці чалавека, ні асобнай культуры. І мы лічым, што такім месцам у гісторыі магла б стаць Эўропа ці, больш канкрэтна, Сярэдняя Эўропа, ці... Эўрапейскасьць — гэта шматкультурнасьць у абмежаваным. У эўрапейскасьці — адмова ад падзелу на сваё і несваё (калі «это — русское, а это — не наше»), у эўрапейскасьці — успрыманьне чужой культуры як свайго чужога, нечага такога, чым я не магу распараджацца, але за што я адчуваю адказнасьць. Эўрапейскасьць — гэта ня проста талерантнасьць у дачыненьні да чужых культураў, а такі стан, калі суіснаваньне зь імі прыносіць асалоду, робіцца неабходным. Уласна кажучы, калі чужыя культуры становяцца сваімі чужымі.

Дзеля таго, каб сьцьвердзіць у сабе гэтую эўрапейскасьць, мы хочам ісьці ў Эўропу.

Але якая Эўропа будзе найлепей гарантаваць бясьпеку нашай камэрнай шматкультурнасьці?

Партнэрства дзеля эўрапейскасьці

Шлях да пабудовы крыху больш надзейнай і дынамічнай Цэнтральнай Эўропы напрошваецца сам сабой. Гутарка тут пра фармаваньне своеасаблівага ланцуга: Нямеччына дапамагае ўвайсьці ў эўрапейскія структуры Польшчы, Польшча дапамагае ў тым самым Украіне, Украіна — Беларусі. Гаворка йдзе пра ўтварэньне трыкутніка Варшава-Кіеў-Менск, у якім Украіна і Беларусь ураўнаважвалі б заходняга партнэра.

Ідэі Балта-Чарнаморскага саюзу не спрацавалі. І сапраўды, што агульнага ёсьць у эстонцаў з украінцамі? Хіба што ідэя антырасейскасьці. Але кожнае «анты» можа быць прычынаю, але не асноваю саюзу.

Украінска-беларускае стратэгічнае партнэрства — гэта не антырасейскі блёк, гэта альянс дзеля пераадольваньня наступкаў каляніялізму ў сабе ды фармальнай інтэграцыі ў эўрапейскія структуры.

Украінска-беларускае стратэгічнае партнэрства

Бясспрэчна, патэнцыйна Ўкраіна — гэта рэгіянальная супэрдзяржава і паводле колькасьці насельніцтва, і паводле геаграфічнага становішча, і праз агульную зацікаўленасьць у гэтым. Ператварэньне Ўкраіны ў рэгіянальную супэрдзяржаву пайшло б на карысьць усім: ураўнаважыла б расейскія ўплывы ў Беларусі, прынесла б Каўказу надзею на стабільнасьць, гарантаваную трэцяй сілай, упарадкавала б сытуацыю на паўднёвым усходзе Эўропы. Нарэшце, Расея страціла б усялякую пэрспэктыву экстэнсыўнага разьвіцьця, экспансіі на Захад і была б змушаная да засяроджваньня на ўнутранай рэфлексіі, якая лягічна павінна прывесьці да ўнутранага ўстойлівага разьвіцьця.

Украінская патэнцыйнасьць можа рэалізавацца пры ўмове эвалюцыі, а дакладней, рэвалюцыі ўкраінскай саматоеснасьці. Разбурэньне нацыянальнай, рэгіянальнай і мясцовай саматоеснасьці ў савецкі час прывяло да адзінага доўгатэрміновага наступку: нараджэньня комплексаў уласнае непаўнавартасьці, безь пераадоленьня якіх пэрспэктывы дасягненьня ўстойлівага ўнутранага дынамізму маларэальныя.

Адчуваньне агульнай непаўнавартасьці, маргінальнасьці ды асабістай бескаштоўнасьці выступае галоўным чыньнікам крывавых міжнацыянальных і міждзяржаўных канфліктаў. Агрэсія — гэта спосаб пазбавіцца агульнанацыянальных і асабістых комплексаў.

Новы асобны кантэкст, новая дыялектыка рэгіянальных дачыненьняў могуць зьняць комплексы самастоеснасьці, пасрыяць унутранай інтэграцыі, удыхнуць жыцьцё ў новыя партрэты беларускай ды ўкраінскай ідэнтычнасьці.

Беларусь і Ўкраіна — дзьве краіны, якія перажылі найбольш разбуральнае сутыкненьне з эўразійска-расейскай цывілізацыяй, што непазьбежна прывяло іх да культурнага спаду.

Беларусь і Ўкраіна блізкія ня толькі геаграфічна, лінгвістычна, але й з прычыны агульнага гістарычнага досьведу, досьведу Вялікага княства Літоўскага, уніі, Рэфармацыі, барока, сёньняшняга нэапратэстантызму.

Украіна адыграла й пэўную ролю ў разьвіцьці новабеларускай нацыі ды дзяржаўнасьці. Так, Францішак Багушэвіч пачаў пісаць свае вершы, перабываючы ў Нежыне ў эміграцыі, а Ўкраінская Народная Рэспубліка прызнала, падтрымала, падвяла да абвяшчэньня незалежнасьці БНР.

Украінскі ўплыў быў, але стабільнага дыялёгу не адбывалася.

Паласа пушчаў ды балотаў Палесься падзяліла два народы мацней, чым мог бы падзяліць акіян у якім іншым выпадку. Ад палескае мяжы Беларусь ды Ўкраіна рухаліся ў розных кірунках. Беларусы хацелі дакрануцца да Балтыкі, украінцы — асвоіць Чорнае мора. Беларусы да мора не дайшлі, і гэта вызначыла іхнюю долю (ці нядолю). Украінцы дасягнулі мэты, але вялікае пашырэньне нацыянальнай прасторы выклікала небясьпечную энтрапію. Паўстала праблема пераворваньня Ўсходу ці пераворваньня Ўсходам.

Беларуска-ўкраінскі культурны дыялёг практычна ня вёўся, бо нашыя культуры разьвіваліся паралельна, тымі самымі этапамі, а таму былі малацікавыя адна адной.

Вільня ды Львоў — яшчэ адзін прыклад паралелізму беларускай ды ўкраінскай культураў. Вільня — дзівосны помнік ліцьвінска-беларускіх мрояў пра мора і выйсьце ў першую Эўропу. Львоў — сьведка ды вястун рацыяналістычнага супраціву ўсходняй анархіі, сьведка таго, што «мы другая Эўропа, а трэцяй не бываць». І Львоў, і Вільня так і не былі поўнасьцю засвоеныя ўкраіцамі ды беларусамі і засталіся вялікімі «сваімі чужымі».

Цяпер Вільня адрэзаная ад Беларусі мяжою ды візамі, а таму новае значэньне для нас набывае Львоў.

Цяпер надышоў зручны момант, каб распачаць украінска-беларускі культурны дыялёг і нават, хоць гэта й гучыць правакацыйна, украінскую інфармацыйную ды палітычную экспансію ў Беларусь.

Антыўкраінская кампанія, што разгарнулася ў Беларусі вясною ды летам сёлета, можа быць патрактаваная як нежаданьне пэўных сілаў дапусьціць паўнацэнны ўкраінска-беларускі дыялёг. Украінска-беларускае партнэрства — гэта шлях, па якім Эўропа прыйдзе да нас. Але ланцуг Нямеччына-Польшча-Беларусь не абарвецца на нас. Калі Расея акажацца здольнаю на ўнутраныя зьмены, некаму, без сумневу, давядзецца стаць і адвакатам Расеі перад Эўропай.

Андрэй Дынько

Kalandar

KALANDAR

18 listapada

U hety dzień... u 1918 h. Jazep Piłsudzki staŭ načalnikam polskaj dziaržavy.

Naradzilisia: Louis Daguere (1789-1851), francuski mastak, vynachodnik fatahrafičnaha pracesu — dahieratypii; Alan Bartlett Shepard (1923), pieršy amerykaniec, jaki palacieŭ u kosmas; biełaruski paet Anatol Viarcinski (1931).

19 listapada

Naradzilisia: Indira Gandhi (1917-84), premjer Indyi; Ferdinand de Lesseps (1805-94), francuski inžyner, aŭtar praektu Sueskaha kanału; Jose Raoul Capablanca (1888-1942) znakamity kubinski šachmatyst, čempijon śvietu ŭ 1921-27 h.

20 listapada

Naradzilisia biełaruskija litaratary Michaś Klimkovič (1899), Michaś Zarecki (1901) i Jaŭhienija Janiščyc (1948).

21 listapada

Naradzilisia: francuski piśmieńnik i filozaf Valter, sapraŭdnaje imia jakoha Francois-Marie Arouet (1694-1779); Uładzisłaŭ Streminski (1893-1952), biełaruski mastak i tearetyk mastactva.

22 listapada

U hety dzień... u 1944 pamior biełaruski piśmieńnik Kuźma Čorny; u 1963 h. u Dallas byŭ zabity prezydent USA John Fitzgerald Kennedy.

Naradzilisia: Thomas Cook (1808-92), anhielski padarožnik; Charles de Gaulle (1890-1970), francuski heneral, pieršy prezydent Piataj Respubliki (1958-69); niamiecki tenisyst Boris Beckier (1967).

U 1975 h. praz dva dni paśla śmierci heneraɫa Franco kniaź Juan Carlos staŭ karalom Hišpanii Juanam Carlosam I; u 1990 h. Margaret Thatcher, pieršaja žančyna-premjer Vialikabrytanii, padała ŭ adstaŭku.

23 listapada

Naradziŭsia biełaruski kampazytar Uł.Teraŭski (1871).

24 listapada

U hety dzień... u 1943 u ssyłcy pamior biełaruski heohraf Mikałaj Azbukin.

Naradziŭsia: halandzki filozaf Baruch Spinoza (1632-77).

U 1963 h. Jack Ruby, uładalnik načnoha klubu, zastreliŭ Lee Harveya Oswalda, mierkavanaha zabojcy prezydenta Kennedy.

Адмыслоўца Навінаў

Севярын Квяткоўскі

Менск — невялікі ўтульны горад. Адчуваньне ўтульнасьці ўзьнікае ня дзякуючы адмысловай архітэктуры й жыцьцёвым традыцыям, якіх амаль няма. Менск — месца адпачынку ад эмоцыяў, ад уражаньняў, месца, дзе няма штохвіліннай неабходнасьці прапускаць праз сябе бязьмерную энэргію часу й культуры. У Менску ці ня ўсе нечаканасьці вядомыя табе наперад, яны зьвязаныя з тваім асабістым жыцьцём. Астатнія —мадулюеш сам. Ва ўмовах разрэжанае атмасфэры — культурнай, інфармацыйнай, ва ўмовах, калі ступень важнасьці якой-кольвек грамадзкай падзеі залежыць ад твайго жаданьня, не застаецца нічога, як закатваць рукавы, і самому маляваць навакольную рэальнасьць. У такіх цяплічных умовах для гуманітарнай чыннасьці ўсіх кшталтаў Эўропа йснавала вельмі даўна, а можа — ніколі.

Год таму ў Баварыі быў выкрыты, а пасьля асуджаны на турэмнае зьняволеньне супрацоўнік невялікай лякальнай FM-станцыі. Ягоная віна палягала ў тым, што на працягу некалькіх гадоў ён ПРЫДУМЛЯЎ выпускі навінаў. Ці можа зьдзівіць нашага чалавека тая інфармацыя, што гэтая станцыя мела найбольшую папулярнасьць сярод сваіх канкурэнтаў? Натуральна, не. Ужо колькі пакаленьняў прызвычаілася за савецкім часам успрымаць інфармацыю як своеасаблівую «развлекаловку». У лепшым выпадку цікаўны спажывец інфармацыі рабіў высновы аб сапраўдным стане рэчаў праз сваю ўласную сыстэму здагадак. Але прыклад нямецкага радыё-адмыслоўца падае праблему ў, так бы мовіць, чыстым выглядзе. Журналіст выдумляў інфармацыю «ад балды».

Асабіста мяне ў гэтай сытуацыі ўразіў тэрмін дзейнасьці гэтага чалавека. Два зь лішкам гады ў ягоных сумесьцічаў не ўзьнікала ані падозраньня. Сьвет, пра які ім распавядаў журналіст, быў дужа цікавы. Няўжо яны ня мелі магчымасьці суаднесьці інфармацыю зь іншымі каналамі мас-мэдыя? Яны ня мелі ПАТРЭБЫ суадносіць і аналізаваць. Ці ведаў журналіст пра жорсткасьць айчынных законаў? Хутчэй за ўсё. Але я ня веру, што ён адчуваў сябе злачынцам. Наўрад ці журналістам рухалі адно мэркантыльныя матывы. Магчыма, праз пэўны час ён застанецца ў памяці як адзін з апошніх нямецкіх авангардыстаў-канцэптуалістаў, ці якім рэвалюцыянэрам-нонфармалістам...

Цяпер Беларусь жыве ў часе, калі інфармацыя зрабілася сапраўды ўжытковай, і праз гэта сталася выразна бачна, як моцна яе не стае. Рэч у тым, што ў нас завёўся свой «адмыслоўца навінаў», які імкнецца пераўтварыць вытворчасьць інфармацыі ў «справу СВАЙГО жыцьця». Ён робіць гэта простым чынам — ператварае сябе ў адзіную бясконцую навіну, і робіць гэта гвалтоўна. Нямецкі журналіст прыдумляў вельмі цікавы сьвет, які нікому не перашкаджаў жыць. Наш «адмыслоўца» робіць усё наадварот.

Праблема ў тым, што вялікай колькасьці беларускіх спажыўцоў інфармацыі гэтай бясконцай «навіны» пакуль цалкам хапае. Больш за тое, яны НЕ ЖАДАЮЦЬ ведаць штосьці іншае. Іх можна зразумець — нараджэньне жаданьня — рацыянальнае. «Адмыслоўца» ўжо пачаў паступова паўтараць «сябе-навіну». Гэта значыць, што неўзабаве ў слухачоў зьявіцца жаданьне «выключыць прыёмнік».

Л І Т А Р А Т У Р А

Лютэранская споведзь

Інгмар Бэргман выдаў новую кнігу

Згодна з ранейшымі абяцаньнямі, 78-гадовы Інгмар Бэргман, пакінуўшы кіно і выйшаўшы на тэатральную пэнсію, інтэнсіўна займаецца пісьменьніцкаю працай. Мінулага панядзелка ў Стакгольме пабачыла сьвет яго новая кніга «Прыватныя размовы». Гэта працяг аўтабіяграфічных аповесьцяў-сцэнароў Бэргмана «Добрыя жаданьні» і «Нядзельнае дзіця». Гэтак сама, як у першых двух творах, у «Прыватных размовах» аўтар расказвае пра бурлівае супольнае жыцьцё сваіх бацькоў. Фабула завязаная на нявернасьці яго маці Карын (у кнізе — Ганны), якая здраджвае са студэнтам тэалёгіі свайму паранаідальнаму мужу-пастару. Кніга мае форму пяці размоваў, якія Ганна праводзіць з блізкімі ў 1925-34 гадах. «Прыватная размова» — гэта ў лютэранскай царкве свайго роду адпаведнік каталіцкай споведзі.

Невядома да канца, якія зь пікантных падрабязнасьцяў тых размоваў сапраўдныя і ці апісаныя сустрэчы не ўяўляюць сабою ўвогуле толькі твору аўтарскага ўяўленьня? Як бы там ні было, Бэргману чарговага разу ўдалося стварыць цалкам унівэрсальную, рэлігійна і філязафічна глыбокую рэч. Стакгольмскі «Dagens Nyheter» піша, што, пачынаючы са свайго першага квазі-аўтабіяграфічнага фільму «Фані і Аляксандар», Бэргман раскрываецца як вядучы аналітык мяшчанскага сьвету. «Прыватныя размовы» — гэта таксама гатовы сцэнар фільму. Яго прэм'ера пройдзе найбліжэйшымі Калядамі ў Швэцыі. Рэжысэравала фільм былая партнэрка Бэргмана нарвэжка Ліф Ульман, а ў ролі пісьменьнікавай маці зноў выступіла Пэрніла Огэст, якая за сваё акторства ў «Добрых жаданьнях» здабыла ўзнагароду кінафэстывалю ў Канах.

П.Ц.

№ 33/96
18-24 лістапада

інфарматар
НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы – штотыдзень 8 паласоў патрэбнае інфармацыі

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION



Пералікі ўказаў і распараджэньняў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, прызнаных Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь цалкам ці часткова неадпаведнымі Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь. Паводле стану на 13 лістапада 1996 года

1. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 28.09.1994 г. №128 "Пытаньні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 14.04.1995 г. прызнаны за неадпаведчы ў частцы наданьня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь функцыяў цэнтральнага органа дзяржаўнага кіраваньня і наданьня ёй уладных паўнамоцтваў адносна іншых арганізацыяў тэлевяшчаньня і радыё.

2. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 21.08.1995 г. №336 "Аб некаторых мерах па забесьпячэньні стабільнасьці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусь".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 08.11.1995 г. пункты 1, 2, 3 і 4 Указа прызнаныя за неадпаведныя Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

3. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 01.09.1995 г. №350 "Аб некаторых пытаньнях рэгуляваньня працоўнай дзейнасьці і пэнсійнага забесьпячэньня грамадзянаў".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 27.10.1995 г. пункт 1 у рэдакцыі Ўказа Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 20.10.1995 №437 і пункты 2, 3 і 4 прызнаныя за неадпаведныя Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

4. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 20.10.1995 г. №437 "Аб унясеньні зьменаў ва Ўказ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 01.09.1995 г. №350 "Аб некаторых пытаньнях рэгуляваньня працоўнай дзейнасьці і пэнсійнага забесьпячэньня грамадзянаў".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 27.10.1995 г. пункт 1 прызнаны за неадпаведны Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

5. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 08.08.1995 г. №299 "Аб зацьвярджэньні Палажэньня аб парадку выдачы дыпляматычных і службовых пашпартоў грамадзянам Рэспублікі Беларусь".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 03.11.1995 г. прызнаны за неадпаведны Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь у частцы пазбаўленьня дэпутатаў Вярхоўнага Савета і судзьдзяў Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь права на дыпляматычны пашпарт.

6. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 01.09.1995 г. №349 "Аб упарадкаваньні некаторых ільготаў для асобных катэгорыяў грамадзянаў".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 26.12.1995 г. пункт 1 цалкам, пункты 2, 3 і 4 у частцы скарачэньня ільготаў і перавагаў, прадугледжаных для грамадзянаў законамі Рэспублікі Беларусь прызнаныя за неадпаведныя Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

7. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 12.07.1995 г. №267 "Аб удакладненьні бюджэту Рэспублікі Беларусь на 1995 год і часовых мерах па скарачэньні бюджэтных выдаткаў".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 05.10.1995 г. пункты 1, 5, 6 і абзац другі пункта 13 прызнаныя за неадпаведныя Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

8. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 14.11.1995 г. №464 "Аб стварэньні кадравага рэестру Галавы дзяржавы Рэспублікі Беларусь".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 10.10.1996 г. пункт 2 у частцы ўключэньня ў кадравы рэестар Галавы дзяржавы пасадаў кіруючых работнікаў дзяржаўных органаў, прызначэньне (абраньне) якіх на пасады ажыцьцяўляецца без удзелу Прэзыдэнта і пункт 4 у частцы ўзгадненьня з Прэзыдэнтам накіраваньня ў службовыя замежныя камандзіроўкі кіраўнікоў дзяржаўных органаў, непадвеламасных Прэзыдэнту прызаныя за неадпаведныя Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

9. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 19.09.1995 г. №383 "Аб правядзеньні рэформаў мясцовага кіраваньня і самакіраваньня".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 11.12.1995 г. цалкам прызнаны за неадпаведны Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

10. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 27.11.1995 г. №481 "Аб зацьвярджэньні прыблізнай структуры мясцовых адміністрацыяў у раёнах гарадоў".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 11.12.1995 г. цалкам прызнаны за неадпаведны Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

11. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 30.11.1995 г. №485 "Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Часовае палажэньне аб мясцовай адміністрацыі".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 11.12.1995 г. цалкам прызнаны за неадпаведны Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

12. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 20.11.1995 г. №476 "Аб зацьвярджэньні Палажэньня аб старшыні абласнога, Менскага гарадзкога выканаўчага камітэта".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 18.06.1996 г. часткова прызнаны за неадпаведны Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

13. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 13.07.1995 г. №271 "Аб аплаце працы службовых асобаў некаторых дзяржаўных органаў".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 28.12.1995 г. пункты 1 і 2 прызнаныя за неадпаведныя Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

14. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 16.08.1995 г. №301 "Пра ўнясеньне зьмены ў прылажэньне 2 да Указа Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 13.07.1995 г. №271.

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 28.12.1995 г. пункты 1 і 2 прызнаныя за неадпаведныя Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

15. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.12.1995 г. №519 "Аб некаторых пытаньнях забесьпячэньня дзейнасьці мясцовых Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 04.07.1996 г. прызнаны часткова за неадпаведны Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

16. Распараджэньне Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.12.1995 г. №259рп "Аб выкананьні нормаў указаў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 29.04.1996 г. прызнаны за неадпаведны пункт 1 у частцы, што прадпісвае дзяржаўным органам забясьпечыць безумоўнае выкананьне нормаў указаў, прызнаных ва ўстаноўленым законам парадку неканстытуцыйнымі і якія ня маюць юрыдычнай сілы.

17. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 28.06.1996 г. №233 "Аб рэарганізацыі газэты "Народная газета".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 17.10.1996 г. прызнаны цалкам за неадпаведны Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

18. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 14.10.1996 г. №424 "Аб унясеньні зьменаў ва Ўказы Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 28.06.1996 г. №233 і ад 28.06.1996 г. №235".

Заключэньнем Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 17.10.1996 г. прызнаны цалкам за неадпаведны Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь.

На разглядзе Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь знаходзяцца наступныя матэрыялы, накіраваныя Старшынём Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь:

1. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 20.10.1995 г. №433 "Аб зацьвярджэньні Палажэньня аб парадку рашэньня пытаньняў, зьвязаных з аб'яднаньнем аднайменных адміністатыўных адзінак, якія маюць агульны адміністратыўны цэнтар".

2. Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 20.10.1995 г. №434 "Пра аб'яднаньне адміністратыўных адзінак Рэспублікі Беларусь, якія маюць агульны адміністратыўны цэнтар".

The Publishers Weekly Bestsellers
Сьпіс бэстсэлераў на 11.11.96

На гэтым тыдні	На мінулым тыдні	Назва кнігі. Аўтар		Выдавецтва	Колькасьць тыдняў у сьпісе
1	1	The Deep End of the Ocean	Жаклін Мічард	Viking	9
2	-	"M" is for Malice	Сю Грэфтан	Henry Holt	1
3	2	The Laws of Our Fathers	Скот Тараў	Farrar, Straus & Giroux	6
4	5	The Tailor of Panama	Джон Ле Карэ	Knopf	3
5	4	Desperation	Стывэн Кінг	Viking	3
6	9	The Third Twin	Кэн Фолет	Crown	9
7	-	My Gal Sunday	Мэры Хікінс Кларк	Simon &Schuster	1
8	7	Executive Orders	Том Клэнсі	Putnam	13
9	6	The Regulators	Рычард Бахман	Dutton	6
10	10	The Notebook	Нікалас Спаркс	Warner	4

@1995 Cahners Publishing Company

20 ЛЕПШЫХ ВІДЭАКЛІПАЎ *"MTV"* НА 12 ЛІСТАПАДА 1996 ГОДА

"+" - кліп палепшыў пазыцыю ў сьпісе ў параўнаньні зь мінулым тыднем
"-" - кліп пагоршыў сваю пазыцыю
"*" - навінка
"=" - бязь зьменаў пазыцыі

Пазыцыя	Выканаўца	Назоў кліпа
* 20	**Red Hot Chili Peppers**	Love Rollercoaster
- 19	**Soundgarden**	Blow Up The Outside World
* 18	**The Fugees**	Ready Or Not
+17	**Celine Dion**	It'All Coming Back To Me Now
* 16	**2Pac**	I Ain't Mad At Cha'
- 15	**Hootie And The Blowfish**	Sad Caper
+ 14	**The Fugees (Refugee Camp)**	No Woman No Cry
+ 13	**Madonna**	You Must Love Me
+ 12	**311**	All Mixed Up
- 11	**R.E.M.**	Bittersweet Me
+ 10	**Bush**	Swallowed
+ 9	**Sheryl Crow**	If It Makes You Happy
+ 8	**Marilyn Manson**	The Beautiful People
= 7	**Counting Crows**	Angels Of The Silences
- 6	**Sublime**	What I Got
+ 5	**Metallica**	Hero Of The Day
+ 4	**Dr. Dre**	Been There, Done That
- 3	**Bones thugs-n-harmony**	Days Of Our Lives
+ 2	**No Doubt**	Don't Speak
= 1	**Blackstreet featuring Dr. Dre**	No Diggity

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусі
АБАНЭМЭНТ на газэту 63125
НАША НІВА
Колькасьць камплектаў

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАЎНАЯ КАРТКА

ПВ | места | Літэр

на газэту 63125
НАША НІВА

Кошт	падпіскі	руб.	Колькасьць камплектаў
	пераадрас.	руб.	

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ______ (паштовы індэкс) ______ (адрас)

Каму ______ (прозьвішча, ініцыялы)

СЬВЕТ ЗА ТЫДЗЕНЬ

КРАЇНА

У АЎТОРАК, 12 лістапада, ў аўтамабільнай катастрофе загінуў кіраўнік цэнтру "Усход-Захад" 37-мі гадовы Анатоль Майсеня.

У СЕРАДУ, 13 лістапада, Аляксандар Лукашэнка выступіў з прамоваю ў Дзяржаўнай Думе Расеі. У той жа дзень у Маскве група дэпутатаў Вярхоўнага Савету на чале зь Віктарам Ганчаром не атрымала слова для выступу ў адказ.

АЛЯКСАНДАР Лукашэнка зьняў Віктара Ганчара з пасады старшыні ЦВК сваім загадам ад 14 лістапада, у той час як зрабіць гэта паводле канстытуцыі мае права толькі Вярхоўны Савет.

ВІКТАР Ганчар заявіў, што не прызнае загаду прэзыдэнта і падпарадкоўвацца толькі Вярхоўнаму Савету. Раніцой 15 лістапада Віктар Ганчар прабіўся праз міліцэйскую заслону на сваё працоўнае месца, але каля 13 гадзінаў дня супрацоўнікі Галоўнага ўпраўленьня дзяржаўнай аховы пры прэзыдэнце з прымяненьнем фізычнай сілы вывелі старшыню ЦВК са свайго кабінэту. Адначасова быў зьбіты дэпутат Валеры Шчукін, што там прысутнічаў. Сямён Шарэцкі заявіў, што "у рэспубліцы адбыўся захоп улады антыканстытуцыйным шляхам".

ДЫРЭКТАР дэпартамэнту Беларусі, Украіны і Малдовы Джэк Сыгал заявіў, што Злучаныя Штаты занепакоены антыканстытуцыйнымі дзеяньнямі прэзыдэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. ЗША заклікалі прэзыдэнта і парлямэнт "да супрацоўніцтва ў межах дзейснай Канстытуцыі".

ДЭПУТАТЫ Вярхоўнага Савету правялі ноч з 15 на 16 лістапада ў памяшканьні парлямэнту. Учора прэзыдэнт прыняў зварот да сусьветнай і беларускай грамадзкасьці, у якім кажацца пра пагроз дыктатуры, якая усталёўваецца пад выглядам рэфэрэндуму. На панядзелак прызначаная экстраная сэсія Вярхоўнага Савету, на якую запрошаны прэзыдэнт, генэральны пракурор, сябры ўраду і старшыня Канстытуцыйнага Суду.

ЦЫТАТА. Анатоль Майсеня. *"Лукашэнку падтрымліваюць у Расеі палітыкі адного зь ім тыпу — Жырыноўскі, Лебедзь. Яны раўнуюць да ўлады, ім ня цікавыя ні законы, ні Канстытуцыя. Яны зьвяртаюцца наўпрост да народу, бо ведаюць, што толькі абалваніўшы народ яны могуць утрымацца ва ўладзе. І гэтым людзям мы можам сёньня сказаць — адарвем ногі разам з ботамі і не памыюць яны іх у Індыйскім акіяне, калі вы палезеце сюды, на Беларусь."*

ЦЫТАТА. Віктар Ганчар. *"...Што датычыць галасаваньня, то Цэнтральная выбарчая камісія ня можа прызнаць тую прававую вакханалію, якая адбываецца зараз на выбарчых участках. У гэтай сувязі, я афіцыйна заяўляю, што пакуль на кожным выбарчым участку ня будуць абодва праекты дадаткаў у Канстытуцыю, Цэнтральная выбарчая камісія не прызнае вынікі папярэдняга галасаваньня... Я афіцыйна заяўляю, што ў сувязі з гэтай прававой і палітычнай вакханаліяй я, як старшыня ЦВК вынікоў пратакол галасаваньня падпісваць ня буду".*

СЬВЕТ

ТУРЦЫЯ. Міністар замежных справаў Тансу Чылер падчас візыту ў Ярданію заявіла, што яе краіна, нягледзячы на супраціў Злучаных Штатаў, адчыніць трубапровад з Іраку да міжземнаморскага узьбярэжжа Турцыі. Тансу Чылер сказала, што ААН ухваліла ідэю падобнага праводу, які дазволіць Іраку закупаць мэдыкамэнты і прадукты.

ЛІБІЯ. Муамар Каддафі абвясьціў у краіне ўсеагульную мабілізацыю ў адказ на стварэньне мабільных сілаў хуткага рэагаваньня Італіі, Францыі, Гішпаніі і Партугаліі. Лібійскі лідар заявіў, што разглядае стварэньне падобных частак як абвяшчэньне вайны яго краіне.



УКРАІНА. Першы намесьнік міністра абароны краіны Бяжан ускляў на Расею няўдачу перамоваў па падзелу Чарнаморскага флёту. Нагадаем, што Расея патрабуе права ўласнасьці на некаторыя ваенныя базы ў Крыму. Украіна ж пагаджаецца толькі на прадастаўленьне Расеі права арэнды базаў на сваёй тэрыторыі.

ПОЛЬШЧА. Міністар замежных справаў Польшчы Расаці адзначыў, што Польшча ня можа пайсьці на прапанаваны Расеяй рэжым вольнага гандлю, бо гэта супярэчыць пагадненьням Польшчы з Эўрапейскім Эканамічным Саюзам.

АЛЬЖЫР. Чарговы тэрарыстычны акт альжырскіх фундамэнталістаў у Бырхадэме, паўднёвым прадмесьці сталіцы краіны, прывёў да сьмерці пятнаццаці пасажыраў рэйсавага аўтобуса, які быў зьнішчаны пры выбуху начыненага трацілам аўтамабіля.

ЛІТВА. На выбарах у парлямэнт па аднамандатных акругах яшчэ 35 месцаў атрымала партыя Вітаўтаса Ландсбэргіса "Саюз Айчыны". Разам зь месцамі, атрыманымі па партыйных сьпісах яна будзе прадстаўленая ў Сойме сямідзесяцма дэпутатамі (усяго дэпутацкіх мандатаў — 141).

УКРАІНА. Са словаў сакратара Рады нацыянальнай бясьпекі і абароны Украіны Гарбуліна, удзел яго краіны ў праграме "Партнэрства дзеля міру" можа ўрэшцы рэшт прывесьці да ўступленьня яе ў сам блёк NATO.

ІНДАНЭЗІЯ. На патрабаваньне ваенных уладаў дзьве інданэзійскія тэлекампаніі зьнялі рэкляму брылянціна, у



якой малады чалавек выказвае па тэлефоне свайй сяброўцы шкадаваньне, што яму прыйдзецца састрыгчы свае валасы з-за службы ў войску. Вайскоўцы лічаць, што такая рэкляма ствярае адмоўны імідж службы ў войску.

АНГЛІЯ. Супрацоўнікі Імпэрскага каледжу і музэю натуральнай гісторыі ў Лёндане, абапіраючыся на вынікі геалягічных досьледаў паўвыспы Юкатан, заявілі, што дыназаўры загінулі пасьля таго, як на зямлю 65 мільёнаў гадоў таму ўпаў гіганцкі астэроід. У выніку выбуху, роўнаму выбуху 10000 вадародных бомбаў, у паветра ўзьнялася такая колькасьць пылу, што на Зямлю на працягу трох месяцаў не даходзіла сонечнае сьвятло, з-за чаго не праходзіў фотасынтэз і што прывяло да масавай гібелі як наземных, так і марскіх жывёлаў.




ЗША. У штаце Агаё буран і сьнегапад пашкодзіў электралініі і дзясяткі тысячаў людзей засталіся без электрычнасьці. Вышыня сьнежнай покрывы перавысіла 30 см.

БОСЬНІЯ. Ваенныя лідары басьнійскіх сербаў на чале з генэралам Ратка Младзічам адмовіліся выконваць загад прэзыдэнта Біляны Плаўшыч і сыходзіць у адстаўку. Прызначаны на месца Младзіча генэралмаёр Пора Чоліч апынуўся ў



поўнай ізаляцыі — усе ягоныя загады ігнаруюцца. Прэзыдэнт Югаславіі Слабадан Мілошавіч накіраваў свайго прадстаўніка ў Босьнію з мэтаю ўрэгуляваньня канфлікту між ваеннымі і палітычнымі ўладамі.



КАНАДА. Канада дала згоду ўзначаліць міжнародны кантынгент у Заір. Адначасова ў Заір прыбывае група амэрыканскіх экспэртаў для вывучэньня становішча ў краіне. Місія кантынгенту заключаецца ў перадачы насельніцтву прадуктаў. Прэм'ер-міністар Канады Жан Крэцьен сказаў, што колькасьць кантынгенту мусіць складаць каля 10 тыс. чалавек.

ЭГІПЕТ. У Каіры праходзіць Міжнародная эканамічная канфэрэнцыя па Блізкім Усходзе, на якой сустракаецца каля 10 тысячаў бізнэсмэнаў з усяго арабскага сьвету. Палестынцы заклікаюць да байкоту Ізраіля, калі той ня выведзе свае войскі з Хэбрана.

ЛІТВА. У Вільні ад сардэчнага ўдару памёр вядомы кінарэжысэр Вітаўтас Жалакявічус. Аўтару фільмаў "Ніхто не хацеў паміраць", "Гэта салодкае слова свабода", "Хроніка аднога дня" і інш. было 66 гадоў.

ЗША. Традыцыйнае галасаваньне ў Генасамблеі ААН па пытаньні амэрыканскага эканамічнага эмбарга Кубы



скончылася тым жа, чым і ў мінулым годзе. За адмену эмбарга галасавала 138 краінаў, супраць — тры: ЗША, Ізраіль і Узбэкістан.

СЛАВЕНІЯ. Прэзыдэнт Славеніі Мілан Кучан мяркуе, што ў ягонай краіне пры ўваходзе ў NATO можа быць размешчаная ядзерная зброя.

КІТАЙ. Кітайская паліцыя прымяніла сьлезацечны газ пры разгоне маніфэстацыі сялянаў у правінцыі Хунань, якія пратэставалі супраць павелічэньня падаткаў.

ЗША. Карпарацыя "Боінг" атрымала ад ВПС ЗША заказ на суму 1,1 міліярды даляраў для стварэньня ўзброенага лязэрам самалёта, які зможа зьнішчаць балістычныя ракеты. Плянуецца ўвесьці першую партыю з сямі "Боінгаў" у войска ў 2008 годзе. Агульнае кіраваньне праектам будзе зьдзяйсьняць Цэнтар касьмічных і ракетных сыстэмаў ВПС ЗША на авіябазе Кіртлэнд, штат Нью-Мэксыка.

ГРЭЦЫЯ. Пасажырскі паром "Самаіна" пратараніў уноч на аўторак узброены ракетамі эсьмінец "Кастакас". Эсьмінец патануў, чатыры матросы загінулі.

ЗША. У штаце Мінэсота кампаніяй "Сылікон грэфікс" прадстаўлены новы супэр-кампутар, здольны праводзіць трыльён калькуляцыяў у сэкунду. Гэта значыць, што на апэрацыі, якія самыя моцныя кампутары праводзяць зараз за тры месяцы, новай машыне спатрэбіцца некалькі дзён. Кошт кампутара на рынку будзе складаць ад 500 000 даляраў і вышэй.

ІНДЫЯ. Трэцяя па колькасьці ахвяраў за ўсю гісторыю авіяцыі катастрофа адбылася ў аўторак у дэлійскім аэрапорце. "Боінг-747" саўдаўскай авіякампаніі сутыкнуўся з казахскім самалётам Іл-76. Загінуў 351 пасажыр (341 з "Боінга" і 37 з "Ільюшына").

РАСЕЯ. У нядзелю, у выніку тэрарыстычнага акту на Катлякоўскіх могілках у Маскве супраць дзеячоў Расейскага фонду інвалідаў вайны ў Аўганістане загінулі 13 чалавек і 26 параненых. Сярод іх дырэктар фонду. Нагадаем, што гэты фонд мае мытныя і падатковыя ільготы, якія былі дадзеныя яму ў 1993 годзе.

ЯПОНІЯ. У інтэрвію японскай тэлекампаніі NHK неназваны афіцэр касьмічнага кіраўніцтва ЗША сказаў, што 28 верасьня гэтага году над паўднёвай часткаю Ціхага акіяну згарэў апошні расейскі спадарожнік-шпіён "Космас-2320". Цяпер Расея ня можа адсочваць ваенную дзейнасьць іншых краінаў з космасу.

РАСЕЯ. Дзяржаўная Дума Расеі прыняла зварот да прэзыдэнта Ельцына і Рады Фэдэрацыі з просьбай разглядзець пытаньне аб пастаяннай дысьлякацыі 14 арміі ў Прыднястроўі і прызнаньні гэтага рэгіёну зонай стратэгічных інтарэсаў Расеі.

КАНАДА. Знакаміты францускі сьпявак Шарль Азнавур, які прыехаў з гастролямі ў Квэбэк, вырашыў частку песень выканаць па-ангельску. Але заля пачала абструкцыю, а частка гледачоў гучна скандавала — "па-француску".

РАСЕЯ. Рада Фэдэрацыі Расеі прапанавала ўраду пачаць грашовую эмісію для таго, каб выплаціць пэнсіі і заробкі.

ПАЎДНЁВАЯ АСЭТЫЯ. Прэзыдэнтам Паўднёвай Асэтыі абраны Людвіг Чыбіраў — кіраўнік краіны з 1993 году. У 1991 годзе Паўднёвая Асэтыя абвесьціла незалежнасьць і распачала вайну з Грузіяй. Грузія прызнала выбары нелегітымнымі.

ДАНІЯ. Прэм'ер-міністар Даніі прыняў у Капэнгагене брытанскага пісьменьніка Салмана Рушдзі, які прыбыў на цырымонію ўручэньня яму літаратурнай прэміі Эўрапейскага Саюза.

ГІШПАНІЯ. Парлямэнт Гішпаніі прыняў рашэньне аб поўнай інтэграцыі гэтай краіны ў ваенныя структуры NATO з мэтаю ўстаць у адзін шэраг звядучымі эўрапэйскімі краінамі.


КІТАЙ. Вярхоўны суд Кітаю зацьвердзіў сьмяротны прысуд Чжоў Байфаню — буйному прадпрымальніку і сыну аднога з паплечнікаў Дэн Сяопіна, які абвінавачваўся ў дачы хабару дзяржаўным чыноўнікам.

РАСЕЯ. Колькасьць насельніцтва Расеі з пачатку гэтага году паменшылася на 300 тысячаў чалавек і склала каля 148 мільёнаў. Нараджальнасьць зьнізілася паўсюль, апроч Масквы і Чукоткі. Высокая сьмяротнасьць сярод немаўлятаў.

ІНДЫЯ. У выніку катастрофы аўтобуса каля гораду Бундзі ў сярэдняй Індыі загінулі 31 чалавек. Пасажыры ехалі на вясельле.

КУРДЫСТАН. Аднавіліся перамовы паміж варожымі курдзкімі бакамі — Дэмакратычнай партыяй Курдыстана і Патрыятычным саюзам Курдыстана. Прадстаўнікі гэтых партыяў на сваёй сустрэчы заявілі, што будуць працягваць прытрымлівацца пагадненьня аб спыненьні агню.

РАСЕЯ. Завершыўшы свой візыт у Японію міністар замежных справаў Расеі Яўген Прымакоў. Пад час візыту абмяркоўвалася стварэньне спэцыяльнай эканамічнай зоны на Курылах і сумеснае выкарыстаньне выспаў у гандлёвым партнэрстве.




ЗША. З прычыны адстаўкі дзяржсакратара ЗША Уорэна Крыстафэра ў Белым доме адбылася цырымонія. На ёй Клінтан заявіў, што Крыстафэр "пакінуў сьлед ў гісторыі — прычым не абстрактны сьлед, а канкрэтныя вынікі, якія прыцягнулі за сабой рэальныя зьмены ў жыцьці амэрыканскага народу і народаў іншых краінаў. Мне пашанцавала, што на працягу гэтых чатырох гадоў ён быў побач са мной у якасьці дзяржсакратара, і я ганаруся гэтым".

ЧЭХІЯ. На парлямэнцкіх выбарах у гэтай краіне перамогу атрымала кіруючая дэмакратычная партыя.

РАСЕЯ. Міжплянэтная станцыя, якая была запушчаная на Марс, застрала на арбіце. Гэта расцэнена спэцыялістамі, як буйную няўдачу расейскай касьмічнай праграмы.

КІТАЙ. Кітайскі ўрад абвінавáціў ЗША ў палітыцы эканамічнага стрымліваньня.



ТАЦЯНА СЬНІТКО

КАЛЫХАНКА НАПРЫКАНЦЫ ВОСЕНІ
(песьня пра народнае волевыяўленьне)

Сьпі, зямля мая, засьні!
Пазяхні, заплюшчы вочы.
Чуеш: "Будзе, як захочаш"?
Не трубуйся. Адпачні.
Слухай казку!
Пра цароў
І найлепшую краіну.
Пра Івана, Кацярыну,
Аляксандра і сяброў...
Напаўяве бачыш сон?
Пэўна, сьнег! Бялее неба,
Б'ецца сонца, крык: "Ня трэба!" —
У небе чорны парасон?..
Сьпі, на гэта не зважай!
Слухай песьні напаўвуха.
Устанеш — будзе аплявуха.
Зьнерухомей.
Засынай.
Сьпі, зямля мая, засьні!
Ранкам будзеш ты ўмыта
Цёпленькай вадой нібыта
Асьвячонае хлусьні.
Схочаш хлеба каравай —
Зноў адломяць на сьняданак
Тры акрайцы абяцанак:
"Не падавіцца, бадай".
Для жадаючых цяпла
Будзе танная гарэлка,
Будзе нафта з апахмелкай
Ласкай з хамскага стала.
А вдовишчаў табе
Назапашаны сюжэты!
Пра няверных, пра паэтаў,
Пра краіну ў барацьбе...
Сьпі, спадарыня Зямля!
Гэта — заўтра, гэта — потым:
Шчасьце за калючым дротам,
Воля танная твая!..
Сёньня хочаш выкрыцьця —
Потым з "ворагаў народа"
Зробіш прыклад, як заўсёды,
Гераічнага жыцьця?
Сьпі спакойна! Сьні зімы
Белы саян, што да твару.
Ен — растане! Гэту мару
Лепш пакінь такім, як мы.
Забярэм з сабой званы,
А цябе пакуль укрыем
Тонкай коўдрай белых крылаў —
Да Вялікадня вясны...

ЯЎГЕН ГУЧОК

+++
Сапраўдная навука — ёсьць акно,
Ды ў нас заўсёды
Вокны біць любілі.

+++
Слова Божае —
Ня жбан са сьмятанай...
Таму і ня лезуць туды суайчыньнікі.

+++
Час Розуму — Яно нібы і так,
Ды толькі месца Розуму —
Ня ўсюды.

ШАРАМЕЦЕВА ГАННА

С.А.
Як нарадзіцца — дык хоць у раі.
А як памерці — у родным краі.
Блукаць па сьвеце. Жыць дзе заўгодна.
А як памерці — у краі родным.
За Ханаанскай зямлі парогам —
у змрочным, хамскім, сьляпым, убогім,
маной атручаным, несвабодным,
бязбожным, скурчаным Краі Родным.
Каго люблю я, таму жадаю
памерці ў гэтым каханым краі.

СЯРГЕЙ ПАТАРАНСКІ

ДОБРА
Добра грэцца ноччу ля каміна —
успамінаць што ёсьць, і што было.
Добра, калі ў гэтыя хвіліны
можна марыць і глядзець за шкло.
Добра, што зьвіняць дажджу купіны,
і ўздыхае сонная зямля,
і ўсю ноч шапочуць мне галіны,
што нішто ня верне мне жыцьця.

СЯРГЕЙ ПРЫЛУЦКІ

Гэй, чалавеча!
Ты ня маеш права жыць —
Твая душа даўно табой забіта.
І з рук тваіх крыві ня змыць.
Бо ад яе яны ўсё болей ненасытныя.
Гэй, ты, аматар сьмерці і вайны!
Ў тваіх разьюшаных вачах
Распалены агонь вар'яцтва.
Ніколі ім ня ўбачыць сіняе вады,
Ніколі ім ужо не засьмяяцца.
Гэй, той, каго ўсе клічуць чалавекам!
У голасе тваім зьвярыным — лютасьць.
Быць нават не спрабуй падобным да людзей,
Бо ўсюды будзе чутна твае рэха.
Гэй, ты, ня злуйся на мяне.
Прашу цябе:
"Схавай сваю дурную зброю
І адыдзі ад нас далей
Ды гора наша панясі з сабою".
Жнівень 1996

КОРБУТ АНДРЭЙ

СЬВЯШЧЭННЫ ВЕРШ
О, індаэўрапейскі наш народ!
Лунаеш ты над роднай Беларусьсю
Нішто нам голад, мор і землятрусы
Перад сьвяшчэннай славаю тваёй!
Сэкматысячаварны шлях адмер
У водах сусьвятовых ачышчайся...

АЛ. ТРАФІМ.

+++
Не кладзі на халодны граніт
Жывых кветак, калі я памру.
Белы сьцяг наш са стужкай крыві
Узаўецца хай горда ўгару.
Выпаў вельмі няпросты мне лёс,
Ды ніколі я не шкадаваў,
Што любоў к Беларусі пранёс
Праз жыцьцё. Гэты шлях сам абраў.
За любоў да радзімай зямлі,
Для чужынцаў я ворагам стаў.
Перажыў, дзе другія ляглі,
А Радзіму сваю не прадаў.
Дык любі яе, як я любіў
І нашчадкам любоў перадай.
Белы сьцяг наш са стужкай крыві,
Найвялікшы як скарб зьберагай.
16-18.09.96

МІХАСЬ МАЛІНОЎСКІ

Пераклад рымскага байкапісца
Фэдра Бабрыя (1 ст. н.э.)

ЛІСА І МАСКА
Ліса, пабачыўшы маску трагедыйную,
"Што за твар, а мозгу няма!"— усклікнула.
Кажу для тых, каму і славу, і пашаны
Даў лёс, ня даў розуму цьвярозага.

ЛІСА І ВІНАГРАД
Пад лозамі ліса, пакутуючы ад голаду,
Да вінаградных гронкаў ускочыць сілілася.
Але не змагла, і, адыходзячы, мовіла:
"Яшчэ нясьпелы ён: не люблю кісьляціны!"
Хто на словах ганіць непасільнае,
Свае тут павінен бачыць паводзіны.

ЧАРНЯКЕВІЧ ЮРЫЙ

+++
Бел-чырвона-белы сьцяг
Узьнімаўся над табою
А Пагоня імчалась так
Што, здавалась, ніхто не дагоніць.
Але яе дагналі,
Спаймалі, скруцілі, зьвязалі
І сьцяг наш крывіцкі зьнялі
Наш беларускі сьцяг.
Павесілі новы арнамэнт —
стары ён усё ж аказаўся:
Зь пацьдзесят чацьвертага году
Ужо ён над намі вагаўся.
Беларусы! Чакайце хвіліну,
Калі Беларусь прачнецца
Тады зможаце Вы зь бясьпекай
Сьцягі і гербы родныя ўзяць.
Панясяце Вы іх над сабою
І ўзьнясуцца ў неба
Сьцяг бел-чырвона-белы
І рыцар на белым коні!

УЛАДЗІСЛАЎ РЭЎТ

+++
Над зялёнай купалінкай
Птушка песьню сьпявала,
Сьпеў той чысты разнасіўся
Далёка па краі,
Па ўсёй роднай Беларусі —
Прабач, мая матка —
Разнасіўся ён паволі,
Але сумна, цяжка.
Разнасіўся супраць волі
Тых, хто плач народны,
Ператвараў у крыкі, воплі
Катаў — на думку іх —
Народаў, "малодшых брацьцяў рускіх",
Што за "брацінскую" крывінку, годны,
Мяжы чужынскія сьцярожыць.

В.ПСЭЎДОНІМ

СОН
Мне прысьнілася...
Старшыня калгасу
вырасьціў на сваіх палетках
стогаловую гідру.
І вясёлыя сяляне
прыносілі ёй салодкія пакункі.
І слынныя мудрацы
паблажліва глядзелі на яе.
І галавастыя і сур'ёзныя дзялкі
хціваю рукой падносілі ёй свае прэзэнты.
І я ўскармліваў яе маўчаньнем.
Я прачнуўся, мокры ад халоднага поту.
Я хаваюся далей ад ЯГО,
я ўцякаю з Ганнай Зэгерс
і Томасам Манам.
Я засынаю, станаўлюся ценем,
станаўлюся зданьню,
зь якой выссалі ўсё нутро.
Томаса Мана і Ганну Зэгерс затрымалі.
Бедныя старыя...
Іх вывучаюць у школах.
Я прачынаюся, каб глянуць у вакно на сонца.
Яно, кажуць, узышло, але
страх глядзець у вакно:
там — ён.
страх выйсьці за дзьверы:
там — ён
страх сядзець у хаце:
там — ён.
страх глядзець у вакно...
І думка,
што катуе мяне —
цьвік,
што ўбівае ў галаву
кат:
мой страх —
мая страха,
аб якую ... разьбіваецца вецер,
аб якую... разьліваецца дождж,
аб якую... рассыпаецца град,
якая бароніць ад сьнегу,
якая бароніць ад сьмерчу,
якая бароніць ад яго,
якая бароніць ад мяне,
аб якую разьбіваецца дождж,
аб якую разьбіваюся я...
Вырваўшы
цьвік з галавы,
я выходжу на дождж...
я выходжу на вецер...:
я выходжу на сьмерч...
Першая кропля дажджу
ўпала
на маю галаву.
Я гляджу ў вочы
Архітэктару Стрэх.

ЯЗЭП ВІСАРЫЁНАЎ

19 кастрычніка 1996 г.

ПРАВАДЫР І ПАЭТ
Зараз я — не такі, як учора.
Мае нэрвы — напружаны дрот!
А вусач прадстаўніча гавора
Зноў пра "наш памяркоўны народ".
Свае словы, як быццам цукерку,
Да сьліны ён смакуе знарок.
А зірне,— дык здаецца пад мерку
Падагнаць мусіць мой чарапок!
Скрыгачу я ад злосьці зубамі,
Пальцы сьціснуліся ў кулакі,
А ў экране — на твары з вусамі
Наравіста трымцяць жаўлакі!
"Правадыр! Я кажу табе чэсна:
Не араб я, ня сакс, дый ня фін!
Зь імі й генаў ня маю сумесных,—
Бо сапраўдны — як ты — славянін".
Не такі я, як некалі, сёньня!
Бачу шляху свайго далягляд.
А Яговыя мары й жаданьні
Мяне цягнуць натужна назад!
А яговыя высхлыя мысьлі
Муцяць розум, як моцны кумыс!
Угледаюся пільна наўмысьля
Я ў вусатага твару абрыс.
А на твары,— мне добра знаёмым,—
Пад вачыма пухлінаў агрэх.
"Выглядаць толькі мусіш нястомным,—
Але-ж стома — ня выпханы плёх!
Не схаваеш яе касмэтычна,
Бо ўсяроўна прынадзіць пагляд.
Правадыр ты магчыма й клясычны,—
Але бачны ўжо твой заняпад!
Ыш чаго пажадаў — дыктатуры!!!
Не паднесьлі як бохан і соль?
Лайдакі!!! Кожны меў бы на скуры
Каля сэрца "хвалёны" сымболь!!!
Звыш-людзьмі мелі б гонар мы звацца.
(Ці ж пра гэта ты марыў, паэт?!)
Як казаў твой вядомы дарадца:
"Звышдзяржаўнасьць ёсьць прыярытэт!"
Вунь жа ўзьнёс як выяву краіны
Над усёю зямлёю вусач!!!
Нібы сьвету ўсяго верхавіна
Мы цяперака,— толькі пабач!!!
Распрастаў,— бы чырвоную зорку: —
Ён выяву дзяржавы мае.
Промні сонца, як быццам аборкі
Ахапілі ахоўна яе!
"Правадыр! Я кажу табе годна,
Каб ня ў прыклад паслужным чынам,—
Я з табой у адным толькі згодны:
"Час узьняцца з каленаў і нам!!!"

Зробім годнымі й нашую мову,
І сапраўдны сымболь — навякі!!!
Твой-жа герб — як і ты — тэрміновы,—
Захаваем, як "символ Луки"!
Час нам выпрастаць дужыя плечы,
Разагнаць над краінаю змрок,
Шлях уласны абраць, а ня нейчы —
Накшталт "кампфу" й "Броска на Восток"!
Хай шыбуе на Ўсход Жырыноўскі
Вы — ніколі ня зладзіце ўдвух!
Бо-ж вядомы ён "фюрэр Крамлёўскі".
Ты-ж славуты "калхозны канюх"!
Хай над ім увесь сьвет парагоча!
(Нам чужая славутасьць — ня ў лік!)
Хоча,— хай сабе ў Індыі моча
Свой "сапог", а ня наш чаравік!
Я лічу, правадыр, за абразу
(Але ж пэўна такі ў цябе лёс!)
Пакланяцца сьвятому абразу,
Што з пасланцам табе ён паднёс!
Дый лічу я найгрубай памылкай
Твой прынадны з пасланцам абнім.
Пэўна зблытаў ты сцэну з парылкай —
Дзе раней сустракаліся зь ім?!
Даўні звычай славянскі, мо й сьвецкі:
Справы цёмныя ў пазьні сьвятліць.
А ты ў прэсу: "Шарэцкі, Шарэцкі!"
(У прылазьніку хіба стаіць?!)
Як зірну на ўсё гэтае — сорам
Працінае мяне да касьцей!
Правадыр,— але-ж лепшым узорам
У культуры ня стаў для людзей!!!
Не крыўдую нікольki за гэта,—
Сам няскрэблівы, як бервяно.
Я таксама ня ведаў кляззэта
Й па патрэбе хадзіў за гумно!
Росквіт нацыі — можная мэта.
А культуры набытак — уздым.
Ты ж за краты закінуў паэта,
Каб яго змардаваць маладым.
У паэтаў — талентнасьць ад бога.
У паэтаў — душа не лядзяк!
Ім жыцьця не патрэбна чужога,
Бо й з уласным ня зладзяць ніяк!
Не насіў ён з сабой пісталетаў.
Дый мазгоў ён зусім не адпіў!
Ну, пісаў нешта там для газэтаў
Пра забойства, але ж не забіў!
Не забіў ні цябе й анікога
(Хаця й меў пры сабе "выкідняк")
У паэта — талентнасьць ад бога,
У паэта — душа не лядзяк!
У паэта — як думка, дык мроі,
У паэта — як мроі, дык твор!
У паэта — адзіная зброя,—
Гэта верш,— што страляе ў упор!"

УЛАДЗІМІР САЛАЎЁЎ

Прысьвячаецца К.П.П.

КУМІР НЕБУКАНЕДЦАРА
Паданым ён крычаў ў аблудзе:
Вы ля маіх ляжыце ног!
І хай цяпер над вамі будзе
Да веку мой адзіны бог!
Я клічу вас ў раўніну Дуры.
Кідайце ўсе багоў сваіх.
Схіліцеся ж як перад бурай
Перад стварэньнем рук маіх."
Прыслужнікі у бомы білі.
Быў чутны мусыкійскі гром.
І ладан там жрацы курылі
Перад чарговым алтаром.
І ад Эгіпта да Паміра
Князі сабраліся кругом
І рукатворнага куміра
Жыцьця назвалі ўладаром.
Ён быў вялізны, цяжкі, страшны,
Сьпіною бык, а з твару леў.
Вакол ляжалі купы брашнаў
І дым кадзільніцаў курэў.
І перад ідалам на троне,
Трымаючы сьвяшчэнны шар
І ў семіяруснай кароне
зьявіўся Небуканедцар.
Ён гаварыў: "Мае народы!
Зямны я бог, я цар цароў,
Таптаў я кожны сьцяг свабоды.
Вышэй я іншых ўладароў.
Але я ўбачыў, што вы груба
Маліліся другім багам,
Хоць толькі цар, што небу любы,
Мог даць багоў сваім рабам.
Вам бога новага даю я.
Яго сьвяціў мой царскі меч.
Непаслухмяным ж я рыхтую
Крыжы й распаленую печ."
І па раўніне дзікім стогнам
Пранёсься крык: "Ты бог багоў!"
Зьліваючыся з бомаў звонаў
І з гласам трапяткіх жрацоў.
Пры выглядзе такога глуму
"Мой Бог!" — я моцна закрычаў,
Грамчэйшы за вар'яцтва тлуму
Мой голас ў небе загучаў.
І ад вяршынь Атурапатны
Дыхнула бурнаю зімой.
Як храма полымя аглядна
Цьвердзь разышлася нада мной.
І беласьнежныя мяцелі
Са градам, зь ліўневым дажджом
Карою лёдзістай адзелі
Раўніну Дурскую кругом.
Ён паў ў падзеньні найвялікім
І перакулены ляжаў.
А ад яго у страху дзікім
Люд апантана уцякаў.
Таго былога ўладцу ўспомніў:
Я неяк бачыў на палі,
Як ён з гавядаю нароўні
Траву скуб проста пры зямлі.

1890

Пераклаў з расейскай Валянцін Грыцкевіч, верасень, 1996 г.

Верш найвялікшага расейскага тэоляга і філёзафа XIX стагодзьдзя Ўладзіміра Сяргеевіча Салаўёва (1853-1900) заснаваны на матывах разьдз. 3-4 "Кнігі Прарока Даніла". На беларускую мову гэтую кнігу пераклаў наш Фр.Скарына. Але калі
немцы чытаюць Біблію ў перакладзе М.Лютара, сучасьніка нашага першадрукара, то беларусы фактычна адлучаныя ад падобнага перакладу Скарыны, і для тых зь іх, хто выхоўваўся пры Саветах, пераклад Скарыны недасягальны, як і п'еса Сімяона Полацкага "Пра цара Навухаданосара", прысьвечаная тым жа разьдзелам "Кнігі Прарока Даніла".

Паколькі арыгінал верша быў прысьвечаны Канстанціну Пятровічу Пабеданосцаву, галоўнаму ідэолягу рэакцыйных контррэформаў Аляксандра III і Мікалая II, то, зразумела, царская цэнзура забараніла друкаваньне верша пры жыцьці Ул.Салаўёва.

В.Грыцкевіч

ЯНКА НАРАЧАНСКІ

ВОСЕНЬСКІ ПАРК
Вакол незвычайны спакой
Усё нерухомае на хвіліну
Зачараваныя бы цішынёй
Лісты трапяткой асіны
Нібы ў нейкай журбе
Рады тапалёў і клёнаў
І на галінках хоць дзе-нідзе
Няшмат лістоў залачоных
Сонца пагодзіць паволі
Промнямі марна зямлю
Хораша так на прывольлі
Восені ўспрымаць цішыню
Чароўны маўклівы вечар
Як многа ў ім хараства
Кружыць ліст у паветры
Павольна, бы перына
Цудоўна блукаюць па парку
Пры небасхіле сонца
Вабіць закат змалку
Бы палонны вандроўка
Колькі ж ва ўсім прыгажосьці
Гама колераў розных
У адценьнях — разнагалосься
У маляўнічых мясьцінах родных
Як важна, што тут апынуўся я
Што сын — гэтага краю.
Што менавіта тут нарадзіўся я
І песьні, аб ім ствараю!
22 верасьня 1996 г.

КАСТУСЬ АТРАШЭЎСКІ

Вязьню-Беларусіну Славаміру Адамовічу

ЖЫВОМ!
Трасьлі нас войны-землятрусы,
Скрозь над душой чужацкі зброд,
Але: трываюць беларусы —
Натуры ўпартае народ.
Груганьнё Захаду-Ўсходу
Над намі крумкала ня раз
Ды глянь: праз цемру і нягоду
Ўзыходзіць новы, зорны час.
Збрыднелі блазнаў хохмы, маскі.
Халопскай досыць нематы.
Брат-беларусе! Калі ласка,
Гучней гамоньма — я і ты!
Ня дайма д'яблу-чарнавусу
Цугляць і бэсьціць родны кут,—
Вар'ята-Антыбеларуса
Ў дурдом нядоўга упекут.
Хай доля жорсткая прыпала
Масьціць бальшак праз твань і гаць,—
Люд Каліноўскага, Купалы
Ня будзе жабраком канаць!
На волю птушка рвецца з клеці,
Бязьмежжам Млечны Шлях дрыжыць...
Мы — не прыблудамі ў сусьвеце —
Жылі. Жывом. І будам жыць!
Масква, верасень—кастрычнік 1996 г.

ІГАР СІДАРУК

ГОН

Ахвярую ўсім,
хто адчувае сябе зьвяр'ём.

1.
"Та-тах!"
Залпамі б'юць па дзіках.
А маленькае парасятка хоча "ням-ням".
Там — жыць нам.
Ці так?
"Та-тах!"
2.
Рог, трубі, рог!
Дрэва Каханьня
Ня вырве й бог.
Я — ля тваіх ног.
П'ю з выдзертым вокам грог.
3.
Дзе я?..
Сплывае крывёю надзея.
Дзіда ўвайшла пад рабро.
Зло пераможа дабро?..
4.
Зблізу — стрыж.
Здалёк — крыж.
Бачыш: у небе крыжы...
А дзе ж, мне скажы, стрыжы?
5.
Пушча. Сьляпні. Сьлякота.
П'ю з ручаіны ўпотай.
Губляюцца кроплі-словы.
Сьлед пакідаюць барвовы...
6.
Хлеб. Мёд.
Вісакосны год.
Расстаньне. Змрок.
Крок, крок...
Рык. Рок.
7.
Як зразумець
Таго, хто ня ўмее пець?
Зь веку ў век
Ня ўмее пець
Чалавек.
З адчаем і верай
Выю драпежным зьверам.
8.
Ваўкі — у скокі:
Лупяць двухстволкі!
Параненая ваўчыца
Да пагавішча ці дамчыцца?
"Мой Шэраскуры Божа!
дзецям галодным — хто дапамоожа?"
Ваўчанятки
Плачуць, зжараючы матку.
9.
"Зьвяры!
Надрапаем на кары
Адзіны для ўсіх закон..."
Не пасьпелі!
Чалавек распачаў гон.
10.
Уцякай!
Хоць за край,
Хоць за сам небакрай,
Уцякай!
"Перадыху дай..."
І даюць:
Перадыхнуўшых — б'юць!
11.
Ступай у мае сьляды.
Разам унікнем бяды
Разам ляжам у лог.
Я мог бы ўцячы, мог!..
Каб адзін...
Каб...
12.
Ціш. Неба...
І нічога болей ня трэба.
Анічога...
Заўтра пачнецца аблога.
13.
Гляджу на сонца
Неадрыўна, бясконца.
Сьлязьмі перапоўнены вочы —
Каб твае сьвяціліся ноччу.
14.
Акрываўлены, нап,
Дапаўзу, лягу.
На калені твае — галавой...
Вечнасьць пахне травой.

27-28 чэрвеня, 96 г.
м.Кобрынь

ПАНЯДЗЕЛАК, 18

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 "А я жыву ўсё яшчэ там жа... Пра каханьне". Д/ф.
8.20 Здароўе.
8.55 Мультфільмы.
9.25 "Пасьля дожджыку ў чацьвер". М/ф.
10.40 Творцы.
11.20 Фінасавы час.
11.40 Цёмны пакой.
12.10 Тэлевізійны Дом кіно.
12.50 Бон тон.
13.20 "Батальёны просяць агню". М/ф. С. 1.
14.25 "Крозай каханьня, крозай прыўкраснай..." Ф/к.
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільм.
15.20 ТБ — школе.
15.40 Студыя "Вакно".
16.35 На добры лад.
16.50 "Гэтага мы не праходзілі..."
17.05 Крок.
17.35 "Пазнай сябе".
18.05 Фінасавы час.
18.25 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
20.05 Вэртыкаль.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 "Гадзіньнік спыніўся апоўначы". М/ф.
23.30 Тэлевізійны Дом кіно.
24.00 Навіны.
0.15 Чэмпіянат сьвету па гіравым спорце.

ОРТ

14.00 Навіны.
14.20 "Касьмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша".
14.45 Маратон-15.
15.00 Зорная гадзіна.
15.40 "Карын і яе сабака".
16.05 Джэм.
16.30 "Вакол сьвету".
17.00 Навіны.
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Гадзіна пік.
18.35 "Адгадай мэлёдыю".
19.00 "Мы".
19.45 "Дабранач, дзеці!".
20.00 Час.
20.40 "Багз-2". "Апэрацыя "Казбэкістан".
21.45 "Тэатар + TV".
22.25 Навіны.
22.35 "Лінія кіно". "Культпаход у тэатар".

КАНАЛ "РАСЕЯ"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 Па дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Весткі.
7.20, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
7.30 Ранішні экспрэс-2.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 Дарагая рэдакцыя.
8.55 "Санта-Барбара". М/ф.
10.20 "Міраж". М/ф. С. 1.
16.20 Блёк-нот.
16.35 Сур'ёзная гульня.
17.05 Тэхнадром імя І.П.Кулібіна.
17.15 L-клюб.
18.00 Момант праўды.
18.40 Асабліва важныя асобы.
19.30 "Санта-Барбара". М/ф.
20.30 Схаванай камэрай.
21.00 Надвор'е на заўтра.
21.05 "На вастрыі нажа". М/ф.
22.05 Тэлескоп.
22.30 Арт-абстрэл.
23.35 Музыка ўсіх пакаленьняў.
23.50 Ня сьпі і глядзі.

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

13.10 Тэрмін адказу — сёньня.
13.40 Парады садоўнікам.
13.55, 15.55, 18.55, 21.55 Інфарм-ТБ.
14.10 "Гісторыя каханьня". Сэрыял.
15.00 "Цікаўнае сланя". Мультфільм.
15.10, 20.45 Тэлеслужба бясьпекі.
15.25 Міжнародны агляд.
16.10 "Убойны аддзел".
17.00 Мультфільм.
17.35 Паказвае ЛОТ.
18.40 Вялікі фэстываль.
19.15 Спорт.
19.25 "Гісторыя каханьня".
20.15 Канцэрт Ірыны Алегравай.
21.00 "Убойны аддзел".
22.05 Спартовы агляд.
22.15 Падзея.
22.30 Гістарычныя дасьледы.
23.10 "Тэлекампакт".

НТБ

5.00 Сёньня зранку.
9.00 М/ф "Сальватор Джуліяна".
11.00 Сёньня апоўдні.
12.00 Расейскія ўнівэрсытэты.
13.00, 15.00 Сёньня ўдзень.
13.15 Вялікая часінка.
15.30 Дыстанцыя 60.
16.30 М/ф "Блакітнае дрэва".
17.30 Футбольны клюб.
18.00, 21.00 Сёньня ўвечары.
18.35 Герой дня.
19.00 Сьвет кіно. "Горад, які баяўся заходу".
20.35 Музыка на канале.
21.35 Гадзіна сэрыялу. "За мяжой магчымага".
22.30 Часінка.
23.00 Сёньня апоўначы.
23.20 Тэніс апоўначы.

АЎТОРАК, 19

БТ

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50 Эканамікст.
8.00 Навіны.
8.15 "Гэтага мы не праходзілі..."
8.30 Абібок.
9.00 ТБ — школе.
9.30 Мультфільмы.
9.50 "Воля Сусьвету". М/ф.
11.00 Тураб'ектыў.
11.30 "Трапічная сьпёка".
12.30 Акаляда.
13.00 "Батальёны просяць агню". С. 2.
14.10 "Стваральнікі". Д/ф.
15.00 Навіны.
15.10 Мультфільмы.
15.25 ТБ — школе.
15.55 "Усё пра ўсё".
16.20 Пэдагагічны экран.
17.00 Заняткі Н.Наважылавай.
17.30 Параграф.
17.55 "Так гэта было..."
18.15 "Будзьце здаровыя".
18.25 Музычны антракт.
18.35 Эканамікст.
18.50 Навіны.
20.05 Супэргол.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Аўтарскі канцэрт кампазытара Эдуарда Ханка.
23.25 Навіны.
23.45 М/ф "Раман а-ля руса".

ОРТ

2. БЛАКІТНЫ ЛІХТАР // В.МУДРОЎ, В.ШЛЫКАЎ, А.РЫБІКАЎ. — НАВАПОЛАЦАК. — 1971-1974. — 8'. — 20-30 с. — 1 асобнік. — (рукапіс).

1971: 1; 1972: 2, 3; 1973-1974: 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11, 12, 13, 14, 15.

Часопіс "Блакітны ліхтар" выдаваўся групай наваполацкіх студэнтаў і школьнікаў у 1971-74 г. Зьвесткі пра зьнешні выгляд і аздабленьне адсутнічаюць. Выданьне было двухмоўнае: беларуска-расейскае. Непасрэдна выдаваньне ажыцьцяўлялі: В.Мудроў, В.Шлыкаў, А.Рыбікаў (папераменна). Літаратурны часопіс.

Пэрыядычнасьць — нерэгулярная. Фармат — у 1/8 аркуша; аб'ём ад 20 да 30 старонак. Наклад — 1 асобнік. Спосаб рэпрадукаваньня — рукапісны.

Усе нумары былі сканфіскаваныя КГБ. Інфармацыя пра выданьне: Ул.Арлоў, А.Аркуш. Апісаньне складзенае безь візуальнага азнаямленьня з выданьнем. На цяперашні час доступ да выданьня не ўяўляецца магчымым.

3. БУРАЧОК (назва №1 — **ВІТАЖЭНЕЦ**). — Менск. — 1987-1988. — 20-24 с. — (Машынапіс).

1987: 1, 2; 1988: 3.

Увесь тыраж другога нумару арыштаваны КГБ. *У фондах Архіву адсутнічае.*

4. ВЕРА: БЕЛАРУСКІ КАТАЛІЦКІ ЧАСОПІС // [РЭД. А.БЯЛЯЦКІ] — МЕНСК-СМАЛЕНСК. — 1988 — №1. — 16' — 144 с., іл. — [500 асобн.] — (машынапіс + ксэра).

Выдаваньне каталіцкага часопіса "Вера" ажыцьцяўлялася ў 1987-88 гадах. №1 выйшаў у канцы 1987 - пачатку 1988 году. №2 быў падрыхтаваны, але ня выдадзены. Часопіс рыхтаваўся ў Менску і выдаваўся ў Беластоку. Смаленск, як месца выданьня, указваўся для дэзінфармаваньня службы бясьпекі. Мова выданьня беларуская, правапіс — дарэформенны. Рэдактар — Алесь Беляцкі. Меркаваная пэрыядычнасьць — штоквартальна. Фармат —ў 1/16 аркуша; аб'ём — 14 старонак; наклад — 500 асобнікаў. Спосаб рэпрадукаваньня №1 — машынапіс з ксэракапіяваньнем. №2 быў падрыхтаваны на кампутары; далейшыя выпускі плянавалася ажыцьцяўляць друкарскім спосабам. У часопісе зьмяшчаліся разнастайныя матэрыялы рэлігійнага характару: тэксты малітваў; зьвесткі пра вернікаў у Беларусі і ў сьвеце; артыкулы пра хрысьціянства Янкі Купалы, Казіміра Сваяка; адозва да зьезду пісьменьнікаў Беларусі (Менск, 1976) і т.п. матэрыялы, а таксама паэтычныя творы А.Гаруна і Л.Геніюш ды пераклад апавяданьня Сьв. Г.Ваянскага "Юдава поле", зроблены М.Багдановічам.

Дадатковыя зьвесткі атрыманыя ад А.Бяляцкага.

5. ГУТАРКА: АБ УСІМ, ШТО БАЛІЦЬ // СЫМОН БЕЛАРУС. — МЕНСК. —1975-1976. — №1-38. — (машынапіс).

1975: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7; 1976: 1-38.

У фондах Архіва адсутнічае.

5-1. І ВОСЬ ЗАПРЭГЛІСЯ ЎСЕ ТРОЕ: Гутарка №1. — 14.XI.1975. — 2 с.

5-2. БЫКОЎСКІ НА ПАСАДЗЕ: Гутарка №2. — 21.XI.1975. — 4 с.

5-3. НАВОШТА СВІННІ РОГІ?: Гутарка №3. — Менск. —28.XI.1975. — 1 с.

5-4. З ДНЁМ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ!: Гутарка №4. —5.XII.1975. — 2 с.

5-5. МОВА — СЦЯГ НАРОДУ: Гутарка №5. — 12.XII.1975. — 2 с.

5-6. ПРЫВЕСЦІ ДА АДПАВЕДНАСЦІ: Гутарка №6. — 19.XII.1975. — 2 с.

5-7. ТАМУ, ХТО ПРАЧНУЎСЯ: Гутарка №7. — 26.XII.1975. — 2 с.

5-8. РАГВАЛОД І РАГНЕДА: Гутарка №1 (8). — 2.01.1976. — 3 с.

5-9. ПРЫЧЫНА НАШЫХ КРЫЎД І БЕД: Гутарка №2 (9). — 9.01.1976. — 2 с.

5-10. НЯМІГА І МЕНСК: Гутарка №3 (10). — 16.01.1976. — 2 с.

5-11. СУЩЕСТВИТЕЛЬНОЕ: Гутарка №4 (11). — 23.01.1976. — 5 с.

5-13. З ЧЫМ ІДЗЁМ ДА З'ЕЗДУ: Гутарка №6 (13). — 6.02.1976. — 2 с.

5-14. КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ: Гутарка №7 (14). — 13.02.1976. —2 с.

5-15. МСЦІСЛАЎ НЕ АДНАГО СЦІСНУЎ: Гутарка №8 (15). —20.02.1976. — 2 с.

5-16. ПРАДКАЗАННІ, ЯКІЯ СБЫЛІСЯ: Гутарка №9 (16). — 27.02.1976. — 3 с.

5-17. ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ — ВОЧЫ НАРОДУ: Гутарка №10 (17). —5.03.1976. — 1 с.

5-18. ПРА ЗМЕСТ І ФОРМУ: Гутарка №11. — 12.03.1976. — 1 с.

5-19. ЦІ СТРАШНАЯ НАМ КУЛЬТУРА?: Гутарка №12. — 19.03.1976. — 3 с.

5-20. НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ ВЫШЭЙ ЗА ЎСЁ: Гутарка №13 (20). — 26.03.1976. — 2 с.

5-21. ЦЭНТРАЛІЗАЦЫЯ, ДЭЦЭНТРАЛІЗАЦЫЯ І ДЭМАКРАТЫЯ: Гутарка №15 (22). — 9.04.1976. — 2 с.

5-22. ЗНОЎ ЦЯЖАР: Гутарка №16 (22). — 16.04.11976. — 4 с.

5-25. СКАРГІ: Гутарка №18 (25). — 30.04.1976. — 4 с.

5-27. ЧАМУ НЯМА ПАРАДКУ: Гутарка №20 (27). — 14.04.1976. —1 с.

5-28. ЦЯЖКАСЦІ І ПЕРСПЕКТЫВА: Гутарка №21 (28). — 1.05.1976. — 1 с

5-31. РАНЕЙ ПАН, ЦЯПЕР ПЛАН: Гутарка №24 (31). — 2.06.1976. — 11 с.

5-32. ПРА ІДЗАЛАГІЧНАЕ СУІСНАВАННЕ: Гутарка №25 (32). —18.06.11976. — 2 с.

5-35. ПРА МОВУ І КАЎБАСУ: Гутарка №28 (35). — 9.07.1976. —2 с.

5-37. ЧУЖАЗЕМЕЦ: Гутарка №30 (37). — 23.07.1976. — 4 с.

5-39. САМАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ: Гутарка №32 (39). — 6.08.1976. —2 с.

5-45. ГІСТОРЫЯ АДНАГО ПАЭТА: Гутарка №38 (45). — 17.11.1976. — 2 с.

6. КАНТРОЛЬ: БЮЛЕТЭНЬ ТАВАРЫСТВА МАЛАДЫХ ЛІТАРАТАРАЎ "ТУТЭЙШЫЯ" // [А.БЯЛЯЦКІ і С.ДУБАВЕЦ] — [МЕНСК] — 1988-1989. — 8' — 6-8 с. — [1000 асоб.] — (машынапіс + ксэра)

1988: 1; 1989: 1 (2)

Бюлетэнь Таварыства маладых літаратараў "Тутэйшыя"" выходзіў у 1988-89 г. спачатку асобнымі выпускамі, потым — на старонках "Студэнцкай думкі". Выйшла чатыры выпускі (№№1, 2 — асобныя, №№4, 5 — у складзе "Студэнцкай думкі"). Мова выданьня — беларуская, правапіс — дарэформенны. №1 і 2 былі выдадзеныя А.Бяляцкім пры дапамозе С.Дубаўца; астатнія — С.Дубаўцом. Пэрыядычнасьць ня ўказаная.

Спосаб рэпрадукаваньня — машынапіс з ксэрапамнажэньнем. Зьмяшчаліся матэрыялы палітычнага, літаратурнага і філялягічнага характару, зьвязаныя ў большай ці меншай ступені зь дзейнасьцю Таварыства маладых літаратараў "Тутэйшыя".

7. ЛЮСТРА ДЗЁН: Беларуская талеранцыйная грамада. —1979-1980.

1979-1980: №1-3.

8. МІЛАВІЦА. — Менск — 1974-1976.

1974-1976. — №1-7.

Самвыдавецкі часопіс "Мілавіца" выпускаўся на гістарычным факультэце БДУ. Асноўныя выдаўцы: У.Арлоў, Г.Кулажанка, І.Чарняўскі. Выйшла 7 нумароў. Пад ціскам КГБ і камсамольска-палітычных органаў выданьне спыніла сваё існаваньне. *У фондах Архіва адсутнічае.*

9. НАВІНЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТА ЗА ПЕРАБУДОВУ "АДРАДЖЭНЬНЕ": ВЫДАНЬНЕ АРГКАМІТЭТУ. — 1988, сьнежань. —№1. — 8' — 6 с.

1988: 1, 2; 1989: 1 (3) - 15; 1990: 1-5.

Выдаваліся са сьнежня 1988 г. Прадвесьнікам "Навінаў" зьявілася "Інфармацыйнае паведамленьне БНФ за перабудову "Адраджэньне". Першыя нумары рыхтавалі А.Суша і А.Радкевіч; у падрыхтоўцы паасобных нумароў удзельнічалі: П.Ларын, І.Дрозд, П.Пячонка, А.Сёмуха; ад №7 у складзе выдавецкае групы: А.Суша, С,Дубавец, П.Жук.

9-0. ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТА ЗА ПЕРАБУДОВУ "АДРАДЖЭНЬНЕ": ВЫДАНЬНЕ АРГАНІЗАЦЫЙНАГА КАМІТЭТУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТА ЗА ПЕРАБУДОВУ "АДРАДЖЭНЬНЕ". — без выходных зьвестак. — 8' — 2 с.

У нумары: Адозва АК БНФ "Адраджэньне" да грамадзянаў Беларусі; рэкамэндацыі па стварэньні груп падтрымкі БНФ.

10. СТУДЭНЦКАЯ ДУМКА // Падзагаловак зьмяняўся. — 1988 (год першы) — №1, лістапад-сьнежань. — 16' — 8 с., іл.

1988: 1; 1989: 1-10; 1990: 1-6; 2 спэцвыпускі.

"Студэнцкая думка" — друкаваны орган сьпярша суполкі "Сьвітанак", пазьней — Згуртаваньня Беларускіх студэнтаў і Задзіночаньня Беларускіх студэнтаў. Розныя нумары рахтавалі: А.Гуркоў, Г.Аніськова, Г.Барвёнава, С.Сотнікаў, А.Сабаленка, І.Міхно, І.Ліхтарня (мастак), З.Вайцяховіч.

Эмблематыка: знак суполкі "Сьвітанак" і "Пагоня". Лёзунг адсутнічае. Мова — беларуская, правапіс — дарэформенны. Рэдакцыя ня ўказвалася. Выдавалася нерэгулярна; аб'ём нясталы; наклад указаны не на ўсіх нумарах; дэкляраваны наклад вагаецца ад 999 асобнікаў у №6 за 1990 да 5.000 у №№2-3 таго ж года. Цана ня ўказвалася.

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Дзюрасэль Ж.-Б. Эўропа з 1815 года да нашых дзён: Палітычнае жыцьцё і міжнародныя адносіны. — Менск: Беларускі фонд Сораса, 1996. — 384 с. ISBN 5-87659-007-х

Зэкаў Анатоль. Аварыя сумленьня: Паэма. — Менск: Расолька М., Беларускі дабрачынны Фонд "Дзецям Чарнобыля", 1996. — 64 с.: іл. 2000 ас.

Колас Я. На ростанях. Трылёгія: Для старэйшага школьнага ўзросту. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 637 с.: іл. 600 ас. ISBN 985-02-0077-4

Марціновіч А. Дзе ж ты, храм праўды? Літаратурна-крытычныя артыкулы, эсэ. Для сяр. і стар. шк. узросту. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 398 с. 37000 ас. ISBN 985-02-0264-5

Нарыс аб Амэрыканскай эканоміцы. // Інфармацыйнае агенцтва Злучаных Штатаў. 212 с.

Науменко Б. Малый бизнес: теория и практика развития. — Менск: ООО "Мисанта", 1996. — 76 с. 3000 ас. ISBN 985-6080-04

Политология: курс лекций / В.Бобков, Н.Браим, А.Егоров и др., Под ред. В.Бобкова и Н.Браима. — Менск: НКФ "Экоперспектива", 1996. — 319 с. 3000 ас. ISBN 985-6102-05-7

Правила дорожного движения — 96 / Под ред. Грицука С. — Менск: "Асобны Дах", 1996. — 80 с. 30000 ас. ISBN 985-6356-01-06

Сушкевич А. План счетов бухгалтерского учёта. — Менск: ООО "Экаунт", 1996. — 112 с. — (Бухгалтерский учет на предприятиях и в организациях). 3000 ас. ISBN 985-416-013-0

Платонов В. Организация розничной торговли: Учебное пособие. — Менск: БГЭУ, 1996. — 127 с. 3000 ас. ISBN 985-426-038-0

Кніга — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць кнігі:



1. **Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы.** – Менск: Сучасная літаратура, 1995. – 310 с. 39.000 БРБ
2. **Адам Глёбус. Скрыжаваньне.** – Менск: БАДППР – "Ковчег", 1993. – 46 с. 7.000 БРБ
3. **Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны.** – Вільня, 1994. – 192 с. 24.000 БРБ
4. **Баляслаў Лесьмян. Пан Блішчынскі** / Пераклад з польскай. – Вільня-Менск: "Наша Ніва" – "Мастацкая Літаратура", 1994. – 93 с. 10.000 БРБ
5. **Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША.** – Менск, 1993. – 352 с. 25.000 БРБ
6. **Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 336 с. 24.000 БРБ
7. **Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1996. – 486 с. 35.000 БРБ
8. **Лоўзі Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 328 с. 24.000 БРБ
9. **Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1995. – 272 с. 20.000 БРБ
10. **Джын Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку.** – Менск: БФС – "Кліч", 1995. – 312 с. 20.000 БРБ
11. **Браян М, Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.** – Менск: БФС, 1996. – 272 с. 24.000 БРБ
12. **Беларускі рок-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс").** – Менск: "Ковчег", 1994. – 64 с. 7.000 БРБ
13. **Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст.** Камплект каляровых паштовак (12 асобнікаў). – Менск: НВФ "Vaukalaka", 1996. 25.000 БРБ
14. **Беларускі гістарычны агляд.** 1996, т. 3, сшытак 1. 35.000 БРБ
15. **Ш.Дэбаш, Ж.-М.Пант'е. Уводзіны ў палітыку.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1996. – 624 с. 40 000 БРБ
16. **М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794).** – Менск, 1994. – 168 с., каляровыя іл. 20 000 БРБ
17. **Z.Fedecki. Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі, czyli co śpiewano w Feliksowie.** – Warszawa, 1992. – 160 с. 20 000 БРБ
18. **Юрг Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.** — Менск: БФС — "Лекцыя", 1996. — 343 с. 45.000 БРБ.
19. **Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч. 1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў.** — Менск: БФС — "Тэхналёгія", 1996. — 560 с. 50.000 БРБ.
20. **Ўэстан Ла Бар. Асабістасьць з псыханалітычнага пункту гледжаньня.** —.Менск: "Тэхналёгія", 1995. — 47 с. 15.000 БРБ.
21. **Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1, 1996.** 35 000 БРБ.
22. **Жана Эрш. Філязофскае здумленьне: Гісторыя заходняе філязофіі.** — Менск: Эўрафорум-БФК, 1996.- 400 с. 35 000 БРБ.

Зьвяртайцеся на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

ПАТЭНЦЫЯЛЬНЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ



БЕЛАРУСЫ. Атлас. Камітэт дзяржаўных знакаў пры Міністэрстве фінансаў Рэспублікі Беларусь. — Менск, 1996. 33 с., 7000 ас.

Сталася, што атлас "Беларусы" — гэта першае ў незалежнай Беларусі геаграфічнае выданьне, у якім адлюстраваная дынаміка разьвіцьця беларускага этнасу і дзяржаўнасьці за ўсё XX ст. Атлас быў падрыхтаваны лябараторыяй этнічнай і канфэсійнай геаграфіі БДПУ пад кіраўніцвам Спартака Польскага, цяпер нябожчыка, і стаў своеасаблівым вынікам шматгадовых досьледаў гэтае лябараторыі, утворанай ў 1991 г.

Гэты невялікі атлас — толькі малая частка Вялікага атласу "Народы Беларусі", які ўжо падрыхтаваны тым жа аўтарскім калектывам, аднак з прычыны фінансавых цяжкасьцяў ня можа быць надрукаваны. Дарэчы, і гэты атлас быў апублікаваны, дзякуючы падтрымцы Беларускага Фонда Сораса і Фонда фундамэнтальных дасьледаваньняў Рэспублікі Беларусі. У сваёй прадмове кіраўнікі рэдкалегіі далі тлумачэньні, чаму гэты атлас выйшаў настолькі скарочаным. Такім чынам, няпоўнасьць інфармацыі ня ёсьць падставаю для крытыкі.

Выклікае сумнеў канцэпцыя, паводле якой народ Беларусі разглядаецца як мэханічная сума розных этнасаў. Прадстаўнікі асобных этнічных групаў, апроч саміх беларусаў, літоўцаў і латышоў, не зьяўляюцца карэннымі ў Беларусі, яны, як зрэшты і літоўцы з латышамі, ня маюць сваіх этнічна чыстых тэрыторыяў у нашай краіне, жывучы дыспэрсна, зьяўляюцца ў пераважнай большасьці носьбітамі беларускае мэнтальнасьці. Дамінуючы, беларускі этнас кансалідуе ўсе групы нацыянальных меншасьцяў, і ў рознай ступені пранікае ў іх, дзякуючы чаму ў нацыянальных меншасьцяў няма інтарэсаў, якія б канфрантавалі з інтарэсамі карэннай нацыі. Усе, хто жыве ў Беларусі — адзіны народ, а не супольнасьць, якая зьвязаная нейкімі дагаворнымі адносінамі. У атласе няма зьвестак пра валоданьне беларускай моваю прадстаўнікоў нацменшасьцяў і пра тое, колькі зь іх лічаць нашу мову роднай, хоць у прынцыпе такія зьвесткі ёсьць.

Атлас сапраўды раскрывае драматычны лёс нашае нацыі за апошняе стагодзьдзе, але ніяк ня сьведчыць пра тое, што за апошнія 75 гадоў вырасла "велізарная кагорта нацыянальнай інтэлігенцыі", як пішуць аўтары ў прадмове. "Велізарная" ў параўнаньні з кім ці з чым? З узроўнем 1913 году? А дзе ж у Эўропе інтэлігенцыя ня вырасла? У параўнаньні зь іншымі этнічнымі групамі ў Беларусі беларусы выглядаюць вельмі сьціпла (паводле інтэлігенцыі): працэнт беларусаў з вышэйшай адукацыяй ніжэйшы за сярэдні паказчык у краіне, ніжэйшы за расейцаў, украінцаў (у два разы), габраяў (у чатыры)...


Непаразуменьне выклікаюць некаторыя дыяграмы, якія то шчодра, то сьціпла разьмешчаныя на старонках. Да прыкладу, дыяграма "Міжнацыянальныя шлюбы (1989 г.)" не тлумачыць, у якім маштабе зробленая выбарка, у межах СССР ці Беларусі. Істотная дэталь, бо ў чытача складаецца ўражаньне, што беларусы самая этнічна зьмяшаная нацыя. Але між тым, калі ўзяць толькі Беларусь, то высьветліцца, што сем'і беларусаў на 78 працэнтаў монаэтнічныя. Гэта значыць, што гэты працэнт нічым не вызначаецца сярод іншых эўрапейскіх нацыяў (прыблізна такі ж як і ў латышоў). Гэткі ж сумнеў узьнікае і ў дачыненьні да іншых дыяграмаў.

Але многія дыяграмы і мапы могуць стаць адкрыцьцём для чытача. Напрыклад, мапа зьмены мяжы паміж Беларусяй і Польшчаю ў 1950, і паміж Расеяй і Беларусяй ў 1964 годзе. У 1964 годзе частка Мазырскага сельсавету Мсьціслаўскага раёну была перададзеная на просьбу жыхароў з Расеі ў Беларусь. Дыяграмы "Валоданьне беларускай моваю беларусамі" фіксуюць няўхільнае зьмяншэньне долі насельніцтва, якое валодае нашай мовай. Да прыкладу, у Віцебскай вобласьці ў 1989 годзе ўжо 35 працэнтаў гарадзкіх жыхароў не валодалі беларускай мовай, а ў Менску — 38 працэнтаў! Але асабліва драматычна выглядаюць табліцы "Натуральны рух насельніцтва", якія адзначаюць паўсюдны спад колькасьці жыхароў у нашай краіне ўжо ў 1989-м, праз тры гады пасьля Чарнобыля. Але самае парадаксальнае, што найбольш скарацілася насельніцтва ў "чыстых" Гарадзенскай і Віцебскай абласьцях, у два разы больш, чым на Гомельшчыне.

Найменш цікавымі, на дзіва, апынуліся мапы канфэсійнае геаграфіі. Па-першае, яны малачытэльныя з-за сваёй дробнасьці і з прычыны кепскай паліграфіі. А па-другое, выяўляюць недастатковую кампэтэнтнасьць складальнікаў. Што такое, да прыкладу, "пратэстанцкая царква"? Пратэстанцтва — гэта канфэсійная плынь розных цэркваў, якія адкалоліся з розных прычынаў і ў розныя часы ад каталіцкае царквы. Існуюць старыя, ужо традыцыйныя, цэрквы: лютаранская, рэфармацкая, старакаталіцкая, англіканская ды інш., — і так званыя нэапратэстанцкія цэрквы і сэкты, якія паўсталі ў мінулым альбо на пачатку нашага стагодзьдзя: баптысты, адвэнтысты, пяцідзясятнікі й гэтак далей. Дык якую зь іх рэпрэзэнтуе мапа "Пратэстанцкая царква"? І чаму ў мапу "Іншыя канфэсіі" патрапілі пратэстанцкія абшчыны Царквы Маці Божае, Мармонаў і Сьведкаў Яговы (апошнія, дарэчы, існуюць у Беларусі ўжо больш за сем дзясяткаў гадоў). Наогул, дадзеныя 1970-х гадоў, якія тычацца пратэстанцкіх абшчынаў, відавочна заменшаныя, бо, як вядома, добрая палова зь іх ня здолела атрымаць ад уладаў рэгістрацыі, а то й проста існавала падпольна.

Атлас, на жаль, пакіне больш пытаньняў, чым адказаў... Зрэшты, ён пакідае і вялікія магчымасьці для будучых несавецкіх географаў. Шкада, што немалы патэнцыял папярэдніх пакаленьняў дасьледчыкаў, пакладзены ў пракруставы ложак ідэалягічных забабонаў і нявыверанай канцэпцыі папулярызацыі, на сёньня малапрыдатны для карыстаньня, а неўзабаве стане і неактуальным — са сваімі апэляцыямі да перапісаў 1989 году.

Сяргей Харэўскі



Выйшаў №4 "Уніі — часопіса хрысьціянскага сумоўя". Часопіс быў заснаваны ў 1990 г. і да 1991 г. уключна выйшла тры нумары. Цяпер выданьне адноўленае. Нумар рыхтаваўся ў канцы 1995 г., але не ставала сродкаў на друк. Таму сьвежы нумар мае такую нумарацыю — №4 за 1995 г.

Аўтэнтычная грэка-каталіцкая эстэтыка робіць часопіс "Унія" непаўторным на беларускім выдавецкім ляндшафце.

Сувязь з рэдакцыяй: 220137 Менск, вул. Байкальская 1-217.

Біблія па-беларуску

Выдавецтва "Унія" ад 1996 году пачынае выданьне кніг Старога і Новага Запавету ў перакладзе на беларускую мову айца Ўладзіслава Чарняўскага. Доўгія гады рукапіс не публікаваўся з розных прычынаў, але цяпер, пасьля году падрыхтоўчай працы пабачыць сьвет першая кніга Бібліі — Кніга Роду (Быцьця).


Нашае выдавецтва будзе публікаваць найперш кнігі Старога Запавету, бо ён, у адрозьненьне ад Новага Запавету, ніколі не публікаваўся на сучаснай беларускай мове. На жаль, адразу выдаць увесь Стары Запавет не ўяўляецца магчымым з-за вялікага аб'ёму падрыхтоўчай працы. Таму кожная кніга Бібліі будзе выдавацца асобным сшыткам. Гэта дазволіць ужо цяпер выкарыстоўваць пераклад у богаслужбовай практыцы, а зацікаўленым і кампэтэнтным спэцыялістам пачаць працаваць над ім і, мы верым, праз некалькі гадоў Беларусь атрымае поўную Біблію на жывой беларускай мове.

Кніга Роду (Быцьця) ужо падрыхтаваная да друку і выйдзе ў канцы 1996 г. Цяпер мы працуем над іншымі кнігамі Старога Запавету.

Нашыя выданьні Вы можаце атрымаць праз пошту. Замоўце, калі ласка, наш каталёг, для чаго дашліце Ваш адрас нашаму Выдавецтву. Каталёг дасылаем задарма.

"Унія"
220137 Менск, вул. Байкальская 1-217

Выдавецтва будзе ўдзячнае за прапанаваную дапамогу. Тэл. 252-67-31



НАВІНКА!

"Калосьсе" №4

Нядаўна ў Варшаве выйшаў чацьверты нумар літаратурна-мастацкага альманаха "Калосьсе". Фінская папера, добрая паліграфія. Выданьне ілюстраванае афортамі вядомага гарадзенскага мастака Юрыя Якавенкі.

У "Калосьсі": паэма Алеся Аркуша "Грыфон", вершы Юрыя Гуменюка, Зьміцера Вішнёва, Васіля Дзівашэвіча, Юрася Пацюпы; п'еса Вінцэся Мудрова "Жарсьці па Галятэі", апавяданьне клясыка пальскага літаратурнага авангарду Вітальда Гамбровіча "Дзявоцтва" ў перакладзе Сяргея Астраўцова, аповесьць Ігара Сідарука "Як цётка Прузына нацыю шукала", гутарка зь літаратуразнаўцай Ірынай Багдановіч ды рэцэнзіі на беларускія кнігі.



На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт — 25.000 БРБ):

1. **НОВАЕ НЕБА.** Сон у трамваі.
2. **НОВАЕ НЕБА.** Go home (1995).
3. **НОВАЕ НЕБА.** Дзеці чорнага гораду (1991).
4. **КРАМА.** Камэндант (1995).
5. **КРАМА.** Хворы на Rock-n-Roll.
6. **КРАМА.** Гэй там налівай! (1994).
7. **N.R.M.** LaLaLaLa (1995).
8. **ULIS.** Life (1996).
9. **УЛІС.** Чужаніца (1991).
10. **УЛІС.** Краіна доўгай белай хмары (1990).
11. **БОНДА.** Найлепшыя песьні.
12. **МЯСЦОВЫ ЧАС.** Наша ўскраіна (1991).
13. **ПАЛАЦ.** Палац (1996).
14. **Песьні беларускіх бардаў** (1992).
15. **РЭНЭСАНС** (беларускі джаз).
16. **БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ**
17. **БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА** (1-3)
18. **БЕЛАРУСКАЯ ГІТАРНАЯ МУЗЫКА.**
19. **ЗАЛАТЫ ФОНД БЕЛАРУСКАГА РОК-Н-РОЛУ** (1-3).

Т.1: Бонда. Уліс. .Мроя. Рэй. Мясцовы Час. Блізьняты.
Т.2: Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы Час. Тутэйшыя хлопцы.
Т.3: Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & "Доктор Моро". Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо.
Т.4: Палац. Уліс. Крама. Новае Неба. Мроя.
Т.5: Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Red Dynamite. Флэт.

20. **МРОЯ.** Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. **УЛІС.** Блуканьне (1996).
22. **ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ.** Смутны беларускі блюз (1996).
23. **КАМЭЛОТ.** У краіне талераў (1995).
24. **ZINDAN** (1994).
25. **КРАМА.** The Best (1996).

Зьвяртайцеся на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу.
У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

РАРЫТЭТ

Паведамленьне для аматараў "Нашай Нівы"

У рэдакцыі "Нашай Нівы" Вы можаце замовіць рарытэтныя нумары з моманту аднаўленьня газэты ў Вільні:
№1-4 за 1991 г., №6-8 за 1992 г., №10, 12-18 за 1993 г., №1, 2, 6, 8-9, 12 за 1994 г., №5-8 за 1995 г.

Ахвотныя могуць замовіць ксэракопію любога іншага нумару.

Кантакт: Андрэй Андрыеўскі — тэл. 239-78-49 у Менску; адрас: Менск 220094, а/с 89.

● ЛІТОЎСКІ СТАТУТ

У Менск завезеныя кнігі віленскага акадэмічнага выданьня Першага Літоўскага Статуту 1529 г. У адным з тамоў зьмешчанае факсыміле трох сьпісаў Статуту — па-старабеларуску, па-лацінску, па-старапольску, у іншым томе — паралельныя тэксты гэтых сьпісаў, якія перададзеныя сучаснаю графікай.

Кантакт: Андрэй Андрыеўскі — тэл. 239-78-49 у Менску; адрас: Менск 220094, а/с 89.

● МЭТРЫКА


Паведамленьне для замоўцаў Літоўскае Мэтрыкі.
У Менску маюцца шосты й восьмы тамы Мэтрыкі.
Кантакт: Андрэй Андрыеўскі — тэл. 239-78-49 у Менску; адрас: Менск 220094, а/с 89.

ШТО ПАДКАЖУЦЬ РОДЗІМКІ?

ТЭСТ

Мы прапануем сужэнцам паўважлівей паглядзець адзін на аднога. У многіх ёсьць родзімкі на твары. Пры дапамозе дадзенага тэсту вызначце іхнее значэньне. Магчыма, Вы атрымаеце дадатковую інфармацыю. Месцы размешчаньня родзімак пазначаныя лічбамі (гл.мал.). Калі Вы ня згодныя з гэтымі азначэньнямі, не сумуйце, у Вас быў цудоўны шанец паўважлівей прыгледзецца да каханага чалавека, а значыць, стаць лепей, талерантней.

1. Вашае духоўнае жыцьцё вызначаецца глыбінёй.
2. Вы тэмпэрамэнтны і, лёгка паддаецеся гневу.
3. Вы часта пакутуеце на мігрэні.
4. Вы зь цяжкасьцю знаходзіце агульную мову зь іншымі.
5. Вас чакае шлюб са знакамітасьцю.
6. У Вас добрая памяць і нюх на людзей.
7. Вы схільныя да любоўных авантураў.
8. Вы раўнівы.
9. Необдуманыя ўчынкі ствараюць Вам ворагаў.
10. Вы сустрэнеце (сустрэлі) вялікае каханьне.
11. Вам уласьцівая вернасьць.
12. У Вас развітае пачуцьцё дома, сям'і і ўзаемаразуменьняў з суседзямі.
13. У Вас вялікія творчыя здольнасьці.
14. Вашае сужэнскае жыцьцё будзе пасьпяховым.
15. Эратычным бокам Вашага жыцьця Вы будзеце задаволеныя.
16. Вашае шчасьце — у сям'і і дзецях.
17. Рызыкуеце трапіць у кепскую кампанію.
18. Усё жыцьцё ў Вас будуць любоўныя праблемы.
19. Вы ўмееце эканоміць.
20. Вашае сямейнае жыцьцё стабільнае.
21. Вы баіцеся вады.
22. У Вас схільнасьці да "чорнага" гумару, які не заўсёды прыдаецца на месца.
23. Вы чуйны.
24. Вам шанцуе ў гульні і ў жыцьці.
25. У Вас моцны характар.
26. У Вас заўсёды добры настрой.
27. Падобна на тое, што Вы лянівы.
28. У Вас кволае здароўе.
29. Вы ўмееце любіць і розумам, і сэрцам.
30. Вы занадта ўспрымальны да пахвалаў.
31. Вы ўпарты.
32. Ваша пачуцьцёвасьць ня мае межаў.
33. Знак глыбокага сужэнскага каханьня.
34. Сьведчаньне эратычнасьці.
35. Вы заўсёды імкнецеся дамагчыся свайго і ўспыхлівыя.
36. Вы любіце парадак.
37. Вы любіце ідэальную чысьціню.
38. Вы вельмі чульлівы.
39. Вам будзе шанцаваць літаральна ва ўсім.
40. Фізычнае каханьне ў Вас пераважае над духоўным.
41. Вы неруш.
42. У Вас схільнасьць да гвалту.
43. Вы незалежны.
44. Вы падпадаеце пад уплыў лёгкіх людзей.
45. Знак Шывы: Вы валодаеце інтуіцыяй і дарам прадбачаньня.
46. Ня кожны Вас разумее.
47. Вы паэт. Матэрыяльны дастатак Вас мала цікавіць.
48. У Вас схільнасьці да навукі.
49. Магчымыя цяжкія роды.
50. Вы ўвесь час з кім-небудзь сварыцеся.
51. Вы рамантык.



У ПАПЯРЭДНІХ НУМАРАХ (№1 – 23):

Кошты на менскіх рынках: Камароўка (ІНФ. №1, 7, 10, 21); Рэчавы рынак "Дынама" (ІНФ. №2, 8); Аўтарынак (ІНФ. №3, 12); Кошты на кампакт-дыскі (ІНФ. №4); Кошты на кватэры ў Менску. Кошты на офісы (ІНФ. №5, 17); Кошты на будаўнічыя матэрыялы (ІНФ. №6); Кошты на кампутары. Менск (ІНФ. №9); Кошты на філязофска-гуманітарную літаратуру (ІНФ. №18); Кошты на кватэры ў Менску (ІНФ.№24); Кошты на турыстычныя падарожжы ў Менску (ІНФ.№26). Кошты на запасныя часткі для аўто (ІНФ.№27); Кошты на авія і чыгуначныя квіткі (ІНФ.№28).

Транспарт: Расклад руху пасажырскіх цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №1,15); Расклад руху прыгарадных цягнікоў ад станцыі Менск-Пасажырскі (ІНФ. №2, 12); Расклад руху аўтобусаў ад а/с Менск-Цэнтральны і Менск-Усходні (ІНФ. №3, 16, 17); Расклад рэйсаў пасажырскіх самалётаў і ўсё пра аўтазапраўныя станцыі (ІНФ. №5).

Адукацыя: Замежнае навучаньне ў 1996 годзе (ІНФ. №1); Платнае навучаньне ў Менску. Камэрцыйныя ВНУ (ІНФ. №2); Дзяржаўныя ВНУ. Платнае навучаньне (ІНФ. №3-4); ВНУ. Акадэміі (ІНФ. №8-10).

Біржа працы: Аналіз стану рынку працы паводле зьвестак Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва (ІНФ. №1- 9); Новыя вакансіі і працоўныя месцы на Беларусі (ІНФ. №1-28).

Адпачынак: Вучымся гуляць у прэфэранс (ІНФ. № 1-15); Вучымся гуляць у більярд (ІНФ. № 16-24); Тэсты, шахматныя і інтэлектуальныя задачы (ІНФ. №1- 29).

Спажывец: Тэлефонныя коды гарадоў Беларусі, краінаў блізкага і далёкага замежжа (ІНФ. №2); Твае правы, пасажыр (ІНФ. №2); Як купляць і прадаваць кватэру. Што азначае стандартнае маркаваньне (ІНФ. №3); Месяцовы пасяўны каляндар (ІНФ. №4); Як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктаў (ІНФ. №5); Пра новыя даляры. Праўда пра цыгарэты. Штрыхавы код — як яго расшыфроўваць (ІНФ. №6); Як выбіраць абутак (ІНФ. №7); Міжнародная сыстэма гатэляў (ІНФ. №10); Каб вырасла рэпа вялікая...(ІНФ. №11); Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне (ІНФ. №18 Заканчэньне); Вучымся эканомна кіраваць аўтамабілем (ІНФ. № 12, 15, 17); Зрабі сам (ІНФ. № 16); Соньнік (ІНФ. № 15, 17, 18 Заканчэньне); Спажывецкі тэст — прасы (ІНФ. № 20); Спажывецкі тэст — тэлевізары (ІНФ. № 21); Кошты на аўто ў Польшчы (ІНФ. № 21, 22); Гумкі (ІНФ. № 23); "Time Share": Як пазьбегнуць непрыемнасьцяў (ІНФ. № 23). Інвэстыцыйныя фонды: некалькі парадаў дробнаму ўкладальніку (ІНФ. № 23); Пырскі шампанскага (ІНФ. № 23); Рыбныя прадукты (ІНФ. №24); Гарэлка: Чаго баяцца? (ІНФ. №24); Каб кватэра была цёплай (ІНФ.№26); Фарбуем вопратку і тканіну (ІНФ.№26); Калі я памяняю батарэйкі (ІНФ.№27). Спажывецкі тэст — кухонныя камбайны (ІНФ.№28).

Інструктар: Друкарня ў кожнай кватэры; За родную школу; Зьбіраемся ў падарожжа (ІНФ. № 19); Аперацыя "ВАГІ" (ІНФ. №24).

Здароўе: Перш чым зьвяртацца да лекара. Як кінуць паліць (ІНФ. №4); Прыродныя атруты (ІНФ. №10); Атлетычныя клюбы, шэйпінг, аэробіка, тэнісныя корты (ІНФ. №18); Комплексная ацэнка забруджаньня асяродзьдзя Менску і вобласьці (ІНФ. № 19); Тэст: асьпірын (ІНФ. № 22); Небясьпечныя лекі (ІНФ. № 22); Пра шкоду пасіўнага паленьня (ІНФ. № 22); Без дыэты не абысьціся (ІНФ. № 23); Перш чым купіць цацку, панюхайце! (ІНФ. № 23).

Гаспадарка: Газ у нашым доме. Як чытаць цэтлікі на вопратцы. (ІНФ. №5); ЖЭС. Рамонт жытла. Пункты прыёму замоваў на будаўніча-рамонтныя працы (ІНФ. №6); Як мыць і чысьціць посуд. Калі заліло кватэру... (ІНФ. №8); Як пабудаваць садовы домік. Дом і дзялянка (ІНФ. №9).

Прэс-рэліз. Сьвет за тыдзень (ІНФ.№28).

Грамафон: Старонка вершаванага радка (ІНФ. №6, 8, 11, 17, 19, 20, 24, 25, 26).

Харчаваньне: Якую гарбату мы п'ем. Пра часнык (ІНФ. №7); Бары, рэстарацыі, кавярні Менску (ІНФ. №15).

Спорт: Вынікі спаборніцтваў і інш. (ІНФ. №7, 9, 19).

Бібліятэка: Новыя паступленьні ў кнігарні. Рэцэнзіі (ІНФ. №9, 10, 11, 15, 16, 18-27).

За мяжою: Хто такія ньюёрцы; Ліставаньне з навучальнымі ўстановамі ЗША (ІНФ. №17).

Беларусь і сьвет. Індзейцы у Беларусі (ІНФ. № 21).

Адвакат: Ахова правоў чалавека. Міжнародная Амністыя (ІНФ. №17).


Псыхалёгія: Сцэнар чалавечага жыцьця пішацца яшчэ ў дзяцінстве (ІНФ. №24); Калі Ён купаецца, усе павінны залезьці ў ваду і плёскацца (ІНФ. №24).

Чалавек. Пра цяжкае жыцьцё і лёгкую сьмерць; Дзёньнік без канца. Г.Матусевіч. Тэст: самая простая памяць (ІНФ. №27)


ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫХ НУМАРАХ:

Рынак: Новыя кошты на розныя тавары.

Грамафон: Новыя вершы нашых чытачоў.



КАДАР



Фота А. Клешчука

Бясплатныя прыватныя абвесткі

КУПОН Бясплатнай прыватнай абвесткі

Імя і прозьвішча

Адрэса, тэлефон

Тэкст:

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.

220123, Менск, а/с. 71 НАША НІВА

РАЗМОВА З ЧЫТАЧАМІ

Праця. Пачатак на стар. 3

Л.Баршчэўскі: «Спачатку было рашэньне...» (8)
Н.Стужынская. Атаман Дзяргач (7)
А.Дзярновіч. Вандроўная ідэя (6-2)
Як гартавалася сталь (5-5)
С.Харэўскі. Радзіма Дзюрэра (5-3)

Цікава назіраць за гэтымі характарыстыкамі «найлепшых матэрыялаў»: ёсьць тэксты, якія прымаюцца адназначна, а ёсьць такія, што абуджаюць спрэчку. Ёсьць, праўда, і такія, што адназначна не прымаюцца — як, напрыклад, артыкул Стывэна Чэпмэна з амэрыканскага часопіса Spectator «Панаваньне брунэтак», які ажно 34 карэспандэнты назвалі найгоршым матэрыялам нумару.

Што Вас цікавіць?

Чытачоў «НН» цікавіць абсалютна ўсё, але і тут вымалёўваецца свая ерархія. Для тых, хто робіць газэту, гэта своеасаблівае кіраўніцтва да дзеяньня. Трэба за статыстыкай убачыць тэндэнцыю да выхаду на шырэйшага чытача.

І тут мы сустракаемся з галоўным фэномэнам нашае анкеты. Ёсьць адна АБСАЛЮТНАЯ ТЭМА, якая цікавіць нашых чытачоў, незалежна ад узросту, прафэсіі ці месца жыхарства. Гэта ГІСТОРЫЯ. Яе хочуць бачыць у «НН» 99 карэспандэнтаў. Гістарычныя артыкулы і эсэ, параўнаньні з сучаснасьцю, гісторыя ВКЛ і Беларусі, раней невядомая гісторыя, архіў...

На другім месцы — ЛІТАРАТУРА (85): вершы, дзёньнікі, проза, эсэ, літаратурнае і мастацкае жыцьцё.

Трэцяя цікавасьць — ПАЛІТЫКА (76): палітычны камэнтар, грамадзкія тэндэнцыі, тайны з жыцьця сучасных палітыкаў, расповед пра партыі...

КУЛЬТУРА (39) — культуралёгія і культурнае жыцьцё —апынулася на чацьвертым месцы. Далей — ІНФАРМАЦЫЯ (24), МІЖНАРОДНЫ аналіз (32), БЕЛАРУШЧЫНА (30)... Словам, усё тое, чым мы і імкнемся напаўняць старонкі «НН». Самыя адмыслова сфармуляваныя тэмы: «нацыяналістыка», «нерасейскі погляд на падзеі», «беларусы падараваных земляў»...

Многае з гэтага нашыя карэспандэнты назавуць яшчэ раз у сваіх пажаданьнях газэце. А пакуль мы атрымліваем чарговы партрэт нашага чытача, ягоных жаданьняў. Абсалютная цікавасьць да гісторыі сьведчыць пра тое, што пэўны «бум» гістарычнай літаратуры мінулых гадоў зусім не наталіў прагу сучасьніка ведаць мінуўшчыну. Прыйшло новае пакаленьне, фармуецца ягоная гістарычная сьведамасьць, зноў у грамадзтве стаіць дылема афіцыёзнай хлусьні і незалежнай праўды пра гісторыю, зноў наглуха зачыненыя архівы КГБ у Менску, зноў перапісваюцца падручнікі... Вось чаму пры наяўнасьці некалькіх неблагіх гістарычных часопісаў чытач патрабуе і ад «НН» — гісторыі, гісторыі ў фармаце папулярнага тыднёвіка.

Дарэчы, што яшчэ чытаюць чытачы «НН»? У якое інфармацыйнае поле мы ўваходзім?

Інфармацыйнае поле

Адказ на гэтае пытаньне вынікае з тэматыкі, якой цікавяцца нашыя карэспандэнты. Гэта гістарычныя, культуралягічныя або літаратурныя часопісы «Спадчына» (56), «Крыніца» (38), «Беларуская мінуўшчына (32), «Беларускі гістарычны часопіс» (15), «Полымя» (12), «Мастацтва» (6), «Маладосьць» (6), «Беларускі гістарычны агляд» (5), «Першацвет» (5) і «Роднае слова» (4).

У сьпісе газэт пераважаюць палітычныя выданьні, на першым месцы сярод якіх — «Свабода» (201). Можна меркаваць, што аўдыторыя «НН» амаль цалкам «накладаецца» на аўдыторыю «Свабоды». Нехта з карэспандэнтаў нават назваў лепшым аўтарам «Нашай Нівы» Ігара Герменчука, галоўнага рэдактара «Свабоды», які ў «НН» ніколі не друкаваўся. Наступны наш «газэтны рэйтынг» выглядае так:

Народная воля (85)
Пагоня (55)
ЛіМ (43)
Имя (43)
Наша слова (36)
БДГ (27)
Известия (25)
Звязда (24)
Беларуская маладзёжная (19)
Свободные новости+ (14)
Пресс-болл (14)
Культура (11, у т.л. ЗНО — 4)
Фемида (9)
Белорусская газета (7)
АиФ (6)
Круг (6)
Белорусский рынок (5)
Здравый смысл (5)
Комсомольская правда (5)
Народная газета (4)
Głos z-nad Niemna (3)

Радзей называюцца наступныя газэты і часопісы: Родина, Бизнес-Балтия, Minsk Economic News (2), Playboy, Свабодныя прафсаюзы (2), Общая газета (2), На страже (2), Частная собственность, Иностранная л-ра, Царкоўнае слова, Гастроном, Вясёлка (3), Ніва, Калосьсе, Нёман, 7 дней, Из рук в руки, Чырвоная змена (2), Вожык, Вечерний Минск (2), Cosmopolitan, Футбол (2), Навіны АН Беларусі, Дело, Архітэктура і будаўніцтва, Polityka, Рэгіянальная газэта, Беларусь, Бярозка (2), Раніца (2)...

Узаемадачыненьні з «НН»

Большасьць карэсрандэнтаў называюць гэтыя ўзаемадачыненьні сыстэматычнымі (194). Упершыню яны пабачылі «НН» у кіёску (84) і ў распаўсюднікаў (24) альбо даведаліся пра існаваньне тыднёвіка ад знаёмых, калегаў, сваякоў (57) ці з газэтных матэрыялаў пра «НН» (54).


Палова карэспандэнтаў (116) кожны нумар атрымлівае праз індывідуальную падпіску, а палова (102+18) набывае ў кіёску або ў прыватных распаўсюднікаў. У бібліятэцы чытае адзін! Дарэчы, на самоце свой нумар чытаюць толькі 52 анкетаваныя. У 71 выпадку адну газэту чытаюць два чалавекі, у 52-х выпадках — тры, у 47-мі — чатыры і болей.

Частка карэспандэнтаў (98) прачытвае нумар за 1-3 гадзіны, а частка (60) — за 1-3 дні. За 30 хвілінаў прачытваюць 16, а 22 чытаюць тыдзень. 117 карэспандэнтаў лічаць, што аптымальны кошт нумару — 3 тыс. рублёў, 81 называе суму 5 тысяч і толькі 15 гатовыя плаціць 7 тысяч рублёў.

Апошняе пытаньне зусім не факультатыўнае — яно наўпрост зьвязанае зь якасьцю тэкстаў і друку, а нават і з той тэматыкай, якую шукаюць у тыднёвіку чытачы. Не сакрэт, што сёньня «НН» — стратнае прадпрыемства. Пазыкі і гранты, як правіла выпадковыя, пакуль дазваляюць нам трымацца «на вадзе». Зь іншага боку, мы разумеем, што далёка ня кожны наш чытач здольны аплочваць рэальны кошт такой газэты, якую ён хоча і, цалкам верагодна, заслугоўвае. Як ні круці, а наша бугальтэрыя — агульная з Вамі, таму мы і лічым патрэбным знаёміць Вас з фінансавымі справамі «НН».

На момант публікацыі анкеты рэальны сабекошт тыднёвіка складаў 5 тысяч рублёў, а сёньня ён ужо падбіраецца да сямі тысяч. Зусім слушная заўвага многіх карэспандэнтаў пра тое, што нумар праз падпіску мусіць каштаваць таньней за нумар праз розьніцу. Аднак гэта не выключае падаражаньня і першага і другога, што непазьбежна вынікае з інфляцыі.

З размовы пра грошы вельмі выгодна перайсьці да размовы пра недахопы. Хоць адна наша чытачка і напісала нам: «Ведайце, калі я перастану чытаць «НН», гэта адбудзецца зусім не таму, што газэта стала каштаваць болей»...



Недахопы

Увогуле, прывесьці да статыстычнага выгляду тыя дзясяткі «найвялікшых недахопаў» тыднёвіка, якія называюць нашыя карэспандэнты, немагчыма. Тое, што ў нас «малы наклад» (12) і «недахоп чытачоў» (2), «недастатковы аб'ём» (14) і «малы фармат» (2), «дрэнная тэхнічная якасьць» (7) і «адсутнасьць колеру», — наўпрост вынікае з таго, што «няма раскруткі» і «мала рэклямы газэты» (8), што, у сваю чаргу, выклікана тым, што «грошай не хапае» (2). Гэта, так бы мовіць, недахопы аб'ектыўныя.

Ёсьць і агульна-канцэптуальныя. Нам цяжка пагадзіцца зь «нявызначанасьцю мэтаў» і «імкненьнем дагадзіць усім». Што да «невыразнай канцэпцыі», то ёй, новай канцэпцыі, толькі год і ацэньваць яе, бадай, рана. «Імкненьне да масавасьці» цяжка прызнаць за недахоп тыднёвіка, тым больш што ў іншых анкетах нам закідаюцца «гермэтызм», «элітарнасьць» (4) і нават «нарцысізм».

Сапраўды паважныя заўвагі, якія сустракаюцца не аднойчы і якія варта прыняць да ведама — ужо згаданы «брак аптымізму», «страта непадобнасьці на ўсе саўковыя газэты», «невыразная структура тэмаў», «пэўная эклектычнасьць». Вельмі чалавечая парада: «ня злуйцеся».

Наступны блёк «найвялікшых недахопаў» — тэматычны. Тут, бадай, з усім можна пагадзіцца. Якой інфармацыі бракуе на старонках «НН»? Гістарычнай, палітычнай, навінаў, пра вядомых людзей, музычнай, пра замежжа і беларусаў за межамі РБ, бракуе гумару, спорту, эротыкі, дзіцячай старонкі, рэгіянальнай і рэлігійнай інфармацыі, крыжаслова... Словам, наш сукупны чытач прагне ўсяго.

Зусім слушныя заўвагі пра «складаны стыль, цяжкую мову» некаторых матэрыялаў і аўтараў. А вось заўвагі аб правапісе: «трэба друкаваць на сёньняшняй беларускай мове», бо, маўляў, людзі і такую яе ня ведаюць, — мы прыняць ня можам. На нашу думку, таму й ня ведаюць, што карыстаюцца сурагатам правапісу, створаным у свой час выключна дзеля палітычных мэтаў. Між іншым, побач з гэтай заўвагай сустракаюцца і пратэсты супраць «маскалізмаў» у мове «НН» і патрабаваньні друкаваць лацінкай. Цалкам трэба пагадзіцца хіба з тым, што мы мала пішам пра мову і тое, што зь ёю адбываецца сёньня.

Інфарматар «НН»

«Інфарматар» завялікі — лічаць сямёра карэспандэнтаў. А мы думаем не пра скарачэньне адной з частак «НН», а пра пашырэньне як асноўнага сшытка, так і «Інфарматара». Як паказваюць ягоныя ацэнкі, дадзеныя ў анкетах, «Інфарматар» не задавальняе хутчэй якасьцю падрыхтоўкі тэкстаў, а не тэматыкай, дарэчы, — далёка недастатковай.

Вось як выглядае рэйтынг ранейшых матэрыялаў «Інфарматара», якія запомніліся нашым карэспандэнтам: «Грамафон. Старонка вершаванага радка» (17), «Бібліятэка» (15), спажывецкія і псыхалягічныя тэсты (14), «Друкарня ў кожнай кватэры» (13), «Калі Вы прыйшлі на несанкцыяваны мітынг» (9), «Як набыць аўтамабіль у Нямеччыне» (9), «Спажывец» (9), «Адукацыя» (7), «Беларуска-індзейскае таварыства» (6)...

Крыху радзей называюцца яшчэ каля пяцідзесяці розных матэрыялаў, што чарговы раз сьведчыць пра разнастайныя зацікаўленьні чытачоў. Некаму запомніліся ўрокі прэфэрансу, некаму — падарожжа ў Жэнэву, хтосьці зацікавіўся тым, «як стаці геніем», а хтосьці — як лячыць раны, атрыманыя ў часе забароненай дэманстрацыі; нехта з захапленьнем чытае прыватныя абвесткі, а нехта адкрыў для сябе «Абавязкі правадніка»...

А вось кароткі рэйтынг матэрыялаў «Інфарматара» ў тым нумары, у якім друкавалася анкета:

«Сацыялёгія» (38), «Грамафон» (36), «Як купляць абутак» (28), «Каб кватэра была цёплай» (19), «Калі я памяняю батарэйкі» (13), «Пра цяжкое жыцьцё і лёгкую сьмерць» (17), псыхалягічны тэст (10).

Далейшы сьпіс мы пакідаем да ведама рэдакцыі. Гэтаксама як і адказы на пытаньне «Якія тэмы, рубрыкі, на Вашу думку, павінны быць у Інфарматары «НН»?» Будзем лічыць, што Ваш сукупны адказ — гэта наш набытак і, у пэўным сэнсе, камэрцыйная тайна.

А вось адказ на пытаньне пра тое, «Якіх тэмаў і рубрык у Інфарматары можа ня быць?» — мы апублікуем.

Першае месца ў адмоўным сьпісе займае «Кіно-Менск» (23), што ўскосна пацьвярджае думку: нас чытаюць ня толькі ў сталіцы. Далей ідзе тэлепраграма (20) — маўляў, яе й так друкуюць усе газэты, а мы толькі займаем карысную плошчу. На трэцім месцы — відэа (16). Нехта ўдакладніў — «ТАКОЕ відэа». Далей —спорт (11), «Адпачынак» і «Грамафон» (па 10), па 9 карэспандэнтаў — супраць раскладу радыёперадач і тэстаў, 8 —супраць «Біржы працы», па 6 — супраць шахматаў, раскладаў руху транспарту, рынку, гульняў і забавак...

Магчыма, зь нечым тут і варта пагадзіцца. Хоць нашая выснова застаецца ранейшай — справа не ў тэматыцы, а ў якасьці адбору і падрыхтоўкі тэкстаў, у павелічэньні аб'ёму ўсёй газэты і — у Вашым актыўным удзеле.

Тое, што ў анкетаваньні «НН» узяло ўдзел нямала чытачоў (амаль 5%), сьведчыць пра Вашу актыўнасьць. І вось напрыканцы гэтай «Размовы з чытачамі» мы згадваем, што ў многіх анкетах Вы прапануеце нам друкаваць болей чытацкіх лістоў, болей інфармацыі з рэгіёнаў. Сустрэчная прапанова — запоўніўшы нашу анкету, не адкладайце асадку, пішыце нам — пра сябе, пра сваё жыцьцё. Пішыце таксама і пра нас.

Водгукі

Год нашага жыцьця

Севярын Квяткоўскі

Пра Ганну Матусэвіч ужо пачалі складацца легенды. Асабіста мне выпала некалькі разоў прысутнічаць пры спрэчках, у якіх спрабавалі выкрыць гэты псэўданім. Называліся імёны вельмі розных беларускіх літаратараў. Часам, у прэтэндэнты на званьне Ганны Матусэвіч высоўваліся кандыдаты з абсалютна несумяшчальных колаў. Тыя, хто спрачаліся, былі едныя хіба ў адным: фатаздымак аўтаркі — ня больш, чым міт. Больш за тое, нават паўставала падозраньне, што пад псэўданімам працуе група людзей. Бадай, гэтая акалічнасьць — ці не найвышэйшая ступень прызнаньня высілкаў Ганны Матусэвіч. Дзёньнік... Суплёт відарысаў, думак, настрояў, уражаньняў, абразкоў — пацеркі на ніце сьвядомасьці. На мой погляд, ніводзін зь беларускіх літаратараў ня змог бы стварыць той «Дзёньнік...», які на працягу году амаль бесьперапынна публікавала «НН». Адныя — праз досьвед бяздарнасьці, іншыя —праз адваротнае. Унікальнасьць Ганны Матусэвіч — у спалучэньні непасрэднасьці й прыроднай здольнасьці праз слова фіксаваць сябе на тле рэальнасьці, і рэальнасьць — у сабе. Гэта памежжа, за якім можа пачацца літаратура. Тэкст Матусэвіч — калейдаскоп маленькіх аскепкаў безьлічы напісаных і ненапісаных твораў. Ейны «Дзёньнік...» — гадзіньнік, што нагадвае пра бег часу, і пра тое, што кшталты твайго Часу залежаць ад цябе самога. Тут можна прыгадаць Борхесаву думку пра тое, што ўсе мы літары аднога бясконцага тэксту. Зь іншага боку, мы пішам уласныя тэксты-жыцьці, кожны ў сваім жанры. Кожны вольны чытаць іх па-свойму. Галоўнае — ня быць графаманам. Год таму ў апошнім нумары «НН» за 1995 зьявіўся першы тэкст з сэрыі «Дзёньнік без канца», ён меў назву «Інтэрнацкая кроніка». У пазамінулым нумары «НН» у апошні раз быў надрукаваны тэкст з гэтага «сэрыялу». Гэта ня значыць, што насуперак сваёй назьве, «Дзёньнік без канца» спыніць сваё йснаваньне. Магчыма, можна высунуць думку, што ён пяройдзе ў іншую якасьць — калі вялікі самастойны тэкст «без канца» афармляецца ў асобныя тэматычныя творы. Іх будуць чакаць: анкеты, дасланыя ў рэдакцыю, сьведчаць пра тое, што за год Матусэвіч прыдбала свайго чытача.





Здарыўся адзін жуласны выпадак, калі кожны мог здагадацца, што ўся гісторыя пабудаваная на цытатах зь літаратурных крыніцаў, што яна прыдуманая, але ўсё адно шмат хто ўспрыняў распаведзеную гісторыю, нібы гэта была Гісторыя зь вялікай літары.

Стварэньне сюжэту, пра які вядзецца гаворка, пачалося вельмі даўна, яшчэ на пачатку XIV ст., калі Філіп Прыгожы разагнаў Ордэн Тампліераў. Пачынаючы з гэтага моманту, сталі множыцца легенды пра падпольнае існаваньне ордэну, і шчэ сёньня ў кнігарнях можна знайсьці дзясяткі кніг, прысьвечаных таямнічым і акультным навукам. У XVII ст. на сьвет зьявілася іншае паданьне, паданьне пра разэнкрэйцараў, брацтва, што выходзіць на гістарычную сцэну пасьля таго, як яго апісваюць у «Маніфэстах разэнкрэйцараў» («Слава», 1614; «Споведзь», 1615).

Аўтары (ці аўтар) гэтых маніфэстаў фармальна засталіся невядомымі. Тыя, каму прыпісвалі аўтарства, адмаўлялі сваё дачыненьне да «ружы і крыжа». На маніфэсты адгукнуліся заявамі самыя розныя людзі, у заявах сьцьвярджалася ўпэўненасьць у існаваньні брацтва і абвяшчалася палкае жаданьне ўступіць у ягоныя шэрагі. У прыналежнасьці ж да разэнкрэйцараў, калі ня ўлічваць пясьмелых намёкаў, па-сур'ёзнаму не прызнаўся ніхто; гэта тлумачылі поўнай сакрэтнасьцю супольнасьці. Тыя, што пісалі пра разэнкрэйцараў, звычайна падкрэсьлівалі, што самі не належаць да разэнкрэйцараў. Як гэта звычайна бывае, тыя, што пра прыналежнасьць да брацтва трубілі, як няцяжка пераканацца, ня мелі да яго ніякага дачыненьня. Выходзіць, гістарычных доказаў існаваньня разэнкрэйцараў ня толькі няма, але фактычна ня можа быць; нездарма Генрых Нэйгаўз у XVII ст. даводзіў іхнае існаваньне, дзякуючы вось якому дзіўнаму аргумэнту: «З тае простае прычыны, што яны мяняюць і трымаюць у сакрэце свае імёны, хлусяць пра свой узрост і, паводле іхнага ўласнага прызнаньня, сыходзяць непазнанымі, ніхто ня можа хаця б з малой доляй лёгікі адмаўляць той несумненны факт, што яны існуюць». І ўсё ж у наступных стагодзьдзях было хоць гаць гаці эзатэрычных групаў, што спрачаліся між сабой за права называцца адзінымі і сапраўднымі нашчадкамі першых разэнкрэйцараў. Кожная з гэтых групаў сьцьвярджала, што валодае самымі неабходнымі дакумэнтамі, прад'явіць якія, аднак, нельга з прычыны іхнай сакрэтнасьці.

У XVIII ст. да літаратурнай канструкцыі далучылася «храмоўніцкае і акультнае» масонства, якое мала таго, што выводзіла свой радавод ад будаўнікоў храма Салямона, але і ўключыла ў міт пра сваё паходжаньне стасунак між будаўнікамі храма і храмоўнікамі-тампліерамі, сакрэтная традыцыя якіх нібыта дайшла да сучасных масонаў праз разэнкрэйцараў.

Перад Француская рэвалюцыяй шмат гаварылася пра сакрэтныя брацтвы і пра існаваньне Невядомых Уладаў, якія выракоўвалі лёсы сьвету...

Між 1797 і 1798 гг. абат Баруэль у адказ на Францускую рэвалюцыю напісаў свае нібыта гістарычныя «Мэмуары ў дапамогу гісторыі якабінства», якія чытаюцца, што лёгкі раман. Пачынае ён, натуральна, ад тампліераў. «Пасьля таго, як вялікі магістар ордэну Жак дэ Мале быў спалены на вогнішчы, тампліеры ўтварылі, — пісаў Баруэль, — сакрэтнае брацтва, каб зьнішчыць манархію і папства, і стварыць сусьветную рэспубліку. У XVIII ст. яны становяцца на чале масонства і зьбіраюць нешта накшталт акадэміі, з д'ябальскага кола сяброў якой Вальтэр, Цюрго, Кандарсэ, Дзідро і д'Алямбэр, — і паўстаюць якабінцы. Але самімі якабінцамі кіруе шчэ больш сакрэтнае таварыства, суполка «Баварскіх ілюмінатаў», манархазабойцаў паводле пакліканьня». Француская рэвалюцыя стала фінальным акордам гэтае змовы.

У кнізе Баруэля ніякіх згадак пра габрэяў не было, але ў 1806 годзе Баруэлю прыйшоў ліст ад нейкага капітана Сыманіні, у якім нагадвалася, што вядомыя саюзьнікі першых тампліераў, Мані і Вэйль дэ ля Мантань былі габраямі, што менавіта габраі заснавалі масонскія лёжы і што габраі праніклі ва ўсе сакрэтныя таварыствы. Ёсьць падставы меркаваць, што ліст Сыманіні быў сфабрыкаваны агентамі Фушэ, якога турбавалі кантакты Напалеона з габрэйскай супольнасьцю Францыі.

Баруэля адкрыцьці Сыманіні зьбілі з панталыку; ёсьць згадкі, што ў прыватнай размове ён заўважыў, што публікацыя іх можа справакаваць разьню. Баруэль спачатку напісаў тэкст, у якім пагаджаўся з высновамі Сыманіні, пасьля спаліў гэты тэкст, але чуткі ўжо разышліся.

Паўстагодзьдзя чуткі ніякіх цікавых эфэктаў не выклікалі, але ў сярэдзіне XIX ст., калі езуітаў сталі непакоіць антыклерыкальныя натхняльнікі руху за ўзьяднаньне Італіі (Гарыбальдзі ды іншыя, якія таксама былі масонамі), ім здалося выгадным прадставіць карбанароў эмісарамі жыдамасонскіх змоўнікаў.

У сваю чаргу антыклерыкалы паспрабавалі зганіць езуітаў, прадэманстараваць, што гэтыя сьвятошы толькі і робяць, што плятуць змовы супраць шчасьця людзтва на плянэце. Да распаўсюджаньня гэтай ідэі спрычыніліся ня так «сур'ёзныя» пісьменьнікі (ад Мішле і Кінэ да Гарыбальдзі і Джабэрці), як раманіст Эжэн

Габлюй, габлюй, сынку...

Натальля Бабіна

Найноўшая беларуская літаратура паўстае ў выдатных умовах. Менавіта на такім вятрыску, на волі, калі трэба зарабляць на жыцьцё даляры, а дзеці штохвіліны боўтаюцца пад нагамі, пішуцца тэксты, якія потым тыражуюцца мільёнамі, за якія даюць грандыёзныя прэміі.

Галоўнае, каб быў талент.

На шчасьце — каб не сурочыць, стукаю па дрэве — сярод расейскіх шавіністаў у Беларусі талентаў няма. Усе яны аднаго роўню, адно што ў некаторых хапіла сьмеласьці назвацца, скажам, «пісацелем» або «рэжысэрам».

А што зь беларускага боку? Дзякуючы вятрыску, што сьвішча ад турмы, дзякуючы панаваньню хлусьні нарэшце паўстае сапраўдная (справядлівая, як белы грыб) літаратура. Вось жа, ёсьць недзе ў Баранавічах — горадзе, які паступова набывае мітычныя рысы, — друкарня імя А.Лукашэнкі, дзе выдадзеныя ў сьвет тры танюткія кніжкі сэрыі «Новая Беларуская Паэзія». Ня трэба гаварыць, што гэта агіткі або аднадзёнкі. Выпушчаныя на «гнюснай расейскай мове» ды «деревенском белорусском языке», гэтыя паэзіі знойдуць тых, для каго стануць, гаворачы словамі картасаравай гераіні, «заклікам або адказам», і таму, здаецца, ёсьць сэнс Муму Герасімовічу працаваць далей. Так ці йнакш, чытаючы Івана Карыдорава, сьмяесься ад душы — а гэта першая прыкмета сапраўднасьці.

Яшчэ больш падобныя да літаратуры сусьветнага роўню прыгоды каровы Рабунькі. Як для мяне, то гэта наагул найлепшы тэкст году. Нягледзячы на неабходнасьць зарабляць (ці дзякуючы ёй), нягледзячы на дзяцей, якія штохвіліны боўтаюцца пад нагамі, Алесь Наварыч зноўку пацьвердзіў здольнасьць радаваць чытача. Гэтая якасная сатыра дае адчуваньне: працэс пайшоў, вось-вось, вось-вось яна ператворыцца ў нешта яшчэ прывабнейшае. Я асабіста чакаю нейкай сумесі сымбалізму ды рэалізму, замяшанай на гострым сюжэце. Але, можа, гэта будзе зусім новае, абсалютна нечаканае слова? У паветры, прапятым прапагандай ды хлусьнёй, сапраўднаму таленту дыхаецца лёгка.

Нельга ня бачыць: сёньняшняе жыцьцё — яшчэ больш ненатуральнае, штучнае, задушлівае, чымся было за саветаў. Шырыцца пакрысе ўласнасьць крымінальнікаў, а тым часам люду, што меўся жыць дзеля пабудовы камунізму, прапануецца (калі гэтае слова падыходзіць) жыць дзеля таго, каб Лукашэнка стаў прэзыдэнтам Расеі. Гэта ня можа ня радаваць: чым большую дурноту навязваюць людзям, тым хутчэй яны яе адкінуць. Працэс ідзе; кожны вырашае сам, якім можа быць кошт вольнасьці. Пакуль што за вольнасьць беларусаў церпяць мукі сямёра ўкраінцаў. Што ж, ёсьць такая ўкраінская народная песьня: «Шли діди на муки, Підуть і правнуки, За народ життя своє дамо». А ёсьць і такая: «Рости, рости, черемшино, Широко ся розростай, Ти, молода дівчинонько, про кохання забувай, Бо я сиджу в кримінали за Вкраїну, за той край...» Ці ёсьць падобныя да гэтых песьні ў беларусаў?

Сытуацыя першага ў беларускай гісторыі змаганьня за СВАЮ нацыю ня можа не спардзіць новага эпасу. Нашыя казацкія песьні толькі зьяўляюцца, бо зьяўляюцца казакі. І няважна, хто яны паводле прафэсіі — палітыкі, юрысты, бізнэсоўцы... Даволі таго, што кіруюцца яны катэгорыямі справядлівасьці ды рэальнай, а ня ўяўнай, карысьці. І не баяцца! Усьведамляючы, што ўлады, не завагаўшыся, могуць ужыць зброю, нашыя казакі ідуць на плошчу Якуба Коласа... Дык што ж да чаго прывяло: «козацькі пісні» да стварэньня трохсоттысячнай УПА ці дзеяньні УПА — да новых песьняў пра герояў, волю ды ярмо? Як бы ні было, я думаю, што нашая сытуацыя спрыяе зьяўленьню сапраўдных верхавінных тэкстаў. Трэба толькі, каб той, хто сядае за кампутар з пэўным намерам, меў талент ад бацькоў, а таксама нічога не баяўся. І, мабыць, ня піў.

Ня трэба смуткаваць, кажу я сабе. Парадокс у тым, што зло перамагаюць ня толькі супольна, але і ў адзіночку. Двух тысячаў дысыдэнтаў хапіла для перамогі Сапраўднага ў Польшчы; наклад «НН» — пяць тысячаў.

Пра людзей, што снуюць неабгрунтаваныя рэальнасьцю пляны, у Заказанцы гавораць: «Гэблюй, гэблюй, сынку, батько сокірою поправыть...» Халера, няўжо гэта пра такіх, як я?

Калі

Ральф Ламбрэглія

Нядаўна на неабсяжных прасторах «сёмага кантынэнту» — сусьветнай кампутарнай сеткі Internet — адбылася канфэрэнцыя, якую наладзіла рэдакцыя часопіса The Atlantic Monthly. Абмяркоўвалі ўзьдзеяньне кампутараў на сучаснае грамадзтва. У гутарцы ўдзельнічала шмат журналістаў і пісьменьнікаў. Мы пазнаёмім вас зь некаторымі матэрыяламі віртуальнай дыскусіі. Першы матэрыял прысьвечаны тэхнафіліі і тэхнафобіі, кібэрэнтузіястам і кібэрскептыкам.

Я ніколі ня мог працаваць на друкавальнай машынцы — ані пісаць прозу, ані складаць проста добрыя сказы. Здавалася, што бліскучы мэханічны апарат заўсёды быў настроены да мяне варожа. Гучнае грукаценьне мэталёвых літараў па заціснутай паміж жалезьзем паперы ўплывала на рытм маёй мовы і проста нішчыла ўсё, што стваралася ў мяне ў галаве. Машына забівала маю здольнасьць да мысьленьня, бо думкі пісьменьніка рэдка бываюць незалежныя ад тых туманных фразаў, што спрабуюць нарадзіцца й легчы на паперу. І да таго ж заўсёды крыху мусіш памятаць, што аркуш паперы павінен некалі закончыцца, прычым ты ня ведаеш, калі канкрэтна. Шмат разоў, нават не ўсьведамляючы і не заўважаючы, што папера ўжо скончылася, я друкаваў адзін, другі, трэці бясцэнны радок проста на беспачуцьцёвы гумовы валік.

Яшчэ задоўга да зьяўленьня пэрсанальных кампутараў я скардзіўся на ўсё гэта сваім шматлікім сябрам-пісьменьнікам, якія тварылі проста на машынцы. Яны не разумелі маіх праблемаў. І ў адрозьненьне ад сучасных спрэчак наконт кампутараў (калі некаторыя з тых, што далучыліся да іх, стварылі свайго роду рэлігійнае пакланеньне ім), тыя дыскусіі ня мелі тады для мяне значэньня. Мастак робіць тое, што ў яго атрымліваецца. Мы, творчыя людзі, вельмі непастаянныя. Мы выкарыстоўваем такія спалучэньні месца, абставінаў, стымулёўных сродкаў ды прыстасаваньняў, якія дапамагаюць нашаму твору зьявіцца на сьвет. Такім чынам, я пісаў алоўкамі на звычайнай паперы, каб перадрукаваць пасьля. І незалежна ад таго, якія перавагі ці недахопы мая праца мела ў параўнаньні з працай маіх сяброў, якія друкавалі на машынцы, ніводзін з нас нават і думкі ня меў, каб хваліць ці ганіць свае творчыя інструмэнты.

Сёньня нават найбольш клацальная кампутарная клявіятура пэрсанальнага кампутара значна цішэйшая за мэханічную друкавальную машынку. І пры працы на кампутары рабочая прастора пісьменьніка не заціскаецца ў межах маленькіх аркушыкаў паперы, што мусяць засоўвацца і пракручвацца праз апарат. Такой розьніцы для мяне было больш, як дастаткова. У мяне зьявілася магчымасьць ствараць прозу на гэтых цудоўных штуковінах, і я пачаў яе выкарыстоўваць. Але я не заўсёды так раблю, нават сёньня. Фактычна прынамсі палову любой сваёй працы (самі фразы і іх скампаноўваньне ў большыя структуры) я выконваю на паперы алоўкам ці асадкай. Я раблю так цяпер, пішучы вось гэтыя радкі.

Усё вельмі проста: для стварэнь-

Умбэрта Эка

ПРАТАКОЛЫ, ЯКІХ НЕ БЫЛО

З кнігі «Шэсьць шпацыраў па апавядальных лясах. Гарвардзкі ўнівэрсытэт, нортанаўскія лекцыі».

Сю. На старонках «Вечнага жыда» ён стварыў вобраз мэсье Радэна, увасабленьне езуіцкай канcьпірацыі, копію Невядомых Уладароў, але ўжо клерыкальнага парадку.

Пасьля публікацыі раманаў Сю ў 1864 годзе нейкі Марыс Жалі напісаў лібэральны памфлет супраць Напалеона III, пэрсанажам якога быў Мак'явэлі, сымбаль дыктатарскага цынізму. Мак'явэлі ў творы вёў гутарку з Мантэск'ё. Жалі прыпісваў Напалеону ўдзел у апісанай Сю езуіцкай змове (і таксама адданасьць прынцыпу, згодна зь якім мэта апраўдвае сродкі). Сем бачынаў з опусу Жалі — гэта калі ня чысты плягіят, дык, прынамсі, падрабязнае цытаваньне раману Сю без аніякіх спасылак. Жалі быў арыштаваны, правёў год і тры месяцы ў вязьніцы і ўрэшце скончыў жыцьцё самагубствам. Мір ягонаму праху, і неўзабаве мы зноў сустрэнемся зь ім.

У 1868 годзе нямецкі паштовы чыноўнік Герман Гедшэ, аўтар некалькіх хлусьлівых кніжонак, пад псэўданімам «сэр John Retcliffe» напісаў «народны» раман «Біярыц», у аснове якога ляжыць апісаньне акультнай цырымоніі на могілках Прагі. Гедшэ проста скапіяваў з кнігі Дзюма «Жазэф Бом», напісанай у 1849 годзе, сцэну, дзе апісваецца сустрэча Кальёстра, кіраўніка Невядомых Уладароў, зь іншымі ілюмінатамі, на якой плянуецца справа Караляў Каралевы.

Пэрсанажамі Гедшэ ўжо выступаюць не Кальёстра энд Со., а пасланцы дванаццаці плямёнаў Ізраілю, якія сабраліся, каб падрыхтаваць заваёву сьвету, як наўпрост, без усялякіх якіх, дэкляруе Вялікі рабін.

Праз пяць гадоў гэтую гісторыю падхоплівае расейская кніжонка «Жыды, гаспадары сьвету», але ўжо ў форме кронікі сапраўдных падзеяў.

Такую ж гісторыю ў 1881 годзе передрукоўвае французская газэта «Кангампарэн», суправаджаючы яе заўвагай пра тое, што гэтая інфармацыя была атрыманая з надзейнай крыніцы, ад ангельскага сэра John-а Readcliff-а.

У 1896 годзе Франсуа Бурнан зноў спасылаецца на прамову Вялікага рабіна (але гэтым разам ужо галоўнага рабіна завуць John Readcliff) у сваёй кнізе «Нашыя сучасьнікі жыды». З гэтага моманту прыдуманае Дзюма масонская зборня, паблытаная з прыдуманым Сю плянам езуітаў, прыпісаная спадаром Жалі Напалеону III, ператвараецца ў сапраўдную прамову Вялікага рабіна і ў розных формах трапляе ў розныя кнігі.

Але на гэтым гісторыя не канчаецца. На сцэне зьяўляецца пэрсанаж зусім не раманны, які, аднак, заслугоўваў на тое, каб стаць раманным. Расеец Пётар Іванавіч Рахоўскі, які меў праблемы з царскай паліцыяй, бо яго вінавацілі ў сувязях з крайнімі левымі рэвалюцыйнымі групоўкамі, пазьней стаў інфарматарам паліцыі, блізка сышоўся з чарнасоценцамі і ўрэшце стаўся кіраўніком жахлівай ахранкі.

Дык вось, Рахоўскі, каб дапамагчы свайму патрону, графу Вітэ, з крытыкай якога выступаў ягоны палітычны апанэнт Ільля Цыон, загадаў правесьці ператрус у доме Цыона і знайшоў рукапіс памфлету, у якім Цыон перакладае тэкст Жалі, але ідэі Мак'явэлі прыпісвае не Напалеону III, а Вітэ. Рахоўскі, як і ўсе чарнасоценцы, быў старашэнны антысэміт. Вось жа, у яго нарадзіўся плян узяць гэты тэкст, сьцерці ўсе згадкі пра Вітэ і прыпісаць зьмешчаныя там думкі жыдам. Імя Цыон, асабліва калі вымавіць яго на францускі манер «Сыён», гучэла шматзначна; здавалася, што ўсё будзе мець больш праўдападобны выгляд, калі прыпісаць раскрыцьцё габрайскай змовы габраю.

Адрэдагаваны Рахоўскім тэкст, пэўна, і стаў асноўнай крыніцаю «Пратаколаў сыёнскіх мудрацоў». Літаратурныя карані гэтых пратаколаў несумненныя. Дзе яшчэ, апрача раману Сю, «кепскія» могуць распавядаць пра свае падступныя пляны настолькі адкрыта і бессаромна. Бо ж мудрацы сьціпла заяўляюць, што іхныя «амбіцыі ня ведаюць межаў, прагнасьць — спатолі, жаданьне помсты бязьлітаснае, а нянавісьць вселізарная». Але, як і ў «Гамлеце» паводле Эліёта, разнастайнасьць літаратурных крыніцаў робіць сам тэкст дастаткова супярэчлівым.

Мудрацы хочуць скасаваць свабоду друку, але імкнуцца спрыяць вальнадумству; крытыкуючы лібэралізм у эканоміцы, яны падтрымліваюць ідэю транснацыянальных кампаніяў; зь нецярпеньнем чакаюць рэвалюцыяў у кожнай краіне і, каб падштурхнуць народ да бунту, паглыбляюць сацыяльную няроўнасьць. Яны хочуць пабудаваць мэтро, каб замінаваць вялікія гарады. Паводле іхных словаў, мэта апраўдвае сродкі, і таму іх цешыць антысэмітызм, які дазваляе ім трымаць у падпарадкаваньні бяднейшых габраяў і адначасова расчульваць гояў карцінамі габрайскай трагедыі. Яны хочуць адмяніць вывучэньне клясычных аўтараў і антычнай гісторыі і спрыяць разьвіцьцю спорту і сродкаў візуальнай камунікацыі, каб атупляць працоўныя масы, і г.д.

Шмат хто заўважаў, што «Пратаколы», відаць, нарадзіліся ў Францыі XIX ст., бо ў іх поўна рэаліяў французскага грамадзтва тагачаснай эпохі (скандал вакол Панамскага каналу, чуткі пра габрайскіх акцыянэраў парыскага мэтрапалітэну). Няцяжка знайсьці ў «Пратаколах» і матывы са шматлікіх вядомых «народных» раманаў. На жаль, твор, як і многія іншыя, быў настолькі пераканаўчым, што яго лёгка можна было зблытаць з праўдай.

Працягам гэтай літаратурнай гісторыі была Гісторыя зь вялікай літары. Вандроўны расейскі манах Сяргей Нілус — паўінтрыган, паўпрарок — апублікаваў тэкст «Пратаколаў» са сваімі камэнтарамі. Такім чынам ён хацеў паспрыяць рэалізацыі ўласных распуцінскіх амбіцыяў (яму карцела стаць духоўнікам цара). Пасьля тэкст стаў блукаць па Эўропе, пакуль ня трапіў у рукі Гітлера... Зьмест наступных сэрыяў вядомы ўсім.

Six Walks in the Fictional Woods, Harvard University, Norton Lectures, 1992-1993

ПЕРАКЛАД З АНГЕЛЬСКАЙ АНДРЭЯ ДЫНЬКО

Поўны тэкст гарвардзкіх лекцыяў «Затрымацца ў лесе» і «Магчымыя лясы» будзе надрукаваны ў другім нумары сярэднеэўрапейскага агляду «Фрагмэнты».

Адам Глёбус


ТАНКА

♥

Побач зь люстэркам
гартаў альбом сямейны,
непазнавальным
робіцца ўсё на сьвеце
і нават сам ты... Вось як.

♥

Прыродазнаўства
вывучалася ў школе.
Стары падручнік
сустрэўся выпадкова
на пыльных антрэсолях.




♥

У дзень сьпякотны,
седзячы пад платанам
на мулкай лаўцы,
я ня ведаю, колькі
на плямку крыві гляджу.

♥

Эратычны сон
зь ярка-белым чэрапам
манэкеншчыцы...
Раптам, прачынаюся
сярод халоднай ночы.



♥

Хлопчык ля вады.
Каменьчык перакінуць
хочацца яму
за срэбна-шэры далягляд,
на другі бераг мора.

♥

Лапкі ядлоўца
і пралескі на стале
ў шклянцы з вадою.
Хто прынёс іх да мяне?
Хто пакінуў кветкі тут?

ЁН ПРАЦУЕ, КАРЫСТАЙСЯ ГЭТЫМ

Развагі пісьменьніка XXI ст.

ня сваіх літаратурных твораў я выкарыстоўваю камбінацыю старога і новага мэтадаў, што дае мне ўсё, чаго я жадаю. Чалавечыя істоты, урэшце, — гэта жывыя арганізмы (хоць я ня ўпэўнены, ці можна так сказаць пра ўсіх нас), і праз некаторы час мы стамляемся ад аднастайнай нязьменнай працы. Жаданьне разнастайнасьці ня ёсьць заганнаю рысай характару. Калі я стамляюся ад клявіятуры ды экрана манітора, я магу перайсьці да асадкі й паперы. А пасьля зноў вярнуцца да кампутара. Мне падабаецца такое чаргаваньне. Я адчуваю, што мяне гэта асьвяжае. Жывым арганізмам падабаецца асьвяжацца.

Ну, скажаце вы, паколькі незьлічоная колькасьць іншых пісьменьнікаў несумненна выкарыстоўвае тэкставыя працэсары гэткім самым чынам, чаго я ўвогуле пачаў варушыць гэтае простае пытаньне? А таму, што нагэтулькі распаўсюджанае выкарыстаньне для пісьменьніцтва кампутараў (якіх разьвялося, як гразі) патроху рухае нас у будучыню, не выплёскваючы разам з вадою й дзіцяю. Выглядае на тое, што захоўваецца баланс, заснаваны на здаровым сэнсе, існуе памяркоўная адкрытасьць да усеагульнага абмеркаваньня лічбавай тэхналёгіі ў цэлым і яе ўзьдзеяньня на людзей і грамадзтва. У адрозьненьне ад тэорыі сьвятарнай вайны.

Я пішу прозу на кампутары ўжо амаль 15 гадоў, і палову гэтага часу я падключаны да электронных сетак. Напэўна, я адзін зь першых пісьменьнікаў у Амэрыцы, які публікуецца «онлайн» (у наўпроставым падключэньні да кампутарнай сеткі тыпу Internet – У.Б.), і на сёньняшні дзень, наколькі мне вядома, я адзіны празаік, які робіць літаратурныя нататкі ў выглядзе кампутарных базаў зьвестак. Прычым гэтым я заняўся ня дзеля таго, каб быць «першым», а таму, што гэта мае сэнс. Я дагэтуль не магу зразумець большасьці іншых пісьменьнікаў, якія разглядаюць свае кампутары выключна як электронныя друкавальныя машынкі.

Я ужо даўна быў на фронце, але толькі нядаўна я патрапіў у сапраўдную зону баявых дзеяньняў. Перад тым, як напісаць гэтае эсэ, я паўтара года разам з сваёю жонкай Кэйт Бэрнгарт займаўся падрыхтоўкай камэрцыйнага кампакт-дыска з сваімі творамі. Часткова я рабіў гэта дзеля задавальненьня даўняга інтарэсу да мяне, а часткова, каб зарабіць на жыцьцё. Гэта было ўсё адно як глыбокае занурэньне ў лічбавы сьвет — глыбейшае, чым я калі-небудзь мог сабе ўявіць. У свой час нас папрасілі выпрацаваць да 1995 г. стандарт на літаратурную мульцімэдыяпрадукцыю, і, мяркую, у нас гэта атрымалася, ці, прынамсі, выйшла нешта блізкае да таго.

Ніхто сабе нават і ўявіць ня можа таго, дзе будзе выкарыстоўвацца лічбавая тэхналёгія да канца гэтага стагодзьдзя. Гэта цудоўна ілюструе параўнальна нядаўні выбух World Wide Web (г.зн. «сусьветнае павучыньне» — апошняе пакаленьне вузлоў Інтэрнэту, што дае магчымасьць прагляду і загрузкі тэкстаў, графічнай і гукавай інфармацыі — У.Б.), які дазваляе выконваць усе каманды простым пстрычком «мышы» на старым Інтэрнэце, якім мы карысталіся цягам некалькіх дзесяцігодзьдзяў.

І хоць мы здольныя бачыць толькі агульныя рысы таго, чаго можна чакаць, я магу прадказаць, што самыя зацятыя скептыкі неўзабаве будуць зацята хаваць сваё захапленьне і сваё жаданьне працаваць з цудоўнымі тэхналёгіямі, якія ўжо на падыходзе. Калі мы па-сапраўднаму дбаем пра нашую сувязь зь мінуўшчынай, мы мусім вітаць магчымасьць лічбавай падачы інфармацыі. Гэта азначае, што ў нас будзе шырэйшы і больш рацыянальны доступ да гістарычных матэрыялаў, чым гэта было ці, магчыма, было б пры іншых спосабах. Калі мы сапраўды хочам цалкам быць людзьмі разумнымі, то кампутарныя тэхналёгіі прапануюць нам надзвычайную сілу, каб выканаць нейкую працу і падзяліцца ёю з усім чалавецтвам. Зьяўляецца беспрэцэдэнтная магчымасьць супрацоўнічаць зь іншымі людзьмі на плянэце замест таго, каб зь імі ваяваць.

Мала хто з крытыкаў лічбавых тэхналёгіяў крытыкаваў іх у слушным духу і з слушнай нагоды. Але калі яны гавораць, што «інфармацыі», незалежна ад яе колькасьці, недастаткова, яны маюць рацыю. Калі нам патрэбная паэзія — уся нашая традыцыйная паэзія ў тэкстах, выявах і музыцы, таксама, як і новая паэзія, — то ад сёньня і надалей мы маем для гэтага нябачаныя дагэтуль сродкі яе стварэньня і перадачы. У будучыні мы ўбачым новага («new media») Фэліні. Зьявіцца і лічбавы Кафка.


Дрэнная навіна ў тым, што заснаваныя на кампутарах тэхналёгіі ды інфармацыйныя сыстэмы (усё адно, як гусіныя пёры і друкавальныя машынкі, што былі перад імі) ня могуць самі па сабе даць паэзію. З аднаго боку гэта дрэнная навіна, а з другага — добрая навіна. Машыны ня здольныя зьнішчыць паэзію. Гэта можам зрабіць толькі мы самі.

На заканчэньне я хацеў бы сказаць, што ўсё залежыць ад вашых адносінаў, вашай мэнтальнасьці — гэтых нябачных, магутных рухавікоў. Вы самі выбіраеце свой погляд на рэчы, на тое, якія аспэкты вашай сьвядомасьці вы хочаце даверыць электроннай тэхналёгіі. Некаторыя баяцца, што яна заб'е паэзію жыцьця — праявы духу, Бога. Як для мяне, то гэта толькі яшчэ адна з праяваў. Свэн Біркерц (традыцыйны «нялічбавы» паэт у адрозьненьне ад мульцімэдыйных, «надрукаваных» на кампакт-дысках — У.Б.) завяршае свае «Гутэнбэргавыя Элегіі» словамі «Адкінь гэта!». Я кажу «Карыстайся гэтым!», але пры гэтым я дадаю, што ён і я застаемся, тым ня менш, сябрамі.

Усё залежыць ад духу.

ПАДРЫХТАВАЎ УЛАДЗІМЕР БАРАНІЧ

Ральф Ламбрэглія - аўтар двух зборнікаў апавесьцяў: «Людзі пад вадою» (Men Under Water (Washington Square Press, 1991)) і «Зрабі, каб я працаваў» (Make Me Work (Penguin, 1995)). Стала публікуе апавяданьні ў часопісах The Atlantic Monthly і The New Yorker. Ягоная проза таксама зьяўлялася ў многіх анталёгіях, такіх, як «The Best American Short Stories 1987 & 1988», «The Vintage Book of Contemporary American Short Stories», «American Stories II: Fiction from The Atlantic Monthly» і «Prize Stories 1996: The O. Henry Awards». Жыве ў прадмесьці Бостану з жонкай і дачкой.



PROMENADE

Бочка зыркага капіталізму

Калі ў пятніцу, позна ўвечары, падысьці на менскі цэнтральны аўтавакзал і пацікавіцца ў даведкавай службе, ці нельга як-колечы патрапіць сёньня на аўтобус, што едзе ў Талін, вам хутчэй за ўсё скажуць, што ніякага аўтобуса туды няма. Але калі вы паставіцеся зь недаверам да словаў румянай жанчыны ў акенцы і дачакаецеся поўначы, вы, безумоўна, убачыце модны аўтобус з эстонскімі нумарамі, які едзе транзытам з Адэсы. Гэта вельмі добры аўтобус, з прыбіральняй, каваю і відэа. Дайце кіроўцу 50 даляраў і сьмела вандруйце ў бок Эстоніі, далей ад нашых чырвоных арнамэнтаў.

Дарога агулам займае чатырнаццаць гадзінаў. Даехаўшы да Эстоніі, вы наўрад ці ўразіцеся яе ляндшафтам. Вам выпадзе мінаць строгія напышлівыя хутары ў бедных дажджавых палетках, на якіх сям-там паўкладаныя акуратна ў рад гіганцкія белыя яйкі (тут ужо зьявіліся заходнія мэханізмы, якія й косяць, і акуратна пакуюць сена ў белы цэляфан). Мадэрна расстаўленая па ўзбочынах рэкляма ўжо крычыць па-эстонску: «Мы — Эўропа! Мы — Эўропа!»




Пераехаўшы па дыяганалі за тры гадзіны ўсю краіну, аўтобус прыяжджае ў сталіцу. Цяпер восень, таму ў горадзе ўвесь час ідзе дождж. Чыгуначны вакзал бруднаваты, і гэта выглядае амаль натуральна: тут жа прамая дарога ў Расею. Іншая рэч — порт і лётнішча, праз якія ажыцьцяўляецца сувязь з цывілізаваным сьветам. Тут усё зіхаціць і блішчыць, як у добрым супэрмаркеце. На гэты мармур горда наступае лякаваная нага заходняга інвэстара. Можна мімаходзь узгадаць, што больш-менш прыбытковыя эстонскія прадпрыемствы прададзеныя эўрапейскім фірмам, а ў блізу ўсіх савецкіх прамысловых і паўпрамысловых пабудовах гуляе вецер і какаюць галубы.

Цяпер у Таліне поўна ўсякіх рэстаранаў, пабаў, бараў. Але ў іх, італьянскіх, эстонскіх, ірляндзкіх, амэрыканскіх, габрайскіх і г.д., хаця і ўтульна, усё ж сумна. Амаль усюды часам зьяўляецца красуня ў белай сукні з ахапкам сухіх ружаў, якімі гандлюе. Самы ажыўлены дзень — пятніца. У пабах, праўда, пануе дзіўная эстонская весялосьць, п'яных няма — усе п'юць піва. Некаторыя з карчомак зробленыя абы як, похапкам і абсалютна бяз густу. Адразу відаць, тут адмываюць грошы. Аднак куды б у горадзе вы не зайшлі, вас абслужаць хутка, акуратна і ветліва. Калі вы ня ведаеце эстонскай, у вас сапраўды ёсьць шанец адпачыць.

Тут прыгожыя грошы з маціцовым адлівам, паліцыянты падобныя да палярнікаў, размаляваныя трамваі грымяць па вуліцах строга паводле графіку. Галоўны будаўнічы матэрыял — вапняк. Амаль усё тут — зь яго, таму горад здаецца бясколерным і старажытным. У старым горадзе сапраўды добра, папахвае дымком, у сьметніцах поркаюцца бамжы, нешматлікія турысты псуюць свой абутак аб крывое каменьне бруку.

У краіне выбары. Расейскія і эстонскія кандыдаты на тоўстай і тонкай паперы, чорна-белыя або каляровыя, нахмурана ці ўсьміхаючыся глядзяць на вас з усіх сьценаў, куткоў, платоў і вітрынаў. Найбагацейшыя ўлазяць у рэклямныя стэнды з падсьвятленьнем, бяднейшыя або сьціплейшыя туляцца чорна-белыя ў пераходах і на прыпынках.



Безумоўна, усе яны абяцаюць багацьце і квітненьне. Галоўнай праблемаю эстонцаў застаюцца расейцы. Іх тут шмат, кажуць, працэнтаў сорак. Цяпер гэты працэнт усё памяншаецца: вузкахутарная сьвядомасьць эстонцаў ніяк не стасуецца са стыхійнай расейскай. Цяпер славянін, каб трапіць на радзіму, купляе візу і бегае з кашальком па інстанцыях. Як правіла, у яго няма пашпарту і грамадзянства, а струганая эстонская мова даецца цяжка. Грамадзтва строга згрупаванае: эсты з эстамі, славяне са славянамі, эстонскія габраі з эстонцамі, расейскія габраі з расейцамі. У Таліне існуе расейскі культурны цэнтар. Будынак нагадвае савецкі дом культуры. Ёсьць яшчэ расейскія газэты, радыё і тэлеперадачы. Але ўсё гэта маленькае і куртатае.

Забудзьцеся на стары горад і паглядзіце ўважліва на Талін наагул. Гэта вялізныя трох-чатырохпавярховыя драўляныя кварталы, крытыя то шыфэрам, то дахоўкаю, то жалезам. Гэтыя вуліцы, гэтая сьціплая, выпадкова пакінутая жывою архітэктура, бадай, адзіны ацалелы прыклад гарадзкой забудовы Паўночнай Эўропы канца дзевятнаццатага — пачатку дваццатага ст. Усё гэта ацяпляецца дрыўмі і вугалем, усё гэта невыгоднае і ўсё гэта разбураецца.



З мора Талін просты — два фабрычныя коміны, чатыры-пяць царкоўных шпілёў, два нібыта небасягі і лес партовых кранаў. Калі дзьме паўднёвы вецер і мора паказвае белыя зубы, прыемна гуляць па беразе з пляшкаю віна ў бок Пірыту. Пірыта — гэта руіны кляштара і алімпійскі яхтцэнтар. Цэнтар нядаўна рэканструяваны, працуе басэйн і гатэль. Усё б добра, але й тут у рэстаранах і калідорах спартовыя штаны і скураныя курткі, жывыя і нахабныя.

Трамваі агінаюць стары горад з поўдня. Паміж гарадзкой сьцяной і трамваем два зялёныя пагоркі. Тут цягнуцца адна да адной, але так і не сустракаюцца дзьве бронзавыя лініі. Гэтая цяжкая канструкцыя — помнік затануламу эстонскаму парому. У горадзе ўсе ўпэўненыя, што прычына гібелі парома — буйная партыя наркотыкаў, а віноўнікі — крымінальныя структуры.

Закладзены Пятром І парк Кадрыёрг усыпаны калматымі ледавіковымі валунамі. У глыбіні палацрэзыдэнцыя прэзыдэнта. Па алеях гуляюць пад парасонамі эстонскія старыя ў сьмешных барэтах. Побач шаша, дзе часам мільгаюць чырвоныя «Фэрары». Далей каменны бераг і на даляглядзе белы параход, які плыве ў Фінляндыю.

А дзясятай вечару жыцьцё ўсюды спыняецца. Калі няма чарговага піўнога сьвята, то няма й жыцьця. Дарэчы, і піва працягвае вячорнае жыцьцё гораду ўсяго на дзьве-тры гадзіны. Алькаголь у Эстоніі да непрыстойнасьці дарагі. Расейская, малдаўская і грузінская сьпіртовая прадукцыя на рынку адсутнічае. Калі вы купляеце «Сталічную», то ведайце — гэта кантрабанда.

У верхнім горадзе, на назіральнай пляцоўцы стаяць расейскія Вані і прапануюць усім запар на кепскай ангельскай мове вайсковую амуніцыю і сапраўдныя драўляныя канторскія лічыльнікі. Ім заўсёды не стае на гарэлку, яны скардзяцца на жыцьцё, на эстонцаў, на турыстаў і, вядома, на цэны. Выгляд у іх сапраўды няважны. Капіталізму яны ня хочуць, сацыялізму таксама. Яны злыя і глядзяць на вас мутнымі вачыма. Побач, два крокі ступіць, будынак эстонскага парлямэнту. Тры блакітныя леапарды на фасадзе выглядаюць паважна. Усе знакі ўлады і дзяржавы выклікаюць шчырую павагу.

У горадзе няма нічога яўна безгустоўнага. Вітрыны маюць налёт арыгінальнасьці, галерэі даволі абстрактныя і без надакучлівых матрунак, дызайн шыльдаў і рэклямы ўдала ўпісваецца ў архітэктуру, у рэстаранах граюць джаз, у піўнях — рок-н-рол, а часам — эстонскія нацыянальныя песенькі. Поўна сувэнірных крамак, дзе з нармальным камэрцыйным падыходам прадаюць вырабы народных умельцаў. Актор і рэжысэр Ульфсак тым часам ставіць нешта ў расейскім тэатры, распачынаюцца выставы, ладзяцца канцэрты, выдаюцца кнігі, але культурнае жыцьцё ўсё ж не бурліць. Агульная карціна — на пацёрты савецкі Талін раптам вылілі бочку зыркага каляровага капіталізму.

І вось нарэшце мы, а можа быць, і вы патрацілі ўсе грошы і, дачакаўшыся чарговай пятніцы, едзеце дадому. Калі аўтобус будзе грэбліва пад'яжджаць да мяжы, не забудзьцеся ўважліва разгледзець сваю візу. Два-тры неаплачаныя дні, і ў глухім расейска-эстонскім пункце паўночнай паўкулі вас напаткаюць непажаданыя прыгоды.

Цімох Ізотаў

Здымкі аўтара

Крывіцкая Мэкка

КОНКУРС



6

Гэтым здымкам мы закрываем нашыя конкурсы, прысьвечаныя 90-м угодкам «Нашае Нівы».

На здымку – будынак, у якім у свой час разьмяшчалася рэдакцыя «Нашай Нівы». Крыху пазьней тут жыў адзін з самых вядомых нашаніўскіх публіцыстаў, дзеяч беларускага адраджэньня, аўтар адной з самых галоўных кніг Беларушчыны. Вуліца, на якой стаіць гэты дом, слынная многімі беларускімі адрасамі.

Адкажыце, з чыімі імёнамі зьвязаны гэты будынак. Як завецца гэтая вуліца?

Адказы мы зьмесьцім у наступным нумары.

P.S. Некаторыя чытачы ўжо даслалі нам свае адказы на папярэднія пытаньні. Сярод іх ёсьць і цалкам слушныя. Паспрабуйце быць уважлівымі і адкажыце нам на гэты раз.

Сяргей Харэўскі

МУЗЫКА

НОВАЯ ПЛЫНЬ

Пра тых, хто зьбіраецца граць на хаўтурах у «Крамы» і Касі Камоцкай

Прагнозы разьвіцьця (ці нават далейшага існаваньня) беларускамоўнае рок-музыкі апошнім часам даволі пэсымістычныя. Той-сёй нават выказвае меркаваньне, што гэты дастаткова пэрспэктыўны ў свой час рух паступова і няўхільна ідзе на спад. Сапраўды, да плеяды рок-вэтэранаў ніхто з маладзейшых далучыцца ня здолеў, а тыя, што былі колісь «на вышыні», пачуваюцца цяпер ня надта добра.

Пра тое, да чаго прывяла празьмерная кансэрвацыя беларускай рок-тусоўкі, сказана ўжо шмат. На кожным канцэрце – адныя й тыя гурты, выканаўцы, музычныя ідэі... Гурты й ідэі добрыя, але зь цягам часу гэтая аднастайнасьць пачынае надакучаць. Ёсьць небясьпека, што старое зь цягам часу папросту прападзе, і нічога наўзамен не застанецца. Але, разам з тым, тыя ня надта пакуль шматлікія маладыя беларускамоўныя гурты існуюць па-за ўвагай усіх тых, хто хаця б нечым мог ім дапамагчы. А такой-сякой увагі яны ўсё ж вартыя. Бо менавіта моладзь прыносіць у наш рок разьняволенасьць і незакамплексаванасьць, якіх яму вельмі не стае.

Сёлета напрыканцы зімы ўсе аматары актыўнага адпачынку здолелі як мае быць адцягнуцца на фэсьце «Раздавім фашысцкую гадзіну», арганізаваным не без удзелу менскіх анархістаў. Нягледзячы на жахлівы гук і алькагольны чад, у гэты дзень упершыню на вялікую сцэну здолелі-такі выйсьці чатыры беларускамоўныя панк-гурты. Іхнія выступы разьвеялі ўсе сумневы што да існаваньня гэтай своеасаблівай для нашай культуры плыні.

Між іншым, гэтае існаваньне распачалося яшчэ на пачатку 90-х гадоў, калі музыкант-пачатковец Алежка Бахарэвіч адчуў цікаўнасьць да беларускага Адраджэньня. Цікаўнасьць гэтая неўзабаве перарасла ў глыбокую антыпатыю ў сукупнасьці са змрочнымі й выразна антысацыяльнымі ідэямі і сталася апірышчам творчасьці гурту «Правакацыя». «Традыцыйная беларуская культура – гэта напаўразложаны труп, які ўсё яшчэ чамусьці ня вывезьлі на могілкі», – лічыць Алежка. Схільнасьць да празьмернага спажываньня алькагольных напояў галоўнага «правакатара» не спрыяла росту папулярнасьці гурту. Але Алежка набыў-такі сабе пэўную славу, дзякуючы сваім ультраэпатажным выхадкам. А песьня «Спадчына», якую ён выконваў без нагавіцаў, і ўвогуле стала супэрхітом, дзякуючы навязьлівай тэлетрансьляцыі ў рамках шоў «Дети лжи».

Удалы тэледэбют, аднак, не перадухіліў хуткага распаду гурту, і пасьля таго, як чарговага разу згарэла яго апаратура, «Правакацыі», якая на той час пасьпела адыграць усяго некалькі канцэртаў, ня стала. Праўда, наўрад ці варта з гэтае прычыны асабліва засмучацца. Цяпер Алежка рыхтуе свой новы праект, паводле ягоных словаў, крышку менш эпатажны, але ад гэтага ня менш цікавы.

Тым часам сьцяг барацьбы са здаровым сэнсам пераняла ня менш апантаныя за «правакатараў» змагары з «Сонца Мао». Гэты малады і надзвычай экзальтаваны калектыў папросту забівае напавал сваёй энэргіяй і анархісцкім нігілізмам у адносінах да ўсіх моўных і музычных канонаў. Характэрна, напрыклад, тое, што ад рэпэтыцыяў «мааісты» ўвогуле прынцыпова адмаўляюцца. Усё гэта суправаджаецца лявацкімі «грузамі» і шчырай прагай маладзёжнай рэвалюцыі.

Крыху менш рэвалюцыйныя іхныя калегі з каманды «Склеп». Гурт грае добра зроблены і арыгінальна аранжаваны грандж, у іхняй музыцы ёсьць нават нейкія намёкі на інтэлектуальны сьцёб, чаго ўжо зусім ня скажаш пра «мааістаў». Карацей, на тле татальнае крызы гранджу, а асабліва нашага, дамарослага, «Склеп» набывае ўсё больш і больш прыхільнікаў сярод студэнтаў і калястудэнцкай моладзі.

А на ляўры найбольш змрочнай і экстрэмальнай каманды беларускага року не бяз посьпеху прэтэндуе кор-індустрыйны гурт «Фляўэрвіль». Ягоны псыхалягічны гітарна-шумавы саўнд цудоўна спалучаецца зь дзікім шоў і дэструктыўна-ўпадніцкімі тэкстамі, прысьвечанымі цяжкасьцям існаваньня індывідуума ў сучасным грамадзтве і імкненьню пераадоленьня ўяўных альбо ўласнаручна пабудаваных бар'ераў. Сустракаюцца, праўда, і больш прымальныя для нармальнага чалавека матывы, у тым ліку і рымэйк песьні Данчыка «Мы яшчэ сустрэнемся»...

Натуральна, творчасьць вышэйапісаных гуртоў – гэта далёка ня ўсё цікавае, што пасьпела (альбо мае шанцы пасьпець) нарадзіць новая хваля беларускамоўнага року. У прыватнасьці, зусім нядаўна я даведаўся пра існаваньне мэталёва-хардрокавай каманды «Зьніч», нешта робіцца й на правінцыі. Але ж інфармацыя на гэты конт распаўсюджваецца выключна праз вузкатусоўкавыя каналы. Тутэйшы гэтак званы рок-істэблішмэнт не асабліва зьвяртае ўвагу на тых, хто ідзе за імі, і апошнім даводзіцца так-сяк раскручвацца саматужна. Парадаксальна аднак тое, што ў гэты самы час монстры нашага року плачуцца ў сваіх інтэрвію, што няма працягу традыцыі беларускага року.

Гальляш Сьвырын

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк 19[55], 17/11/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 7226 Кошт свабодны.